Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
СУБОТА
№ 203 (26316)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Праваслаўным хрысціянам Беларусі

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас са знамянальнай для ўсяго праваслаўнага свету датай — 1020-годдзем Хрышчэння Русі.

Значнасць і патаемнасць гэтай вялікай падзеі не гаснуць з цягам часу, а па-свойму асэнсоўваюцца і перажываюцца кожным новым пакаленнем. Прыняцце Праваслаўя стала паваротным момантам у лёсах усходніх славян. Узнёсласць хрысціянскага вучэння, яго сіла і аўтарытэт садзейнічалі маральнаму ператварэнню і ачышчэнню людзей. Царква адыграла важную ролю ў сцвярджэнні маральных каштоўнасцяў і ідэалаў нашага народа. З веку ў век яна захоўвала і перадавала лепшыя традыцыі міласэрнасці, працавітасці і адданасці Радзіме. Пад уплывам хрысціянства сфарміраваліся такія рысы нацыянальнага характару, як самаадданасць, талерантнасць, спачуванне і пачуццё справядлівасці.

І сёння Праваслаўная царква застаецца вернай свайму абавязку перад Богам і Айчынай, з'яўляецца чыстай крыніцай мудрасці і надзеі, згуртоўвае грамадства, дапамагае захоўваць стабільнасць і згоду ў нашым беларускім доме. Жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў у добрых справах і пачынаннях, шчасця, міру і дабра.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

24 кастрычніка 2008 года.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ЦАРКВА З'ЯЎЛЯЕЦЦА НАДЗЕЙНАЙ АПОРАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў ЗАХАВАННІ ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ»

Фота БЕЛТА.

У Беларусі няма міжканфесійных рознагалоссяў і канфліктаў. Гэты факт асабліва адзначыў 24 кастрычніка Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Аляксіем II.

У тым, што ў беларускім грамадстве адсутнічаюць канфлікты на рэлігійнай глебе, ёсць заслуга і Праваслаўнай царквы, і, у прыватнасці, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, перакананы Аляксандр Лукашэнка. «Царква вельмі шмат зрабіла для таго, каб у нас былі мір і стабільнасць у грамадстве. Напэўна, больш, чым любы іншы інстытут у нашай дзяржаве», — сказаў Прэзідэнт.

Вітаючы Патрыярха Аляксія II у Беларусі, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Ваш прыезд у Беларусь — гэта не толькі падзея для вернікаў, гэта буйная палітычная падзея. Адносіны беларусаў да вас нічым не адрозніваюцца ад адносінаў рускага чалавека. У Беларусі тая дабрата, тыя пачуцці, якія выказвае наш народ да Праваслаўнай царквы, і, перш за ўсё, да вас, вызначаюцца асаблівым хваляваннем. Мы вас чакалі і спадзяёмся, што вы часцей будзеце прыязджаць у нашу краіну».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што «Беларусь — краіна праваслаўная, і мы будзем прытрымлівацца таго курсу, які некалі ўзялі, таму што так хоча наш народ». «Мы вельмі акуратна і асцярожна прыйшлі да разумення ў нашым грамадстве, з іншымі канфесіямі аб тым, што Праваслаўная царква — гэта аснова, гэта больш за 80 працэнтаў вернікаў. І сёння гэта ніхто не аспрэчвае, і нават ніхто раўніва да гэтага не ставіцца», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Аляксію II за адраджэнне Праваслаўнай царквы.

Высокі госць у сваю чаргу выказаў словы падзякі Аляксандру Лукашэнку за цёплыя адносіны да царквы, а таксама садзейнічанне ў аднаўленні і будаўніцтве храмаў.

«Рабіць дабро — гэта вялікая справа, трэба, каб дабро вярталася ў наша жыццё. Мы бывалі ў многіх месцах у Беларусі, і я ведаю, як народ цэніць і любіць вас. Вашы простыя, даступныя адносіны да людзей выклікаюць прыхільнасць», — падкрэсліў Патрыярх Аляксій II. Ён адзначыў, што ў Беларусі адчувае сябе сярод сваіх людзей, адчувае агульнасць і адзінства беларускага і рускага народаў.

Паводле яго слоў, калі б не палітыка кіраўніцтва Беларусі, то блок НАТА даўно пайшоў бы значна далей на Усход, і пагроза гэтага ваеннага альянсу для Расіі была б больш адчувальная.

Патрыярх Аляксій II таксама адзначыў вялікую пазітыўную ролю Беларусі, якая з'яўляецца своеасаблівым духоўным фарпостам Расіі на шляху пранікнення ўсяго негатыўнага, што ёсць у духоўным асяроддзі і наносіць шкоду маральнаму і духоўнаму здароўю расіян.

Потым адбылася сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі Праваслаўнай царквы, у якой удзельнічалі таксама Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II і Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Знамянальна, што на гэтай сустрэчы разам са свяшчаннаслужыцелямі і службовымі асобамі з беларускага боку, прысутнічалі госці з Польшчы: старшыня хрысціянскай асацыяцыі «Экуменічнае дзеянне» (Польшча) Казімір Мараўскі, дэпутат Сейма Рэспублікі Польшча, кіраўнік рабочай камісіі па Беларусі Яўген Чыквін.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што царква заўсёды заставалася адным са стаўпоў грамадства, надзейнай апорай і памочнікам дзяржавы ў захаванні духоўных каштоўнасцяў і ідэалаў, ніколі не была прычынай рэлігійных войнаў і канфліктаў. «Лёс Беларускай праваслаўнай царквы неаддзельны ад гісторыі нашай зямлі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён сказаў, што ў Беларусі за апошнія 20 гадоў у чатыры разы павялічылася колькасць праваслаўных прыходаў. Дзейнічаюць мужчынскія і жаночыя манастыры, паўсюдна аднаўляюцца і будуюцца храмы, пашыраюцца і набываюць усё новыя формы сацыяльнае служэнне, дабрачынная дзейнасць.

«Усёй грамадой пад апекай Святейшага Патрыярха Аляксія II мы ўзводзім велічны храм-помнік у гонар Усіх Святых», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на высокай ролі Аляксія II у адраджэнні Рускай праваслаўнай царквы: «Дзякуючы вам Царква заняла дастойнае месца ў міжнароднай супольнасці».

Аляксандр Лукашэнка таксама сказаў: «Я ганаруся тым, што магу назваць вас сваім настаўнікам і сапраўдным сябрам. Скажу чыстасардэчна: ваша шчырасць, душэўная прыхільнасць і мудрыя парады не раз дапамагалі мне, асабліва ў пачатковы перыяд кіраўніцтва краінай, пераадольваць цяжкасці і прымаць правільныя рашэнні».

Прэзідэнт адзначыў, што Праваслаўная царква ў сучасным грамадстве садзейнічае захаванню шматвяковай духоўнай агульнасці і цывілізацыйных асноў праваслаўнага свету, развіццю дыялогу паміж людзьмі розных нацый і вераызнанняў. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, на яго думку, менавіта ў гэтым і ёсць вялікая місія Праваслаўнай царквы ў сучасным грамадстве.

Кіраўнік дзяржавы сказаў, што дні ўрачыстасцяў з нагоды 1020-годдзя Хрышчэння Русі супалі яшчэ з адной знамянальнай датай — 30-годдзем служэння на беларускай зямлі Мітрапаліта Філарэта.

Прэзідэнт Беларусі ўручыў Патрыярху Аляксію II і Мітрапаліту Філарэту высокія дзяржаўныя ўзнагароды — ордэны Пашаны.

Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за дапамогу, якую аказвае беларуская дзяржава ў рэалізацыі праектаў Праваслаўнай царквы. «Гэта дальнабачная палітыка, накіраваная на захаванне духоўнай спадчыны беларускага народа», — сказаў Патрыярх Аляксій II.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка, як чакаецца, 25 кастрычніка правядзе перагаворы з Дзмітрыем Мядзведзевым

У Маскве на 25 кастрычніка запланавана сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева. Як чакаецца, на сустрэчы будзе абмеркавана шырокае кола актуальных пытанняў беларуска-расійскіх адносінаў, уключаючы эканамічную і знешнепалітычную тэматыку. Беларуска-расійскі тавараабарот у 2007 годзе склаў $26 073,3 млн і ў параўнанні з 2006 годам павялічыўся на 30,7 працэнта.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Час бабы Ганны

ЗАЎТРА ПЕРАВОДЗІМ СТРЭЛКІ ГАДЗІННІКАЎ НА 1 ГАДЗІНУ НАЗАД

У Беларусі завяршаецца перыяд дзеяння «летняга» часу. У сувязі з гэтым 26 кастрычніка ў 3 гадзіны ночы стрэлкі гадзіннікаў на ўсёй тэрыторыі Беларусі пераводзяцца на 1 гадзіну назад.

Жыхарка вёскі Броўск Свіслацкага раёна ***Ганна Сяргееўна ЛІНКЕВІЧ*** *месяц таму адзначыла 104 гады. Наступнай вясной яна збіраецца ехаць лячыць свой зрок, бо адчувае сябе вельмі некамфортна. Так і кажа: «Паеду ў Гродна на аперацыю». Зразумела, час для доўгажыхаркі — не проста механічны перавод стрэлак на гадзіннік...*

У сваякоў Ганны доўгажыхары былі толькі па матулінай лініі. Але каб перажыць уласных дзяцей — дзвюх дачок, і дачакацца прапраўнукаў, выпала толькі ёй, звычайнай вясковай жанчыне, колішняй калгаснай паляводцы. Выпала ёй яшчэ быць бежанкай у эвакуацыі ў Расіі падчас Першай сусветнай вайны, а падчас Другой сусветнай вайны стаць вязніцай нямецкага лагера ў Польшчы. Замуж яна выйшла ў 1934-м, а аўдавела ў 1984-м. Цяпер жыве пад наглядам апошняй дачкі. Любіць слухаць навіны і спяваць песні. Любіць гаварыць па тэлефоне з унукамі і праўнукамі. Прыгадваючы мінулае, то сумуе, то ўсміхаецца. Але ў будучыню глядзіць з аптымізмам, бо нездарма збіраецца паляпшаць здароўе. Лішняй на гэтай зямлі сябе не адчувае і жыць хоча адпаведна часу.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Свіслацкі раён.

Прэзідэнт назначыў Б. Батуру членам Савета Рэспублікі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання Барыса Батуру — старшыню Магілёўскага аблвыканкама.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дэлегатам і гасцям І з'езда рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь»

Дарагія сябры!

Сардэчна вітаю ваш форум, які сведчыць аб завяршэнні перыяду станаўлення арганізацыі, што прыйшоўся на адказны этап у жыцці суверэннай Беларусі. Цяпер наша краіна знаходзіцца на ўздыме. Хуткімі тэмпамі развіваюцца эканоміка і сацыяльная сфера. Павышаецца дабрабыт насельніцтва. За гэтымі поспехамі — вялікая праца нашых грамадзян. Напярэдзе яшчэ больш маштабныя задачы. Неабходна значна прымножыць дасягнутыя вынікі і трывала замацавацца ў групе найбольш развітых дзяржаў свету. Гэта магчыма толькі пры ўмове кансалідацыі ўсіх пазітыўных і здаровых сілаў беларускага грамадства.

За адносна невялікі прамежак часу ваша аб'яднанне стала масавым, набыло пэўны палітычны вопыт, праявіла здольнасць павесці за сабой людзей. Шырокая грамадскасць падтрымала ідэйную платформу арганізацыі, што красамоўна пацвердзілі нядаўнія парламенцкія выбары. Упэўнены, інтэлектуальны і творчы патэнцыял «Белай Русі» дазволіць ажыццявіць намечаныя мэты.

Жадаю з'езду плённай працы, а вам, яго ўдзельнікам, — моцнага здароўя, аптымізму, паспяховай дзейнасці. Разам мы пабудуем моцную і квітнеючую Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Удзельнікі антыфашысцкага супраціўлення ў Мінскім гета ўзнагароджаны пасмяротна медалямі

Міністр абароны Беларусі генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў ад імя Прэзідэнта краіны ўзнагародзіў за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне, 21 удзельніка антыфашысцкага супраціўлення, арганізаванага ў Мінскім гета, медалямі «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гадоў».

Даследчыкам, якія вывучалі архівы Мінска, Масквы, Іерусаліма і ўспаміны, удалося стварыць імянны спіс падпольшчыкаў Мінскага гета, у які ўвайшло 317 чалавек. Да ўзнагароджання юбілейным медалём былі прадстаўлены тыя, хто кіраваў падпольнымі групамі ў гета і актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці падполля, ажыццяўляў сувязь з партызанамі і загінуў у барацьбе ад рук фашыстаў. Гэта Якаў Кіркаешта, Майсей Екельчык, Леў Кулік, Мацвей Пруслін, Натан Вайнгаўз, Залман Окунь, Абрам Касцялянц, Ніна Ліс, Валянцін Жыцельзееў, Меер Фельдман, Эма Радава, Ханан Гусінаў, Іосіф Маслянскі, Рыгор Рубін, Давід Герцыг, Віктар Фельдман, Самуіл Каждан, Ілья Мушкін, Зяма Серабранскі, Рыгор Рудзіцэр, Соф'я Рыўкіна. Падпольная барацьба ў Мінскім гета стала складовай часткай агульнага руху антыфашысцкага супраціўлення ў Мінску. Асуджаныя на смерць вязні не схілілі галавы перад катамі. Яны перадавалі партызанам медыкаменты, боепрыпасы, адзенне, папаўнялі рады народных мсціўцаў. Узнагароды перададзены ў Музей гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі, сурацоўнікі якога зоймуцца арганізацыяй пошуку сваякоў узнагароджаных.

БЕЛТА.

Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю работу 27 кастрычніка 2008 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала). Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 27 кастрычніка 2008 года з 8.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
26 ноября 2008 г. проводит открытый аукцион
№ 04-Сф-08 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).
Предмет аукциона: право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется 15 земельных участков, расположенных в районе малоэтажной застройки в границах пр. Победителей — проезда Дрозды — р. Свислочь (застройка жилого квартала № 11) для строительства одноквартирных (блокированных) жилых домов:

Лот №	№ участка по ген-плану	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2.2	500000000007004533	0,0804	466 845 884	46684590	Участок свободен от застройки и насаждений	2 630 051
2	4.2	500000000007004539	0,0547	317 617 784	31761780	Участок свободен от застройки и насаждений	2 585 046
3	5.1	500000000007004540	0,0587	340 843 948	34084400	Участок свободен от застройки и насаждений	2 540 043
4	6	500000000007004436	0,0740	429 684 023	42968400	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 039
5	7	500000000007004437	0,0740	429 684 023	42968400	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 039
6	8	500000000007004438	0,0739	429 103 368	42910340	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 039
7	9	500000000007004439	0,0743	431 425 985	43142600	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 038
8	10	500000000007004440	0,0770	447 103 645	44710370	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 038
9	11	500000000007004441	0,0770	447 103 645	44710370	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 038
10	12	500000000007004442	0,0770	447 103 645	44710370	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 038
11	13	500000000007004445	0,0770	447 103 645	44710370	Участок свободен от застройки и насаждений	2 540 042
12	14	500000000007004446	0,0793	460 458 689	46045870	Участок свободен от застройки и насаждений	2 540 042
13	15	500000000007004447	0,0837	486 007 469	48600750	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 038
14	16	500000000007004450	0,0837	486 007 469	48600750	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 038
15	17	500000000007004451	0,0841	488 330 085	48833010	Участок свободен от застройки и насаждений	2 495 038

Земельные участки находятся в водоохраной зоне водных объектов г. Минска.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона: своевременное внесение победителем аукциона платы за соответствующие земельные участки; возмещение им расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона и формированием этих земельных участков, учитывая их государственную регистрацию.

Справочно: - в течение 2-х месяцев после принятия Минским горисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельных участков соответствующие имущественные права на них должны быть зарегистрированы в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

- техническая документация и разрешение на строительство жилого дома получается владельцами земельных участков в установленном порядке;

- победители аукциона заключают с Минским городским исполнительным комитетом договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений);

- собственникам земельных участков необходимо завершить возведение одноквартирного (блокированного) жилого дома не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации прав на земельный участок.

Аукцион состоится **26 ноября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток в размере 10 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома;

представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение в размере 1 % от цены продажи соответствующего земельного участка.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов для участия в аукционе начинается с **11.00 27 октября 2008 года** и заканчивается в **17.00 20 ноября 2008 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

внести плату за земельный участок;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

произвести оплату организатору торгов за подготовку и проведение аукциона, включающую возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, в размере 1 процента от цены продажи земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает выписку из решения о предоставлении земельного участка в частную собственность.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 4, 6.

Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.

Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.

УНП 190398883

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 5 НОЯБРЯ 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 24 октября 2008 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 3 ноября 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 14 ноября 2008 года.

Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 00.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней:
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БеСТ, Velcom, MTC) - по тарифам оператором мобильной связи.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.

ОАО «Агростройфирма ПМК-74-Налибоки» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания зерносклада (общ. пл. 984,7 кв.м), расположенного по адресу: Столбцовский р-н, д. Деревная. Площадь земельного участка 0,5980 га. Начальная цена с НДС – 342 979 000 бел. руб. Задаток в размере 5 % от начальной цены на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **25.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Патроны і «абрэзы» на продаж

Аператыўнае адсочванне фактаў крымінальнага абароту агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў выявіла адпаведнае парушэнне закона ў Жодзіне. Тут некалькі ахвотнікаў перараблялі гладкаствольную зброю ў нарэзную, а таксама выраблялі патроны калібру 5,45 і 9 мм да стралковай зброі. Як паведамілі ў прэс-службе ўпраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці, факт гэта не першы, аднак досыць рэдкі. Часцей аматары зброі займаюцца «рэканструкцыяй» знойдзеных экзэмпляраў часоў Вялікай Айчыннай. Супрацоўнікі УКДБ затрымалі парушальнікаў у момант чарговага збыту вырабленых «рэчаў». Пакупнікамі выступалі, дарэчы, мінчане, а захоўваўся набыты тавар на дачным участку. Факту прымянення зброі ці патронаў не зафіксавана. Затрыманыя шасцёра чалавек — жодзінцы і мінчане — адразу «здалі» ўсю партыю. Суд прыгавараў абвінавачаных да розных тэрмінаў пакарання з канфіскацыяй маёмасці.

Фота Артура СТРЭХА.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.10.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 115,00
1 еўра	2 669,13
1 расійскі рубель	78,16
1 украінская грыўня	353,09
1 польскі злоты	680,50

Абзац

■ Золата таннее на біржавых таргах чацвёрты дзень запар, паведамляюць інфармагенцтвы. Зніжэнне цаны на гэтым тыдні стала максімальным за 25 гадоў. За тыдзень цана на золата ўпала больш чым на 10 працэнтаў.

■ **Да канца кастрычніка захаваецца няўстойлівае надвор'е, абяцаюць сіноптыкі. У выхадныя абыдзецца без ападкаў, затым часам будуць ісці дажджы, ноччу ад 1 да 7 градусаў цяпла, магчымыя і замаразкі, удзень — ад 3 да 10 градусаў цяпла.**

■ Супрацоўнікі РАУС Гарадоцкага раёна затрымалі статак бычкоў, якіх спрабавалі незаконна перамясціць цераз мяжу. 50 галоў жывёлы перавозіліся ў паўпрычэпе машыны «Мерседэс-Бэнц», якой кіраваў жыхар Віцебскай вобласці. Ніякіх суправаджальных дакументаў пры ім не было. Назваць уладальніка грузу коштам каля Br50 млн ён таксама не змог. Пакуль бычкоў змясцілі ў адным з сельгаспрадпрыемстваў раёна. Устанаўліваецца гаспадар грузу.

■ **Жыхар сіцылійскага горада Катанія выйграў 100 мільёнаў еўра ў розыгрышы рэкорднага джэк-пота ў латарэю. Гэта адзін з буйнейшых выйгрышаў у сусветнай практыцы лато і самы вялікі — у Італіі. Шанцы ўгадаць 6 лічбаў у правільным парадку з 90 нумароў раўняліся 600 000 000:1.**

■ Медыкі вывучаюць рэдкае захворванне скуры, якое дазваляе яго носьбітам выкарыстоўваць сваё цела як запісную кніжку. Пацыенты з сіндромам штучнай крапіўніцы могуць пісаць на сваёй скуры пазногцем. Цела адной з хворых, кітаянкі Хуанг Ксянгдж, амаль цалкам пакрытае вершамі і нататкамі. 50-гадовая «папяровая жанчына» запэўнівае, што яе хвароба «вельмі карысная», бо дае магчымасць на паверхні рук пісаць спісы, напрыклад, пры наведванні магазіна.

Поўны абзац

■ Амерыканская паліцыя ў 73-ці раз арыштавала 76-гадовую старую, якая крала ў супермаркетах і за час сваёй «кар'еры» выкрыстала 36 розных імёнаў. Зараз яна праходзіць па справе як Кэтрын Келі. 15 кастрычніка пажылая дама скрала ў супермаркеце кашалёк, які ў якасці «нажыўкі» паклаў у сваю цялежку для пакупак пераадзеты паліцэйскі. Афіцэр выявіў свой партаманет у бабуліным бюстгалтары. Упершыню яна была арыштаваная ў 1971 годзе. Пасля гэтага пападалася на крадзяжах у розных гарадах, называла 26 розных датаў нараджэння. Зараз яна чакае чарговага суда.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже производственной базы (гараж площадью 266 кв.м, склад – 309 кв.м, служебное помещение – 35 кв.м, ж/б ограждение протяженностью 234 п.м.), расположенной в п. Сосновый Осиповичского района. Площадь земельного участка 0,3537 га. Начальная цена (снижена на 50 %) – 25 591 311 бел. рублей с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.05.2008 г. Аукцион состоится **04.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

ВЫБАРЧЫ ШЛЕЙФ

Яшчэ адна пяцёрка скаргаў аб непрызнанні вынікаў выбараў па некаторых акругах не была задаволена Цэнтральнай камісіяй

Заяўнікі спасылаліся на няроўныя ўмовы ў размяшчэнні агітацыйных матэрыялаў кандыдатаў, разыходжанні ў колькасці галасоў і наведвальнікаў выбарчых участкаў, меркаванае ўскрыццё урнаў для галасавання (у якасці доказаў прад'яўлялі фотаздымкі), прымус да датэрміновага галасавання. Дарэчы, прысутнічаў пры разглядзе сваёй скаргі толькі адзін былы кандыдат. Супрацоўнікі ЦВК у сваю чаргу па выніках праведзенай імі праверкі адзначалі, што інфармацыя ў скаргах або не заснаваная на выбарчым заканадаўстве, або доказна не пацвярджаецца, мае характар здагадак і не можа быць прынятая да ўвагі. Як вынік — ні адна са скаргаў не была задаволена.

У гутарцы з журналістамі старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына выказала спадзяванне, што «27 кастрычніка Мандатная камісія паспяхова прызнае ўсе паўнамоцтвы абраных дэпутатаў». Нагадаем, што першую сесію дэпутатаў чацвёртага склікання правядзе старшыня ЦВК. Асноўнымі на гэтым пасяджэнні будуць арганізацыйныя пытанні. Трэба прызнаць паўнамоцтвы новага дэпутацкага корпуса, тайным галасаваннем абраць старшыню і яго намесніка, утварыць пастаянныя камісіі і абраць іх кіраўніцтва і іншае.

Ала МАЧАЛАВА.

Падрабязнасці

НАШ БЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ДЫ НА ЎСЕ 100 ПРАЦЭНТАЎ!

У Мінску ў Нацыянальным прэс-цэнтры прайшла прэзентацыя даклада ААН аб сусветных інвестыцыях у 2008 годзе. Яго падрыхтавала Канферэнцыя ААН па гандлі і развіцці (ЮНКТАД) — спецыялізаваная арганізацыя ААН. Дык вось, згодна з класіфікацыяй ЮНКТАД, Беларусь аднесена да краін з высокім патэнцыялам прыцягнення інвестыцый.

На прэзентацыі была прадэманстравана станоўчая дынаміка прыцягнення прамых замежных інвестыцый (ПМЗ) у эканоміку нашай краіны за апошнія гады. Так, у 2004 годзе яны склалі 164 млн доларaў ЗША, у 2005-м — 305 млн, у 2006-м — 354 млн доларaў. Летась плынь замежных інвестыцый у нашу краіну дасягнула рэкордных аб'ёмаў — 1 772 млн доларaў! Па індэксе патэнцыялу прыцягнення ПМЗ мы апынуліся на 48-м месцы. Адначасова з высокімі тэмпамі прытоку інвестыцый, зноў жа згодна са звесткамі экспертаў ЮНКТАД, узнімаўся і рэйтынг Беларусі ў свеце па індэксе паказчыку прыцягнення ПМЗ. Калі ў 2006 годзе сярод 141 краіны мы былі на 125-м месцы, то летась ужо на 95-м. Калі браць нашых суседзяў, то Расія на 81-м месцы, Літва — на 53-м, Украіна — на 35-м, Польшча — на 60-м.

Прадстаўнік ААН у Беларусі Антоніус Брук спачатку пахваліў нашу краіну за высокія тэмпы росту прыцягнення ПМЗ. Бо сапраўды, за некалькі гадоў яны павялічыліся ў пяць разоў, што значна вышэй за сярэдняя паказчыкі як сярод краін СНД, так і ўвогуле ў свеце. Аднак потым А. Брук звярнуў увагу на нашы вялікія, мякка кажучы, нявыкарыстаныя рэзервы ў гэтай сферы. Нягледзячы на вельмі высокую інвестыцыйную прыбаўку ў 2007 годзе доля ПМЗ у валавых укладаннях у асноўны капітал склала толькі 12,9 працэнта. Для параўнання: у краінах СНД гэты паказчык роўны 19,7 працэнта. А глабальны паказчык — 14,8 працэнта.

Нешта падобнае, на погляд А. Брука, назіралася летась і ў сферы назапашвання ПМЗ у працэнтах да валавога ўнутранага прадукту (ВУП). Вось статыстыка даклада: Беларусь — 10,0 працэнтаў (4,5 млрд доларaў ЗША), Расія — 25,1 працэнта (324 млрд доларaў), Украіна — 27,0 працэнта (38 млрд доларaў), Літва — 38,3 працэнта (14,7 млрд доларaў). У краінах СНД і ўвогуле ў свеце адпаведна 26,0 працэнтаў (433,6 млрд доларaў) і 27,9 працэнта (15,2 трлн доларaў ЗША).

Але ў цэлым прагноз А. Брука для Беларусі станоўчы: яна мае ўсе шанцы далучыцца да ліку краін з высокім узроўнем прыцягнення інвестыцый. Як, напрыклад, Галандыя. Гэта ў многім будзе залежаць ад работы Урада па стварэнні інвестыцыйнай прывабнасці краіны ў свеце, сказаў прадстаўнік ААН.

Дарэчы, адным з такіх крокаў павінен стаць маючы хутка адбыцца Беларускі інвестыцыйны форум у Лондане. У час прэзентацыі гэта тэма закраналася неаднойчы. Як вобразна сказаў намеснік начальніка ўпраўлення інвестыцыйнага супрацоўніцтва і свабодных эканамічных зонаў Мінэканомікі Мікалай Підлажэвіч, гэта будзе поўнамаштабнае наступленне на Захад. Яго дзеловым людзям Беларусь прадаставіць цікавыя інвестыцыйныя праекты. Дырэктар Нацыянальнага інвестыцыйнага агенцтва Алег Зіноўеў сказаў, што форум мае стратэгічнае значэнне і стане чарговым звяном у ланцугу намаганняў па ліквідацыі пэўных прабелаў. Напрыклад, пакуль Беларусь мала гаварыла пра сабе, пра яе вялікія інвестыцыйныя магчымасці за мяжой. Цяпер надышоў час выпраўляць гэты недахоп. А. Зіноўеў паведаміў, што на форум у Лондан запрошаны генеральны сакратар ЮНКТАД Супачай Панітчпакдзі з прапановай зрабіць дакладагляд аб зменах у лепшы бок інвестыцыйнага клімату Беларусі.

Намеснік міністра замежных спраў Віктар Гайсёнак зазначыў, што ў мэтах пашырэння прытоку інвестыцый наша краіна моцна разлічвае на плённае супрацоўніцтва з ЮНКТАД. На думку В. Гайсёнка, асаблівая роля Канферэнцыі павышаецца ў цяперашніх умовах глабальнага фінансавага крызісу, які выклікаў паўсюдна на планеце сур'ёзную заклапочанасць. Важна, што ЮНКТАД дала сваю ацэнку прычынам яго ўзнікнення, сказаў В. Гайсёнак. Яе генеральны сакратар Супачай Панітчпакдзі, нагадаў намеснік міністра, неаднойчы папярэджваў аб дысбалансе ў сусветнай фінансавай сістэме, неабходнасці яе рэфармавання з самым актыўным удзелам ААН, выпрацоўкі новых механізмаў кіравання глабальнымі фінансамі.

— Мы поўнасцю падзяляем гэту пазіцыю ЮНКТАД, бо наспела нагода стварэння новага фінансавага парадку, які б уключаў у сябе і сістэму ранняга апавяшчэння аб крызісных пярэліннях і недапушчэння іх разбуральнага ўплыву на эканоміку, — падкрэсліў В. Гайсёнак.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

«БЕЛАЯ РУСЬ» НАМЕЦІЦЬ ПЕРСПЕКТЫВУ

На першым з'ездзе ўдзельнікам будзе прапанавана Праграма грамадскага аб'яднання

Сёння адбудзецца І з'езд Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», якое налічвае больш чым 82 тыс. удзельнікаў. На сустрэчу ў Мінску дэлегаваныя 380 прадстаўнікоў ад усіх абласцей і сталіцы. Плануецца падвесці вынікі работы аб'яднання, праведзенай з моманту яго заснавання ў лістападзе мінулага года, і вызначыцца з задачамі на будучыню. Чакаецца, што ўдзельнікі з'езда разгледзяць пытанні аб прыняцці Праграмы аб'яднання і аб давыбранні членаў Рэспубліканскага Савета «Белай Русі». З праектам Праграмы ўдзельнікаў азнаёміць старшыня аб'яднання, міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Наблюдательный совет ОАО «МЭФЗ»

сообщает, что 5 ноября 2008 г. в 16.00 в актовом зале завода по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100 состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «Минский экспериментально-фурнитурный завод».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О внесении изменений в Устав Общества.
2. О совершении крупной сделки в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах Белорусского государственного концерна по производству и реализации товаров легкой промышленности» от 19.05.2008 г. № 282.

УНП 100219829.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует,

что с 27 октября 2008 года изменены процентные ставки по некоторым вновь выдаваемым кредитам физическим лицам в белорусских рублях и иностранной валюте.

* * *

Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» или на веб-сайте банка

www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

20 АЎТАМАБІЛЯЎ, 180 КІЛАМЕТРАЎ І РАСХОД ПАЛІВА — 2 ЛІТРЫ

Карэспандэнт «Звязды» ўдзельнічала ў першым міжнародным эканам-ралі.

500 літраў у падарунак

Эканам-ралі — гэта аўтамабільныя гонкі, дзе пераможцам становіцца той, хто расходуе менш паліва падчас праходжання аднаго маршруту. Арганізатары такога мерапрыемства — а гэта холдынг «Атлант-М», Упраўленне ўнутраных спраў ДАІ Мінгарвыканкама — сёлета надалі яму статус міжнароднага, бо разам з беларускімі аўтааматарамі спаборнічалі экіпажы з Украіны і Літвы. Пабрацца ў ралі вырашылі дваццаць экіпажаў — галоўны прыз — 500 літраў паліва! Такі падарунак для вадзіцеля — не жартачкі!

«Памыліся — будзе дождж»

Рыхтавацца да ралі я і мой сябра Сяргей (бо менавіта мы ўдваіх з самага пачатку вырашылі ехаць толькі разам па прынцыпе ён — кіроўца, я — штурман) пачалі ўжо з вечара. Адна з галоўных умоў — аўтамабіль павінен быць чысты для нанясення стыкераў з лагатыпам ралі, а паліўны бак удзельнікі запаўняюць як мінімум да паловы. Выехаўшы на чысценькай «Міцубішы», Сяргей раптам агучыў: «Ну, машыну памылі, значыць будзе дождж». Паслухалі прагноз надвор'я — «без ападкаў». Не паверылі.

Поўны бак і свабодны старт

На старт прыехалі самыя розныя аўтамабілі з рознымі маторамі. Мы на нашай бензінавай і з аб'ёмам 1,8 неяк крыху засумавалі — з «салярачнікамі» канкурыраваць будзе вельмі складана... Але аб усім па парадку. Пасля тэхнічнай праверкі бак усіх удзельнікаў запоўнілі да краёў і аклеілі спецыяльнымі стыкерамі. Далей — свабодны старт у напрамку да Стоўбцаў!

Рэкорд для «пражорлівай» машыны

Ехаць нам давялося па ўсіх правілах эканоміі — ніякага кандыцыянера і ніякай музыкі. Для большай эканоміі некаторыя ўдзельнікі выключалі фары, але мы не рызыкнулі (па-першае, туман, па-другое, дождж, якога не абяцалі, а па-трэцяе.. так неяк спакайней!). Наша хуткасць — 50 кіламетраў у гадзіну. Хоць гэта і эканомна, ды для рухавіка — шкодна. Але ж што не зробіш за салодкую перамогу і 500 літраў паліва! Таму 180 кіламетраў (гэта да Стоўбцаў і назад) мы ехалі больш за тры гадзін. Затое які вынік! Наша «пражорлівая» машына засходавала на ўсе тыя ж 180 км 8 літраў! Для нас гэта быў маленькі, ды не, вялікі рэкорд!

Сакрэты эканоміі

Першымі мы так і не аказаліся. Апярэдзілі нас дызельныя машыны. У катэгорыі «да 1,4 літра» перамог Аляксей Каралёў на «Honda Civic 1.3», у катэгорыі «ад 1,4 да 1, 6 літра» Дзмітрый Баркан на «Honda Civic 1.6», у катэгорыі «звыш 1,6 літра» — Іван Крышкевіч на «Golf V 1/9 TDI». Дарэчы, пераможца Іван Крышкевіч усё ж такі падзяліўся некаторымі сваімі сакрэтамі эканоміі паліва: на працягу руху падтрымліваў аптымальныя абароты для свайго рухавіка — каля 1800 аб/хв, а большую частку маршруту ён праехаў на пятай перадачы з хуткасцю 70-80 км/г. Дарэчы, ва ўсіх пераможцаў расход паліва ў сярэднім склаў менш за 2 літры на 100 км. Вось так усё і было. Мы не перамаглі, але набраліся шмат вопыту. Магчыма, налета мы станем на першую прыступку п'едэстала.

У Эканам-ралі ўдзельнічала Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

КРАІНЫ ЕС ДАМОВІЛІСЯ АБ УВЯДЗЕННІ «БЛАКІТНАЙ КАРТЫ»

Краіны Еўрапейскага Саюза ў Бруселі дамовіліся аб увядзенні так званай Blue Card, аналагічнай амерыканскай Green Card, паведамляе DW-World.. ЗША ўжо даўно здабываюць канкурэнтныя перавагі, робячы стаўку на заахвочванне працоўнай міграцыі і падаючы «зялёную карту» спецыялістам, у якіх мае патрэбу амерыканская эканоміка. Адбудзецца гэта, праўда, не раней за май 2011 года.

Гісторыя пытання бярэ адлік з 2007 года, калі камісар ЕС па ўнутраных справах Франка Фраціні паведаміў, што толькі 5 працэнтаў мігрантаў, якія прыбываюць у Еўропу, можна назваць кваліфікаванымі спецыялістамі, а ў ЗША такіх — 55 працэнтаў.

Еўра — ўніз!

Эксперты прагназуюць адзінай еўрапейскай валюце падзенне да 1,13 долара...

Некалькі дзён таму, наяўны еўра прадаваўся банкамі ў сярэднім па 2980 рублёў за 1 еўра, а ўчора ўжо — па 2820. А нядаўна быў каля 3400 рублёў.

Учора на сусветным валютным рынку курс адзінай еўрапейскай валюты «праваліўся» да адзнакі 1,25 долара ЗША. Гэта, нагадаем, стала самым нізкім узроўнем з кастрычніка 2006 года. Нягледзячы на тое, што мноства экспертаў сцвярджаюць, маўляў, ніякіх фактараў для росту курса долара няма, тым не менш, амерыканская валюта даражэе. І гэта пры тым, што ўмацаванне пазіцый долара па-ранейшаму ніяк не падмацавана пазітыўнымі зменамі ў эканоміцы ЗША. Што ж у такім выпадку адбываецца насамрэч з курсамі еўра і долара? Каб знайсці адказ на гэтае пытанне, якое, заўважым, сапраўды хвалюе многіх, мы звярнуліся па каментарый да **члена грамадскага навукова-эканамічнага савета пры «Звязде», дэкана эканамічнага факультэта БДУ, прафесара Міхаіла КАВАЛЁВА.**

— На мой погляд, на рост курса долара паўплывалі дзве прычыны, — гаворыць Міхаіл Кавалёў. — Першая — невялікія дзяржавы, з не вельмі надзейнай уласнай валютай, накшталт Ісландыі, збаўляюцца ад апошняй. Такое ж жаданне і ў інвестараў, якія ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу разумеюць, што першымі церпяць менавіта згаданыя краіны. Цяпер выводзяцца інвестыцыі з розных краін, у тым ліку, што і мы бачым, з Расіі. Апасаючыся дэфолту, як у Ісландыі, інвестары сыходзяць з гэтых дзяржаў, а каб зрабіць гэта — ім патрэбна купіць долары: яны прыйшлі з амерыканскай валютай — з ёй хочуць і сысці. Выхад з дробных валют і павялічвае попыт на долары.

Па-другое, у сітуацыі, калі ніхто і нікому не верыць і патрабуе вяртаць крэдыты, зноў жа ніхто нікому не дае магчымасці пераакрэдытавацца. А грошы неабходна вяртаць. І ўсім, хто ўзяў за мяжой крэдыты ў доларах (за мяжой іх амаль заўсёды бяруць у гэтай валюце) і павінны іх вярнуць, патрэбна зноў амерыканская валюта. Таму доларaў не хапае. Апошняя акалічнасць таксама паўплывала на завышэнне цаны долара.

— Магчыма, сённяшні кошт долара — не крайняя мяжа: некалькі дзён запар курс амерыканскай валюты толькі ўмацоўваецца?

— Так, многія эксперты прадказваюць, што гэты працэс будзе працягвацца: грошы з нядоларавай зоны будуць і далей спаганяцца, а таму яшчэ нейкі перыяд часу попыт на долары застанецца высокім. Эканамісты BNP Paribas нават прадказваюць, што за 1 еўра будуць даваць толькі 1,13 долара. Галоўная прычына цяперашняга попыту на долары — гэта тое, што да крызісу ад 60 да 70 працэнтаў сусветных фінансавых інструментаў былі намінаваныя ў доларах ЗША.

— Як вы мяркуеце, цяпер долар — добрае ўкладанне грашовых сродкаў?

— Я не буду арыгінальным, калі скажу, як і многія замежныя эксперты, што сённяшняя цана долара — не сапраўдная, гэтая валюта цяпер вельмі пераацэненая. Нават у Расіі долар не можа каштаваць 27 расійскіх рублёў. Я думаю, што не пройдзе шмат часу і ўсё вернецца на свае кругі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

КОШТ НА РАСІЙСКУЮ НАФТУ ЎПАЎ НІЖЭЙ ЗА 60 ДОЛАРАЎ ЗА БАРЭЛЬ

Кошт расійскай нафты маркі Urals 24 кастрычніка ўпаў ніжэй за адзнаку ў 60 доларaў за барэль.

Насуперак чаканням паніжэнне аб'ёмаў здабычы нафты картэлем АПЕК не прывяло да росту кошту. Раней міністр фінансаў Расійскай Федэрацыі Аляксей Кудрын заяўляў, што расійскі бюджэт будзе бездэфіцытным пры 70 доларах за барэль...

КАГО ХОЧУЦЬ БАЧЫЦЬ ПРЭЗІДЭНТАМ ЗША Ў КРАМЛІ?

У Расіі расце страх перад Баракам Абамай як перад магчымым прэзідэнтам ЗША, піша ў пятніцу нямецкая Die Welt.

Маладога Абаму параўноўваюць з Джонам Кэнэдзі, а эксперты нагадваюць: нягледзячы на ілюзіі, якія СССР сілкаваў, кубінскі крызіс разгарэўся менавіта ў эпоху яго прэзідэнцтва.

Адносіны Расіі з ЗША пры дэмакратах заўсёды былі горшымі. Нямецкая газета прыводзіць меркаванне расійскіх экспертаў, якія кажуць, што для «расійскіх каршуноў», якія прапаведуюць «суверэнную дэмакратыю», Макейн, безумоўна, больш жаданы прэзідэнт.

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом имущества детского оздоровительного лагеря «Бригантина» (балансодержатель — УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ»), расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, 0,5 км севернее д. Петровщина, детский оздоровительный лагерь «Бригантина». В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объектов	Инв. №
1.	Физкультурно-оздоровительный комплекс (общая площадь – 283,7 кв.м)	630/С-47603
2	Котельная с навесом (общая площадь – 396,4 кв. м)	630/С-47604
3	Детсад-ясли корпус № 1 (общая площадь – 1276,0 кв. м)	630/С-47605
4	Трансформаторная подстанция (общая площадь – 18,0 кв. м)	630/С-47607
5	Административно-приемный корпус (общая площадь – 101,1 кв. м)	630/С-47608
6	Детсад-ясли на 140 мест корпус № 2 (общая площадь – 1096,1 кв. м)	630/С-47609
7	Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 732,4 кв. м)	630/С-49350
8	Здание специализированное для общественного питания (общая площадь – 1749,6 кв. м)	630/С-49353
9	Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 735,4 кв. м)	630/С-49354
10	Канализационно-насосная станция (общая площадь – 23,5 кв. м)	630/С-47570
11	Склад (общая площадь – 165,1 кв. м)	
12	Бытовое здание для обслуживающего персонала (общая площадь – 131,8 км. м)	
13	Кабельная линия	
14	Внешние кабельные сети	
15	Наружное освещение	
16	Наружные сети тепловые, водопроводные и т.п.	
17	Наружная канализация	
18	Водопровод с артскважиной	
19	Водонапорная башня	
20	Устройство подъездной автодороги	
21	Ограждение с воротами	
22	Противопожарный подъезд к водоему	
23	Котел Минск-1	
24	Котел Минск-1	
25	Теплообменник Р-025-8,9-1Х	
26	Лифт грузовой малый	
27	Лифт грузовой г/п 100 кг	
28	Таль электрическая МЗ-320	

Начальная цена – 2 133 716 497 белорусских рублей.

Земельный участок площадью 11,75 га (в том числе: земельный участок площадью 10,3544 га кадастровый номер 623881300098000008, земельный участок площадью 0,0232 га кадастровый номер 623881300980000007, земельный участок площадью 1,3754 га, кадастровый номер 623881300098000009) предоставлен для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений детского оздоровительного лагеря «Бригантина».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 200 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» №3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 26 ноября 2008 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 24 ноября 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.

УНП 190398583

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Молодечненском райисполкоме

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:

№ лота	Объект	Общая площадь (кв.м)	Адрес	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток
1	Незавершенное строительством законсервированное капитальное строение, 3-этажная кирпичная пристройка к корпусу № 17 «а»	1598,4	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	643 647 060	5 %
2	Площадка для сбора мусора	94,20		5 137 830	10 %
3	Теплопункт, (корпус № 11)	101		19 607 670	10 %
4	Ремстройцех и столярная мастерская (корпус № 12)	431,8		63 316 080	10 %
5	Бассейн оборотного водоснабжения	пл. застройки 464 кв.м		64 437 930	10 %
6	Склад металла заготовительный резной (корпус № 10)	626,5		95 126 400	10 %
7	**1)** Корпус 16 Б, АСУП *(1216,1 кв.м)*; **2)** Прессовый участок пластмасс, (пристройка к корпусу № 16 Б), *199,1 кв.м*; **3)** Пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, *422,1 кв.м;* **4)** склад готовой продукции (корпус 16 Б), *397,1 кв.м;* **5)** два металлических навеса для хранения тары при корпусе 16 Б *(142 кв.м, 119 кв.м)*; **6)** пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, *298,2 кв.м* г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67			543 024 000	5 %
8	Здание столовой (3-этажное, с подвальным помещением и помещением трансформаторной подстанции; в т.ч. оборудование — трансформатор ТМ 400/10/04; подстанция трансформаторная ТРП	5378,2	г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67	1 753 449 525	50 000 000

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.10.2008 г. Аукцион состоится **11 ноября 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **10 ноября 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«14» ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный аукцион

по продаже объекта, находящегося в собственности Крупского района, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для обслуживания недвижимого имущества

На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:

Здание склада (инв. № 613/С-7546), расположенное по адресу: Минская область, Крупский район, пос. Крупский, ул. Вокзальная, 1990 года постройки, общей площадью 367,3 кв.м. Одноэтажное, фундамент железобетонный, стены и перегородки – кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы – асфальтные, вентиляция – естественная, имеется бетонная рампа 194 кв.м, **и право заключения договора аренды земельного участка,** площадью 0,0609 га, сроком на 10 лет, отведенного для обслуживания здания склада.

Начальная цена предмета аукциона 45 730 648 рублей (в том числе: имущество – 45 710 238 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 20 410 рублей).

Сумма задатка для участия в аукционных торгах 4 000 000 руб.

Продавец имущества: Коммунальное производственное унитарное предприятие «Крупский деревообрабатывающий комбинат», расположенный по адресу: Минская область, г. Крупки, ул. Чапаева, 2, тел (801796) 55 1 54.

Арендодатель земельного участка: Крупский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» документы в указанные в извещении сроки.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Крупским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Крупскі веснік» от 9 августа 2008 г. № 61.**

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 13 ноября 2008 г. до 13.00.

Наш культурны асяродак
Жыроандоля
Выпуск № 20 (42)
25 кастрычніка 2008 г.
3
ЗВЯЗДА

СХАДЗІЦЕ Ў МУЗЕЙ!

Сёння ў сталіцы налічваецца 17 музеяў. За мінулы год музеі наведалі 929,8 тыс. чалавек. Тым не менш, нягледзячы на актыўную працу іх супрацоўнікаў па абнаўленні экспазіцый, арганізацыі новых выстаў даныя сацыялагічнага даследавання сведчаць: музеі для многіх мінчан не з'яўляюцца прыцягальным месцам правядзення вольнага часу. У прыватнасці, не наведваюць гэтыя ўстановы культуры больш за трэць апытаных — 34,6 працэнта.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пісьмо ў рэдакцыю

КАПЫТЫ САЛАЎЁЎ У КУПАЛАЎСКІМ ПАРКУ

О салавей, я чую стук тваіх капытоў!

Генрых ГЕЙНЭ.

Ці чулі вы, як спяваюць-цёхкаюць салаўі ціхай майскаю ноччу? Заслухаешся! Здаецца, на ўсёй зямлі спакой, лагода, прыгажосць, якія не парушыць (не можа парушыць!) аніякае здарэнне. Адным словам, стан прыспанай пільнасці.

Бываюць і двухногія «салаўі». Як яны ўмела выспеўваюць патрыятычную асанну — роднаму краю, яго гісторыі, культуры, прыродзе!.. Калі б і не хацеў, то страціш пільнасць. Але тут сярод нібыта шчырага хваласпеву раптам пачуецца стук... капытоў. І падумаецца: ці сапраўды шчыры гэты спеў, і ўвогуле, што гэта за «салаўі»?..

За апошнія гады, асабліва падчас юбілеяў, «салаўі» з розных чыноўніцкіх кабінетаў нямала наспявалі ў гонар народнага паэта Беларусі Янкі Купалы: і нацыянальны геній, і прарок, і бацька нацыі, і стваральнік канцэпцыі беларускай дзяржаўнасці... І не маглі не спяваць: творы песняра, сама асоба Янкі Купалы сталі своеасаблівым сімвалам беларускага народа і Беларусі як незалежнай дзяржавы. Такім сімвалам, якім у Расіі здаўна стаў Аляксандр Пушкін, ва Украіне — Тарас Шаўчэнка. Купалаўскі парк, у якім дагэтуль чуваць крокі песняра, дзе на месцы спаленай фашыстамі яго хаціны ўзнік двухпавярховы Дом-музей, дзе велічна ўзвышаецца помнікам яго гордае аблічча, даўно стаў месцам паломніцтва людзей з розных блізкіх і далёкіх краёў. І вось у гэтым свяшчэнным для кожнага беларуса месцы апошнім часам, і з кожным разам усё гучней, раздаецца стук капытоў розных «салаўёў».

Першымі, як і водзіцца, азваліся гандляры. Нейкі «Гандлёвы дом «Кварта» (?!) паклаў вока на Купалаўскі парк — задумаў узвесці тут «аб'ект грамадскага харчавання» на 100 пасадачных месцаў. Чаму і не пакласці вока: самы цэнтр Мінска, можна сказаць, яго сэрца, побач — усе неабходныя камунікацыі, гатовая інфраструктура. Не спыніла «квартыстаў» ні тое, што гэта не проста парк, а Купалаўскі парк, ні тое, што афіцыйна ён мае статус рэспубліканскай гісторыка-культурнай каштоўнасці, ні нават тое, што літаральна побач — некалькі іх сур'ёзных канкурэнтаў: рэстараны, кафэ, бары («Журавінка», «Радзівіл», «Узбекістан», «Славянка», «Экспансія»). Што ж, гэта і не дзіўна: гандляры ёсць гандляры, любяць рызыку. Здзіўляе іншае. Просьбу гандляроў тут жа задаволілі «салаўі» з адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска, якія найперш і павінны клапаціцца пра эстэтычнае і ўсялякае іншае добрае аблічча «свайго» элітнага парку. Менавіта яны пралабіравалі згоду ў Мінгарвыканкаме, і той, прыспаны салаўіным цёхканнем, сваім рашэннем 27 красавіка 2006 г. (№ 815) дазволіў «закрытому акционерному обществу «Торговый дом Кварта» проведение проектно-изыскательских работ для строительства объекта общественного питания в парке им. Я. Купалы на земельном участке г. Минска площадью 0,12 га под застройкой».

Здаецца, сціпла: усяго 12 сотак. Але ж гэта — тэрыторыя, якая павінна ахоўвацца дзяржавай як вялікая гісторыка-культурная каштоўнасць! Тут кожная сотка на вагу золата. Тут бы размясціць скульптурныя выявы герояў купалаўскіх твораў (Гусляр, Паўлінка, Адольф Быкоўскі, Званар, Мікіта Зносак і інш.), даўно задуманыя прыбудову да купалаўскага Музея, гараж для паэтавай легкавушкі (пра што вядзецца гаворка не адзін год). А то — звычайнае «питейное заведение», якіх побач і крышку далей (у суседнім парку імя М. Горкага, на Плошчы Перамогі) — больш чым дастаткова... Да гэтага, будынак рэстарана, сувымерны па сваім памеры з Купалавым Домам-музеем (толькі яго цокальны паверх можа заняць паводле плана плошчу ў 375 м²), запатрабуе яшчэ і гаспадарчай зоны з пад'язнымі шляхамі для грузавога і легкавога аўтатранспарту, пракладкі камунікацый (водапровад, каналізацыя, цеплатраса і інш.), а гэта значыць — высечкі пэўнай колькасці зялёных насаджэнняў. Ды і без высечкі некаторыя дрэвы знікнуць, засохнуць у выніку прымусовага паніжэння грунтовых водаў: будаўніцтва ж планується рабіць пры беразе Свіслачы, а цокальны паверх рэстарана і камунікацыі заглыбяцца на 2-3 метры. Што ўжо тут да «экалогіі культуры» (Д. Ліхачоў), калі звычайная экалогія не бярэцца ў разлік!..

Улічваючы тое, што «будаўніцтва рэстарана надоўга закрые для наведвання вялікі ўчастак тэрыторыі парку і пацягне за сабой неабгрунтаваную высечку дрэў у цэнтры горада, а пад'езд абслуговага транспарту да аб'екта выкліча пагаршэнне экалагічных характарыстык парку», генеральны дырэктар»Мінскзелянбуда» В. І. Кулеш у пісьме ад 14. 08.2006 г. (№ 04/325) да старшыні Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама В.Д. Нікіціна прасіў «адмяніць рашэнне па будаўніцтве прадпрыемства грамадскага харчавання ў парку імя Я. Купалы». Ды дзе там!

Скрозь салаўінае цёхканне пачуўся новы стук капытоў, прычым ужо падкаваных. Архітэктар Маскалевіч Л.В., як ні дзіўна (усё ж — прадстаўнік культуры!), у сваёй творчай майстэрні па просьбе гандляроў тут жа згадзіўся распрацаваць эскіз, а пасля і праект «питейного заведения» ў Купалаўскім парку. Аднак яшчэ больш дзіўна, што згоду на яго размяшчэнне ў гэтым парку і «добро» эскізу дала ўстанова, якая па сваім службовым абавязку павінна сачыць за захаваннем культурных каштоўнасцяў беларускага народа. Гэта — Міністэрства культуры Беларусі, дакладней — Рэспубліканская навукова-метадычная рада, якая існуе пры міністэрстве. А можа, і не дзіўна? Многія міністэрскія чыноўнікі даўно не лічаць патрэбным параіцца з грамадскасцю па тых ці іншых праблемах культурнага жыцця рэспублікі. У дадзеным выпадку на пасяджэнне Рады 15 лютага 2007 г., на якім абмяркоўваўся лёс Купалаўскага парку, не былі запрошаны ні прадстаўнікі Міжнароднага фонду Янкі Купалы, ні нават навуковы кіраўнік рэканструкцыі добраўпарадкавання парку... А хто-хто, як ні міністэрскія чыноўнікі ведаюць, што ўжо колькі гадоў ляжыць без руху гатовы праект вышэй згаданай і так неабходнай прыбудовы да купалаўскага Дома-музея, у якім маглі б размясціцца сотні найцікавейшых экспанатаў, што залягаюць у музейных запасніках. А хіба не выклікала б у наведнікаў музея цікавасць даваенная аўтамашына маркі «Шэўрале», падараваная ўрадам БССР Янку Купалу, калі б для гэтай машыны знайшлося належнае месца побач з Музеем?.. На жаль, на гэтыя праекты грошы не знаходзяцца, міністэрскія чыноўнікі іх не лабіруюць...

Прайшлі тры вясны з салаўіным цёхканнем у Купалаўскім парку і амаль тры поўныя гады, як скрозь тое цёхканне пачуўся стук капытоў. Здавалася б, ён павінен ужо і аціхнуць. Тым больш, што, згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (№ 667 ад 27.12.2007 г.), толькі адзін год з дня зацвярджэння акта на выдзяленне зямельнага ўчастка адводзіцца на прадстаўленне ў арганізацыю па землеўпарадкаванні генеральнага плана аб'екта будаўніцтва. А ён і дагэтуль не прадстаўлены. Тым не менш, стук падкаваных капытоў не заціхае. Не дай Божа, каб пачуўся яшчэ і стук тапароў і адбойных малаткоў...

Юрый ГРАДАЎ,
заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі, член аўтарскага калектыву па рэканструкцыі Купалаўскага парку.
Леанід ЛЕВІН,
заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі, член аўтарскага калектыву па рэканструкцыі Купалаўскага парку.
Барыс ЮРЦІН,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, навуковы кіраўнік рэканструкцыі Купалаўскага парку.
Вячаслаў РАГОЙША,
доктар філалагічных навук, прафесар, старшыня Міжнароднага фонду Янкі Купалы.

Учора падчас Боскай Літургіі, якую ў мінскім Кафедральным саборы правёў Патрыярх усяе Русі Аляксій II, набажэнства транслявалася на вялікі экран усталяваны каля храма. Тысячы людзей стаялі вакол у супольнай малітве.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА
фота слова

Зямля і Акіян даўно
Наскрозь парэзаны мяжою,
Агульнае ў людзей — адно:
Святая высь над галавою.
Мы ўсе у высі той жывём
Адной Надзеяй, Верай, Марай,
І не заступяць неба хмары,
Пакуль гучыць спрадвечны Звон.

СВЯТАЯ СПРАВА МІКАЛАЯ КУЦАКОВА

Аповед пра тое, дзеля чаго капітан першага рангу ў адстаўцы будуе царкву

У вёсцы Палессе пасяліўся цікавы чалавек, жыхар Масквы Мікалай Міхайлавіч Куцакоў. Вестка аб ім разнеслася па Чачэрскім і суседніх раёнах — былы марскі афіцэр, капітан першага рангу ў адстаўцы на свае зберажэнні будуе храм Святіцеля Мікалая Цудатворцы, які раз такі, які быў у гэтай вёсцы раней, дзе ішлі богаслужэнні амаль сто гадоў...

Едзем па ледзь не суцэльным лясным тунэлі.

Да вайны сям'я Куцаковых жыла ў суседніх Барсуках. У Міхаіла Яфімавіча і Аксінні Емяльянаўны, патомных хлебаробаў, было трое дзяцей: два хлопчыкі і дзяўчынка. Старэйшы з іх, Коля, нарадзіўся 7 красавіка, у дзень, калі кожны год праваслаўны люд адзначае вялікае хрысціянскае свята — Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы. Калі бацька пайшоў ваяваць з фашыстамі, у маці засталося на руках гэтыя малыя. Міхаіл Яфімавіч загінуў пры вызваленні Гомельшчыны і пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Пакалюбічы. Пасля вайны, у 1947 годзе, Аксіння Емяльянаўна пабралася шлюбам яшчэ раз, з Васілём Пятровічам Савасцьянавым, і нарадзіла пяцярых дзяцей. Такім чынам, у сям'і расло ў сяброўстве, згодзе і сялянскай працы трое сыноў і пяцёра дачок. Усе знайшлі сваё месца ў жыцці: у Маскве, Бранску, Іжэўску, Гомелі, Слуцку...

Коля пасля заканчэння Барсукоўскай пачатковай школы вучыўся ў Палескай сярэдняй.

Царква

У Палессі царква, пабудаваная ў 1843 годзе, была драўляная і, як паўсюдна, стаяла на ўзвышаным месцы. Прыход гэтага праваслаўнага Мікалаеўскага храма ў 1886 годзе налічваў больш за 4800 чалавек. Ды і пасля, як гаворыцца, сюды не зарастала народная сцяжынка. Да 1934 года, калі на хвалі барацьбы з рэлігіяй было прынята рашэнне закрыць і разбурыць храм.

Мясцовыя мужыкі, колькі іх ні ўгаворвалі, не згадзіліся на знішчальныя работы, і тады была нанятая брыгада з сямі чалавек з суседняга Краснагорскага раёна Бранскай вобласці. Калі яны пачалі разбіраць купал, адзін з іх паслізнуўся і, падаючы ўніз, у цэнтр храма, зачапіўся вопраткай за крук, на якім раней вісеў абраз. Гэта і выратавала яго. Бог пашкадаваў чалавека, вырашылі прышлыя, згарнулі свае работы і адмовіліся працягваць іх. Дзірку залаталі, і будынак доўгі час выкарыстоўваўся як калгаснае збожжасховішча.

На жаль, у Палессі і суседніх вёсках засталося мала людзей, якія былі сведкамі тых далёкіх падзей, але хто-ніхто з іх, гаворыць Мікалай Міхайлавіч, памятае святара часоў 30-х гадоў айца Васілія, яго богаслужэнні. Лёс гэтага чалавека аказаўся трагічным. У архівах упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Гомельскай вобласці маюцца дакументы, якія расказваюць аб яго (у міру — Васіля Іванавіча Жудро) жыцці і дзейнасці.

Айцец Васілій і яго сям'я карысталіся сярод людзей вялікай павагай, і калі была закрыта царква, ніхто з народа не ведаў, як склаўся іх далейшы лёс.

Архіўныя ж дакументы сведчаць, што ён быў арыштаваны 7 лютага 1938 года, праз паўтара тыдня пасля таго, як быў расстраляны яго брат Іван (айцец Іаан) за быццам бы антысавецкую агітацыю. На допытах ён паводзіў сябе мужна, катэгарычна не прызнаў абвінавачанні ў свой адрас і не адмовіўся ад веры, ад Бога, цвёрда заявіўшы, што сан святара з сябе ён не здымае. Айцец Васілій, паводле прыгавора сумна вядомай асобай тройкі НКУС, быў расстраляны 13 сакавіка 1938 года, а яго маёмасць канфіскаваная. Дарэчы, праследаванні ўладаў не абмінулі і айца Захара. Такія вось тады былі часы.

Пасля вайны людзі пачалі пісаць у розныя інстанцыі лісты з просьбай адкрыць царкву, але безвынікова. Нарэшце, у 1956 ці 1957 годзе, расказвае далей Мікалай Міхайлавіч, у раён прыйшло распараджэнне канчаткова разабрацца з пытаннем. І там гэта было ўспрынята наступным чынам: трэба разабраць будынак храма, а матэрыялы яго пусціць на прыбудову да будынка школы — спартыўнай залы, некалькіх класных пакояў. Не-

Фота Ірыны МАРЧАКА.

каторыя работы тут выконвалі старшакласнікі, сярод якіх быў і Мікалай Куцакоў.

Калі ж у вёсцы пабудавалі новую школу, цагляную ўжо, будынак ранейшай наогул знік. Ён запаў у памяць як частка былой царквы толькі старэйшага пакалення. Мікалай адразу ж пасля заканчэння школы паехаў у Гомель і ўладкаваўся матросам у рачным параходстве. Пасля была служба ў арміі ў Ленінградскай вобласці, школа сяржантаў у Эстоніі, Ленінградскае ваеннае вучылішча, акадэмія тылу і транспарту (факультэт транспарту, марское аддзяленне). Ва Узброеных Сілах Куцакоў праслужыў амаль 35 гадоў: Ленінград, Поўнач, Балтыка, Далёкі Усход і, нарэшце, Масква, Цэнтральнае ўпраўленне Міністэрства абароны СССР. Інжынер па суднах ваенных зносінаў, капітан першага рангу быў узнагароджаны 13 медалямі. У 1993 годзе ён стаў пенсіянерам.

На сваю радзіму Мікалай Міхайлавіч наведваўся пастаянна, дзе ў Барсуках і дагэтуль жыве яго брат Міхаіл. І кожны раз засмучаўся тым, што ў вёсках застаецца мала моладзі, што шмат людзей налягае на спіртное, што народ ужо і не ставіць пытанне аб адкрыцці храма. А ўсё таму, што няма духоўнага выхавання.

Рашэнне

Падчас тых водпускаў і з'явілася ў Мікалая Міхайлавіча задума аднавіць гістарычную справядлівасць — пабудаваць царкву. Выношваў ён яе доўгі час, не гаворачы аб гэтым нічога сваёй жонцы Людміле Віктараўне. А да рэальных спраў дайшло, калі ў яго, ужо на пенсіі, з'явілася шмат вольнага часу. Таму ўсё пралічыў, узважыў, усклаўшы надзеі на свае сілы, на свае фінансавыя магчымасці. І ў гэтым знайшоў поўную падтрымку і разуменне сваёй жонкі.

Людміла Віктараўна, з якой мы таксама сустрэліся, ураджэнка Севастопаля, дачка марскога афіцэра, які прайшоў усю вайну, узнагароджаны чатырма ордэнамі і, атрымаўшы інваліднасць першай групы, памёр дваццаць гадоў таму. У Куцаковых у Маскве добрая кватэра, а пад горадам Чэхавам — дача. Дзве замужнія дачкі маюць у сталіцы Расіі сваю справу.

Людміла Віктараўна — старшы выкладчык Інстытута павышэння кваліфікацыі настаўніцкіх кадраў, кандыдат педагагічных навук, аўтар шэрагу кніг і дапаможнікаў па методыцы выхавання дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Вершы ў кнігах яна выкарыстоўвае ўласныя. Цяпер рыхтуецца да выдання чарговая яе кніга па сістэме заняткаў з дзецьмі з абмежаванымі разумовымі магчымасцямі, і адну з іх яна паабяцала перадаць рэабілітацыйнаму цэнтру Чачэрска. Ганарары Людмілы Віктараўны за тыя публікацыі ідуць у агульную скарбонку сям'і, на святую справу — будаўніцтва храма ў Палессі.

Падтрымка

Эскіз і праект новай царквы Мікалай Міхайлавіч распрацаваў сам, разлічыўшы ўсё да дробязяў, што, вядома, было зусім не проста. А ў апошнія гады ён вырашаў многія арганізацыйныя пытанні і, на шчасце, атрымаў падтрымку і ў органах улады, і сярод служыцеляў праваслаўнай царквы. А гэта — і зацвярджэнне праекта, і адвод зямлі, і наогул дазвол на будаўніцтва, афармленне розных дакументаў. Так, архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх параіў будаваць Куцакову цагляную царкву, а не драўляную, як раней думаў рабіць Мікалай Міхайлавіч. На эскізе ж уладыка напісаў «Бог у помач. Боскае бласлаўленне». Паспрыяў ён і ў набыцці будаўнічых матэрыялаў — блокаў, белых сілікатных камянёў.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Фестывалі

Гран-пры фестывалю — мікрааўтобус «Газэль»

«Напеў зямлі маёй» — пад такой назвай 25 кастрычніка ў Мар'інай Горцы пройдзе VIII фестываль народнай творчасці Мінскай вобласці.

Гэты фестываль называюць галоўным форумам аматарскай творчасці Міншчыны, ён ахоплівае ўсю жанравую палітру народнага мастацтва.

У конкурснай праграме возьмуць удзел каля 30 «народных» і «ўзорных» аматарскіх калектываў з усіх рэгіёнаў Міншчыны.

Ацэньваць народныя таленты будзе журы, якое ўзначаліць народны артыст СССР, старшыня Беларускага саюза кампазітараў, прафесар Ігар Лучанок. Сустаршыня журы — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Г. Цітовіча, народны артыст Беларусі, старшыня Беларускага саюза музычных дзеячаў, прафесар Міхаіл Дрынеўскі.

Пераможцаў чакаюць каштоўныя прызы: камп'ютары для студыі гуказапісу, музычныя інструменты, відэакамеры.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні культуры Мінаблвыканкама, Гран-пры фестывалю — мікрааўтобус «Газэль». Ён будзе ўручыста ўручаны старшынёй аблвыканкама Леанідам Круцом аддзелу культуры, пад апекай якога знаходзіцца калектыў-пераможца.

Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.

«Я ПАВЯДУ ЦЯБЕ Ў МУЗЕЙ...»

Падых векапомных дзён будзе захоўвацца ў новым будынку Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — адзін з лепшых у свеце па гэтай тэматыцы. Па грунтоўнасці, аб'ёме і ўнікальнасці фондаў, зместавай насычанасці экспанатаў, значная частка якіх захоўваецца толькі ў Мінску...

Наш музей — ці не адзіны ў свеце, які пачаў стварацца, калі вайна была яшчэ ў самым разгары...

Для Беларусі, прынамсі, гэта не проста музей. Гэта і біяграфія беларускага народа, адлюстраванне яго складанага лёсу: гісторыя народнай трагедыі, гераічнай барацьбы і народнай Перамогі.

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка патрыятызм назваў адным з галоўных складнікаў светапогляду беларускага народа і дзяржаўнай ідэалогіі. Музей вайны — дакладнае ўвасабленне патрыятызму. Дастаткова прайсціся па музейных залах, каб асэнсаваць і ўсвядоміць, чаму ў нашым народзе 3 ліпеня 1944 года ўспрымаецца як яшчэ адна дата нараджэння і нацыянальнага адраджэння. Невыпадкова менавіта ў гэты дзень адзначаецца дзяржаўнае свята — Дзень Рэспублікі.

Музей Вялікай Айчыннай вайны расце, развіваецца. Ужо адчуваецца істотны недахоп плошчаў у сховішчах. Дый да самога будынка на Кастрычніцкай плошчы, дзе размяшчаецца музей на працягу больш як 40 гадоў, узніклі сур'ёзныя пытанні ў плане бяспекі.

Вось чаму на высокім дзяржаўным узроўні і прынята рашэнне аб узвядзенні новага будынка музея. Ён размесціцца на праспекце Пераможцаў, непадалёк ад абеліска «Мінск — горад-герой». Гэта будзе адзіны гарманічны скульптурна-архітэктурна-ландшафтны ансамбль. Галоўны архітэктар праекта — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесар Міжнароднай акадэміі архітэктуры Віктар Крамарэнка (ён вядомы як аўтар Нацыянальнай бібліятэкі і Мінскага чыгуначнага вакзала).

Узгоднены і тэрміны будаўніцтва: мяркуецца, што новы музейны будынак урачыста адкрыецца да 65-й гадавіны Вялікай Перамогі.

Цікавасць да гэтай падзеі ў грамадстве вялікая. Выказваецца і заклапочанасць: ці не страціць музей частку сваіх бясцэнных фондаў, з улікам таго, што яму давядзецца перажыць не адзін, а два пераезды — спачатку на часовую пляцоўку, а потым у новы будынак. Пачалі гуляць самыя розныя, часам неверагодныя чуткі — таму і паступаюць у рэдакцыю занепакоеныя тэлефанаванні чытачоў...

«Звязда» была першай газетай, якая ўжо 5 жніўня 1944 года паведаміла аб адкрыцці музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. І зараз мы паспрабуем атрымаць адказы на самыя вострыя пытанні, якія сёння непакояць грамадскасць...

Размова з дырэктарам Дзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Сяргеем Азаронкам атрымалася адкрытай, грунтоўнай, шматвектарнай.

Сакрэтная дырэктыва Панамарэнкі

— У Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца каля 80 працэнтаў усіх рэліквій і экспанатаў краіны, звязаных з ваеннай тэматыкай. У экспазіцыі прадстаўлена больш як 10 тысяч экспанатаў. Больш як 140 тысяч экспанатаў — у фондасховішчах, — расказвае Сяргей Іванавіч.

Для параўнання: у Маскве ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на Паклоннай гары — каля 210 тыс. экспанатаў. Крыху больш, чым у нас (дый па памерах нашы краіны істотна адрозніваюцца!), але ж гэта зусім іншыя экспанаты.

Значная частка нашых экспанатаў «аўтэнтычная»: яны датаваны ваеннымі гадамі. Сапраўдныя рэчы таго часу! Унікальныя калекцыі, лістоўкі, плакаты...

— Яны пахнуць вайной!

— А пісьмы з фронту, а самаробная партызанская зброя, а рукапісныя часопісы!.. У Маскве падобных экспанатаў — адзінкі. А па партызанскім руху дык увогуле ўсяго некалькі тысяч «аўтэнтычных» экспанатаў.

Па якасным напаўненні, змястоўнасці, каштоўнасці экспанатаў — музеяў, роўных беларускаму, няма ў СНД. Ну, хіба што Кіеўскі да нас можа крыху дацягнуцца, ён быў створаны ў 1970-х гадах, штосьці ўдалося сабраць...

— Наш музей быў створаны ў верасні 1943 года!

— Менавіта тады было прынята рашэнне ЦК КП(б)Б аб стварэнні музея. Але ўжо ў 1942 годзе ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве на Краснай плошчы прайшла выстаўка «Беларусь жыве, Беларусь змагаецца...» Яна апавядала аб подзвігах партызан, аб беларускім падполлі... Гэта выстаўка і стала асновай адной з залаў музея, які адчыніў дзверы для наведвальнікаў 22 кастрычніка 1944 года.

— Па сутнасці, абрысы музея намеціліся ўжо ў 1942 годзе?

— Сапраўды, абрысы. Бо на той час не было канцэпцыі музея — дый да Перамогі пралягалі доўгія вёрсты вайны.

Як вядома, музеі заўсёды пачынаюцца з выставак. Дарэчы, тую выстаўку наведаў першы сакратар ЦК КП(б)Б Панамарэнка — і ў 1943-м выдаў сакрэтную дырэктыву аб пачатку збору экспанатаў для Музея пераможцаў.

— Сакрэтная дырэктыва?

— Так! Можна сабе ўявіць, як камандзіры брыгад, атрадаў рэагавалі на гэта. 1943 год, ідуць карныя аперацыі, акупанты паляць вёскі, людзей знішчаюць; дый на фронце яшчэ няма такога татальнага наступлення, немцы яшчэ адчуваюць сябе моцнымі... І раптам паступае каманда адбіраць экспанаты для будучага Музея пераможцаў!

Гэта быў, вядома ж, і мабілізуючы фактар. Як упэўненасць: мы ўсё роўна пераможам.

Цяперашні будынак музея.
Такой будзе зала Перамогі ў новым будынку музея.

У кабінеце, дзе сядзеў кат беларускага народа...

— У вызваленым Мінску было няшмат «цэлых» будынкаў...

— Першапачаткова музей размяшчаўся на плошчы Свабоды. У будынку сённяшняга Дома прафсаюзаў у час вайны быў нямецкі штаб, кабінет гаўляйтара Кубэ. А пасля вызвалення Беларусі, з кастрычніка 1944 года, будынак стаў музеем гісторыі вайны — і былы кабінет гаўляйтара стаў кабінетам дырэктара музея.

— Як сімвалічна атрымалася!

— Паралель, сапраўды, красамоўная... Прайшоў час — музей пераехаў у будынак на вул. К. Маркса, там зараз Нацыянальны музей гісторыі і культуры. Магчыма, не ўсе ведаюць, што наш сённяшні будынак першапачаткова ўзводзіўся менавіта для гістарычнага музея. Пэўнае чаргаванне залаў — з улікам перыядаў гістарычнага развіцця... Улічваючы спецыфіку будынка, мы таксама зрабілі «паэтапную» экспазіцыю вайны.

А ў новай канцэпцыі музея мы закладваем моцную ідэю прасторавай «усеахопнасці» пабудовы экспазіцыі. Наведвальнік будзе і бачыць, і адчуваць. Цікавы прасторавы прыём, характэрны для многіх музеяў ваеннага тыпу, у цяперашнім будынку не мог быць ужыты, а там мы яго цалкам рэалізуем.

Архітэктару Віктару Крамарэнку ўдалося так увасобіць ідэю, што з розных залаў праз своеасаблівыя шкляныя «прастрэлы» можна будзе бачыць стэлу «Мінск — горад-герой».

...Усе спецыялісты адзначаюць унікальнасць, прадуманасць, адметнасць цяперашняй нашай экспазіцыі, а ў новым будынку яе «каэфіцыент карыснага дзеяння» стане значна большым.

З улікам сусветных стандартаў

— Праходзіла нямала інфармацыі аб тым, якім будзе новы будынак музея...

— Адразу адзначу: музей не абцяжараны задачамі пабудовы. Горад Мінск выступіў ініцыятарам гэтай справы, за што вельмі ўдзячны гарадскім уладам. Функцыі казчыка ўскладзены на Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама, яны займаюцца ўсімі тэхнічнымі пытаннямі. А мы, музейшчыкі, больш працуем над канцэпцыяй і фарміраваннем будучай экспазіцыі. Радуе, што інвестар улічвае абсалютна ўсе выказаныя намі пажаданні.

Музей зрабіў заяўку на ўзроўні сусветных стандартаў — і гэта не перабольшанне.

Супрацоўнікі музея, прадстаўнікі інвестара, Упраўлення капітальнага будаўніцтва, спецыялісты «Мінскграда» (яны непасрэдна займаюцца праектам разам з творчай лабараторыяй В. Крамарэнкі), галоўны архітэктар Мінска — усе разам прыйшлі да высновы, што экспазіцыйная плошча павінна быць 4000 кв. м.

— А якая экспазіцыйная плошча ў цяперашнім будынку музея?

— Такая ж, 4000 кв. м. Але тут яна «сціснута», а там гэта плошча будзе працаваць на наведвальніка ў арыфметычнай прагрэсіі. Дадам: на такой жа плошчы (без уліку новых пабудоў) размешчана экспазіцыя гістарычнага музея ў Маскве. Яго дырэктар Аляксандр Шкурко сказаў мне: «Мы гісторыю Расіі ўклалі ў 4000 кв. м — упэўнены, гісторыю вайны вы зможаце годна паказаць на гэтай плошчы».

У гэтым комплексе — музейным храме! — будуць змешчаны адкрытыя фонды. Гэтага няма ні ў адным буйным музеі на постсавецкай прасторы.

— У сувязі з гэтым, Сяргей Іванавіч, пытанне: але ж для гэтага патрабуецца строгі тэмпературна-вільготнасны рэжым, інакш партызанскія газеты, лістоўкі могуць проста рассыпацца?

— Там будзе не толькі тэмпературна-вільготнасны рэжым. Для лістовак, рукапісных і друкаваных выданняў — яшчэ і пэўнае шкло для абароны ад ультрафіялету... Усё ўлічана.

У новым будынку можна будзе ўбачыць унікальныя калекцыі. Усё лепшае, найкаштоўнейшае будзе выстаўлена. Тое, што не ўвойдзе ў экспазіцыю канцэптуальна, будзе паказана калекцыйна.

— А што значыць — калекцыйна?

— У нас, напрыклад, дэманструецца халодная зброя дзвюх сусветных войнаў — гэта і ёсць калекцыйны паказ фондаў. А раней усё гэта захоўвалася ў жалезных скрынях за трыма дзвярыма, з сігналізацыяй, куды маглі ўвайсці толькі тры чалавекі: дырэктар музея, галоўны захавальнік і фондавы работнік, які адказвае за калекцыю. Цяпер на гэту выстаўку могуць прыйсці ўсе ахвотныя. Розніцу адчуваеце? Інвестар дае нам магчымасць усе ўнікальныя калекцыі (падкрэслю: не ўсе фондавыя матэрыялы, а самыя каштоўныя) размясціць у экспазіцыі. Аналагаў гэтаму не было.

Рабочая група не аднойчы абмяркоўвала актуальныя пытанні і праблемы — і ў музеі, і ў майстэрні Крамарэнкі, і ў галоўнага архітэктара. Усе пажаданні навукова-метадычнага савета ўлічаны.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Па ўсіх і за ўсё

24 кастрычніка Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі АЛЯКСІЙ II узначаліў Божую Літургію ў Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы.

Праваслаўныя вернікі пачалі збірацца каля галоўнага храма краіны задоўга да пачатку набажэнства. Аднак да прыбыцця Патрыярха на плошчу перад саборам пускалі толькі акрэдытаваных журналістаў і запрошаных гасцей. Людзі цярпліва чакалі і добразычліва прапускалі наперад «шчасліўчыкаў». Бліжэй да пачатку літургіі частку вернікаў прапусцілі ў храм з разлікам, каб сабор, насамрэч невялікі па памерах, не быў перапоўнены. Астатнія мелі магчымасць удзельнічаць у службе паза сценамі храма, дзе быў змешчаны вялікі экран, на якім транслявалася набажэнства. Уся саборная плошча і прылеглая да яе тэрыторыя былі «затопленыя» народам.

Тым часам у Свята-Варварынскім прыдзеле храма некалькі свяшчэннікаў спавядалі тых, хто хацеў у гэты дзень прычасціцца. Храм быў запоўнены вялікай колькасцю духавенства, манаства, сястрыцтва, але былі тут і дзеці, і старыя, і ветэраны, упрыгожаныя медалямі і ордэнамі, і моладзь. Многія знайшлі сабе месца на харах, лесвіцах, у прыдзеле. Міжволі звяртаў на сябе ўвагу свяшчэннік, які стаяў справа ад алтара, побач з прадстаўнікамі дыпмісій: на правым баку яго падрасніка былі змешчаны царкоўныя ўзнагароды, а на левым — ваенныя...

Патрыярх, калі зайшоў у сабор, перш за ўсё пакланіўся мошчам святой Сафіі Слуцкай. Любое патрыяршае набажэнства ўвасабляе ў сабе паўнату царквы, бо на ім разам моляцца і вернікі, і пастыры, і архірэі, і сам прадстаяцель. Але літургія, якая адбылася 24 кастрычніка ў Мінскім кафедральным саборы, злучыла ў адной малітве праваслаўных розных памесных цэркваў. Нездарма Патрыярх падкрэсліваў, што ўрачыстасці ў гонар 1020-годдзя Хрышчэння Русі сведчаць пра еднасць народаў і веры. У літургіі ўзялі ўдзел Епіскапаты Маскоўскага Патрыярхата, Украінскай Праваслаўнай Царквы, Рускай Праваслаўнай Царквы за мяжой, Польскай Праваслаўнай царквы, прадстаўнікі Балгарскай, Сербскай, Чэшскай, Амерыканскай Праваслаўных Цэркваў.

Атмасферу Патрыяршага богаслужэння цяжка перадаць словамі. Гэта дзіўнае пачуццё сапраўды адпавядае святу святаў, якое ствараюць і цудоўны хор, і ўрачыстае адзенне духавенства, і светлыя вочы людзей, і, вядома ж, натхнёная малітва таго, хто служыць, і тых, хто яму саслужвае, а таксама ўсіх вернікаў. Перад прычасцем людзям было зачытана пасланне Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы з нагоды 1020-годдзя Хрышчэння Русі. Дзясяткі епіскапаў, сотні свяшчэннікаў і міран мелі магчымасць прычасціцца Тайнаў Хрыстовых у самога Патрыярха.

— ...Не першы раз Гасподзь дае мне магчымасць знаходзіцца ў межах Белай Русі, — сказаў пасля завяршэння Літургіі Прадстаяцель Рускай Праваслаўнай Царквы, — і зноў я бачу добрыя і шчодрыя плады сумеснай працы, якая здзяйсняецца любоўю на дабро Царкве і зямной Айчыны. Тут моцная вера, непарушная надзея і дзейная любоў. Усё гэта — плады духоўнага пераўтварэння, сэрцам і душой успрынятага і на працягу стагоддзяў захаванага набожным беларускім народам...

Свяцейшы Патрыярх яшчэ раз павіншаваў Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта з 30-годдзем яго архірэйскага служэння на землях Белай Русі і ўзнагародзіў яго Высокапраасвяшчэнства ордэнам Аляксія Мітрапаліта Маскоўскага. На малітоўную памяць Патрыярх Аляксій II уручыў Мітрапаліту Філарэту святыя панагіі (невялікія абразы, якія носяць архірэі на грудзях) і крыж. Мінскаму Свята-Духаву кафедральнаму сабору Свяцейшы Уладыка падарыў святы Еўхарыстычны посуд, на якім у гэты дзень прыносілася Бяскроўная Ахвяра «па ўсіх і за ўсё».

Мітрапаліт Філарэт падзякаваў Патрыярху і падарыў яму спецыяльна зроблены дакладны спіс Мінскага абраза Божай Маці, — «як знак шчырай любові і ўдзячнасці». Яшчэ адзін такі спіс знаходзіцца ў Кіеве. Такім чынам «Маці Божая Мінская» зноў сімвалічна аб'яднала сталіцы трох краін, і тры народы, якія спавядаюць адну веру, аднаго Бога, і аб'яднаныя адной Царквой.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«Я ПАВЯДУ ЦЯБЕ Ў МУЗЕЙ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— Пытанне, што ляжыць на паверхні: а якая выгада інвестару? Любое прадпрыемства ўкладвае сродкі дзеля таго, каб іх вярнуць. Музей — гэта не рэстаран, не гатэль, не аўтамайстэрня...

— Элемент прэстыжу таксама прысутнічае. Непадалёк ад цяперашняга музейнага будынка будзе ўзведзена гасцініца, яе плошчы закрануць і нашу цяперашнюю тэрыторыю, таму мы і з'язджаем... Інвестар, пабудаваўшы найсучасны музей, атрымае пэўную кампенсацыю.

Трэба ўлічваць і маральны складнік: узвесці будынак аднаго з лепшых музеяў свету — таксама можа мець пэўны рэкламны ход. Паказаць, што ў год Вялікай Перамогі інвестар дапамог вялікай справе...

У час сустрэчы з расійскімі суворaўцамі і нахімаўцамі.

Галоўнае — захаваць сведчанне народнага подзвігу

— Музей рыхтуецца пераехаць на часовую пляцоўку — куды?

— Канчатковае рашэнне пакуль не прынята. Разглядаецца некалькі варыянтаў, у тым ліку — часова размясціць музей у памяшканні былой Ленінскай бібліятэкі. Мы ўважліва агледзелі гэта памяшканне — для ашчаднага захавання музейных экспанатаў, усіх фондаў там вельмі добрыя, аптымальныя ўмовы. Гэта самы важкі аргумент менавіта «за» гэта памяшканне — і галоўны контраргумент для нашых апанентаў, якія палохаюць грамадскасць размовамі пра тое, што нібыта будуць незваротна страчаны экспанаты народнага подзвігу... Гэта нацыянальны скарб, і кіраўніцтва краіны робіць усё, каб захаваць яго для будучых пакаленняў.

У памяшканні былой Ленінкі будзе не вельмі вялікая экспазіцыйная плошча. Але ж мы не ставім задачу стварыць пастаянную экспазіцыю. Пабудуем стацыянарныя выстаўкі, прысвечаныя вузлавым накірункам. І перш за ўсё — 65-годдзю вызвалення Беларусі.

Не варта забываць, што музей — не толькі экспазіцыя і фонды, гэта і вялікі аб'ём педагагічнай, навукова-асветніцкай дзейнасці. Упор будзем рабіць на выезды ў школы, у працоўныя калектывы, у рэгіёны...

Галоўная наша задача — забяспечыць бяспеку і захаванасць музейных фондаў на гэтым этапе і працягваць распрацоўку канцэпцыі генеральнай экспазіцыі новага будынка. Тытанічная праца! Уявіце: адна музейная зала звычайна ствараецца каля года. У нас будзе 30 залаў, таму музейшчыкі асэнсавана ўшчыльняюць свой графік работы.

Канцэпцыю новай экспазіцыі мы пачалі ствараць два гады таму, а не наскокам, ліхаманкава, як некаторыя хочуць думаць. Вывучылі дасканала сітуацыю ў буйных музеях краін СНД, у нашых абласных музеях. Распрацаваную канцэпцыю даслалі на рэцэнзію-экспертызу ў вядучыя музеі — Дзяржаўны гістарычны музей Расіі, музей на Паклоннай гары, у Цэнтральны музей Узброеных Сілаў РФ. Атрымалі выдатныя водгукі. Былі і канкрэтныя заўвагі, якія ўжо ўлічылі. У бліжэйшы час канцэпцыя будзе разгледжана на Радзе дырэктараў музеяў, а потым зацверджана Міністэрствам культуры. І адразу пасля гэтага, паралельна, праводзячы эвакуацыю музея на новую пляцоўку, мы прыступаем (віртуальна) да стварэння новай экспазіцыі.

— Сяргей Іванавіч, 65-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне адзначым праз паўтара года — ці ёсць вострая неабходнасць пераяджджаць на гэты невялікі перыяд часу? Народная мудрасць сведчыць: два пераезды раўназначныя аднаму пажару... Чытачы звоняць, турбуюцца: ці захаваюцца экспанаты, ці не пашкодзяцца за два пераезды?

— І да мяне таксама прыходзілі ветэраны, мы падрабязна тлумачылі ім сітуацыю. Пераезд неабходны: гэта пытанне бяспекі. Абследаванне музейнага будынка заведчыла, што неабходны тэрміновы капітальны рамонт. Яшчэ ў сакавіку 2004 г. была забаронена эксплуатацыя будынка: па 53 пунктах былі выяўлены пажарныя парушэнні. Каля 90 працэнтаў пліт перакрыцця даху падлягае замене, 5 трэшчын па ўсім фасадзе (некаторыя дасягаюць да 10 см)... У час паводкі, бывае, вада працякае ў фондасховішча праз лямпачкі, праз плафоны...

Намі былі ўкладзены пэўныя сродкі на капрамонт з мадэрнізацыяй — і мы пачалі б яго. І закрыўся б будынак, і мы ўсё роўна перайджалі б...

Такім чынам, рашэнне кіраўніка дзяржавы было надзвычай своечасовым: падтрымаць, узмацніць, зрабіць лепшым музеем на постсавецкай прасторы...

Хаця чаюся магчымасцю, хачу запэўніць усіх, хто непакоіцца пра лёс фондаў музея. Пераезд на часовую пляцоўку будзе ажыццёўлены толькі пры ўмове абсалютнага забеспячэння аптымальных характарыстык для бездакорнага захавання ўсіх экспанатаў. На ўсім ланцугу пераездаў будзе прысутнічаць міліцыя: упакоўка — запячатванне — перамяшчэнне... Будзем звяртацца і ў кантралюючыя органы — іх увага стане нам дадатковай дапамогай і падтрымкай...

Перакананы: згаданая вамі прымаўка пра два пераезды — яна не пра страты, а пра намаганні, якія давядзецца прыкласці.

У музеі моцны, высокапрафесійны, духоўна багаты калектыў. Пастаўленыя задачы нам па сілах.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Гэту тэму «Звязда» абмяркуе з усімі зацікаўленымі бакамі. Да ўдзелу ў размове запрашаем і нашых чытачоў.

Любоў і цярплівасць як запаветы продкаў

Якое месца царква займала на працягу стагоддзяў у жыцці беларусаў і як яе каштоўнасці паўплывалі на характар нашага народа? Адказы на гэтыя пытанні прапанавалі падчас «круглага стала» прадстаўнікі духавенства і свецкіх навук.

Чаму да гэтай тэмы звяртаюцца сёння навукоўцы? Таму што ўсведамленне важнасці хрысціянскіх каштоўнасцяў дапамагае супрацьстаяць выклікам часу. На гэта звярнуў увагу Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч: «У эпоху глабалізацыі, у час жорсткага прагматызму, важна захаваць духоўны стрыжань. Усвядоміць уплыў хрысціянства на ход гісторыі. Таму што хрысціянскія каштоўнасці аказалі вялізны ўплыў на фарміраванне культуры народаў, на нацыянальную свядомасць і лад жыцця ўсходніх славян, у тым ліку і беларусаў. Школа, кнігі на працягу многіх стагоддзяў былі выключна царкоўнымі. Былі розныя часы. Але цяпер новы этап у развіцці хрысціянства ў Беларусі».

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт пажадаў навукоўцам шчыраваць у пазнанні свету і чалавека. І звярнуўся да гісторыі Царквы на нашай зямлі. «Хрышчэннем у Дняпроўскай купелі быў вызначаны адзіны духоўны шлях для нашых народаў і сфарміраваны лад нацыянальнага і духоўнага быцця кожнага з іх. Дабратворная галінка лазы Хрыстовай, высаджаная ў 988 годзе, дала свае добрыя парасткі на зямлі Белай Русі, калі ў 992 годзе ў Полацк мітрапалітам Лявонцiем быў пастаўлены першы епіскап. Менавіта з таго моманту бярэ свой пачатак Праваслаўная Царква на нашай зямлі, галоўнай задачай якой — аднаўленне душы чалавека, навучанне яго «хадзіць прад Богам».

Невыпадкова, што многія людзі навукі звярталі ўвагу на «нацыянальныя асаблівасці веры», на факты з гісторыі праваслаўнай царквы на нашых землях. Шмат дакументаў з царкоўнага жыцця захоўваюцца сёння ў Нацыянальным архіве.

Але гісторыю хрысціянства на гэтай зямлі захоўвае і... сама зямля. Яна адкрывае археолагам новыя сведчанні таго, што тысячу гадоў таму нашы продкі імкнуліся спасцігнуць таямніцу Боскай любові.

Прафесар, археолаг Пётр ЛЫСЕНКА, пазнаёміў з вельмі цікавымі знаходкамі з самых розных куточкаў Беларусі і заведчыў:

— На тэрыторыі ўсёй нашай краіны падчас археалагічных даследаванняў былі выяўлены старажытныя прадметы, характэрныя для праваслаўнай веры. У Тураве, Брэсце былі знойдзены праваслаўныя нацельныя крыжыкі, крыжы-інкалпіёны. Археолагі, якія вялі даследаванні старажытнага Мінска ў раёне Нямігі, знайшлі цікавыя рэчы, напрыклад, абраз Божай Маці, а на адвароце — выява Святога Пятра. Ёсць полацкія знаходкі. На адным з абразкоў — выява Святой Алены і яе сына імператара Усходне-Рымскай імперыі Канстанціна, яны займаліся пошукамі крыжа, на якім быў распяты Ісус Хрыстос. Знаходка са старажытнага Пінска — цудоўны маленькі абраз, выразаны з каменю, ён утрымлівае сляды пазалоты і датуецца XII стагоддзем. У старажытным Тураве быў знойдзены праваслаўны епархіяльны крыж са свінцу. Адтуль жа — пячатка Кіеўскага Мітрапаліта Кірыла з надпісам на грэчаскай мове, а на адвароце — выява Божай Маці. Неверагодным было адкрыццё падмурка Тураўскага храма. А падчас раскопак была знойдзена цудоўная кадзільніца з выявамі святых на шасці гранях. І абразок на костцы з выявай Ісуса Хрыста. Тураву ў XI стагоддзі належала Бярэсце. Таму не дзіўна, што ў Бярэсці была знойдзена выява Дзмітрыя Салунскага, які спрыяў Тураўскаму князю Ізяславу Яраславічу. Датуецца яна сярэдзінай 1052 года. У вёсцы Капланцы Брэсцкага раёна наш калега адкапаў цудоўныя маленькія абразкі, выкананыя ў вельмі тонкай тэхніцы перагародчатай эмалі. Ёсць у нас і самы старажытны ў Беларусі буквар — грабяні з літарамі, не лацінскімі, а кірылічнымі... Гэтыя знаходкі з'яўляюцца сведчаннем таго, што пасля прыняцця хрысціянства Візантыйская культура, найвышэйшая ў той час, стала распаўсюджвацца на беларускіх землях, што мела вялікае значэнне для развіцця народа. Дзяржаўнае — гэта спрыяла фарміраванню дзяржаўнасці на гэтых землях. Эканамічнае — перадавыя на той час тэхналогіі з Візантыі прыйшлі на нашу зямлю, асабліва ў ювелірнай справе, у архітэктуры. Духоўнае і адукацыйнае — развіваўся іканапіс, распаўсюджваліся кнігі, веды. Мы павінны гэта прызнаваць і быць удзячнымі нашым продкам.

Сучасныя жыхары Беларусі разумеюць каштоўнасць духоўнага скарбу, які збіралі многія пакаленні папярэднікаў. І ёсць рэч, якая для беларусаў мае асаблівае значэнне, — крыж нашай святой Ефрасінні Полацкай. Мы гатовыя падарыць сваім гасцям самае каштоўнае. І хоць самі не маем арыгінала, але Свяцейшаму Патрыярху, які аддаў пашану навукоўцам і багасловам, паднеслі ў дар галаграфічную выяву Крыжа Ефрасінні.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Гэты небяспечны, але прыцягальны «Байкер»

Запрашальнік

Доўгачаканую і даўно абяцаную прэм'еру мюзікла «Байкер» мінчане і госці сталіцы ўбачаць 8 лістапада ў Палацы Рэспублікі.

Дарэчы, летась у Мінску быў прадстаўлены толькі маленькі ўрывак з будучай пастаноўкі, а вось цалкам яе раней за сталіцу — гэтай вясной і летам — убачылі жыхары Гродна, Бабруйска і Брэста. Але, як лічаць аўтары праекта — кампазітар Уладзімір Кандрусевіч, рэжысёр-пастаноўшчык і аўтар дыялогаў Генадзь Давыдзька, мастак-пастаноўшчык і мастак па касцюмах Веніямін Маршак, харэограф Надзея Тарашкевіч, — гэта чаканне апраўданае. Усе элементы мюзікла, ад дэкарацыі да вакальных партый, зробленыя максімальна дасканала. Мінчан чакае сапраўднае шоу працягласцю больш як 2 гадзіны — відовішчнае і яркае, з напружаным сюжэтам і бліскучымі дыялогамі, з эмацыянальна насычанай музыкай і сучаснай пластычнай харэаграфіяй, і пры ўсім тым — з глыбокай мараллю... Кажуць, у якасці сюрпрызу рыхтуецца яшчэ дадатковы нумар.

«Байкер» — гэта сучаснае прачытанне знакамітага скандальнага рамана ў лістах Шадэрло дэ Лакло «Небяспечныя сувязі». Кінаверсіі гэтага рамана прынеслі аўтарам мноства прэстыжных узнагарод, але паставіць яго ў форме мюзікла раней за беларускі прадзюсарскі цэнтр «Спамаш» ніхто не вырашаўся.

У цэнтры сюжэта — перапляценне лёсу дзвюх моцных асобаў: гаспадыні начнога клуба Элеаноры і яе былога каханка, а цяпер моднага рэжысёра, байкера Франка. Імкнучыся адпомсціць свайму праціўніку, Элеанора распачынае складаную інтрыгу, куды ўцягвае і Франка. Але ўменне гразь на чалавечых слабасцях на гэты раз робіць ахвярай саму Элеанору, а ў выніку Франка ўрываецца сапраўднае каханне, што становіцца для байкера і найвялікшым шчасцем, і адначасова трагедыяй... У галоўных ролях занятыя Іван Бабішчэвіч (уладальнік спецыяльнага прыза Алы Пугачовай «Залатая зорка Алы» Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў папулярнай музыкі «Юрмала-2008»), актрыса і тэлевядучая Вера Палякова, артысты прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Дарыя (фіналістка тэлепраекта «Народны артыст-2»), Іван Буслай і Алена Ланская.

У планах пастаноўшчыкаў пасля мінскай прэм'еры — паказаць мюзікл у гастрольным туры па Беларусі, а пазней таксама ў Расіі і ва Украіне.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Калектыў РУП «Аўтобусны парк № 2» г. Баранавічы віншуе ўсіх аўтамабілістаў і дарожнікаў краіны, а таксама работнікаў і ветэранаў прадпрыемства з прафесійным святам. Усім — здароўя, шчасця і новых творчых поспехаў.

У ГОНАР ХЛОПЦА Ў ВЫШЫВАНЦЫ

У кашулі-вышыванцы Анатоль Сыс чытаў свае вершы, у ёй быў пахаваны. Але жыццё яго вершаў — працягваецца.

Трэці раз у роднай вёсцы Анатоля Сыса Гарошкаве адбудзецца свята паэзіі ў яго гонар. Беларускі паэт пайшоў з жыцця заўчасна, у 45 гадоў. Але шмат тых, хто любіць і памятае яго. Шмат тых, каго кранула яго слова. Шмат і тых, хто адкрыў для сябе такога паэта ўжо пасля смерці. Чаму так здараецца? Адказ на гэтае пытанне шукаюць у тым ліку і людзі, якія вырашылі арганізаваць свята паэзіі ў Гарошкаве, што на Гомельшчыне. Адзін з іх — Эдуард Акулін, які патлумачыў, дзеля чаго 26 кастрычніка ў Гарошкаў паедуць аматары паэзіі:

— Такое здараецца — генія прызнаюць пасля смерці. Яна ўсё расстаўляе па месцах. Анатоль жа сам яшчэ пры жыцці казаў пра сябе: «Я брат Максіма Багдановіча і сын Янкі Купалы». Заяўляў пра роднасць з імі ў творчым плане. Прызнаюць гэта і многія іншыя людзі. Некаму, напэўна, спатрэбіўся час на разуменне таго, якога паэта страціла Беларусь. Некаторым — яшчэ спатрэбіцца. Але тыя, хто памятае Анатоля і чытае яго вершы, хто адчувае дух паэзіі, які працягвае жыць, вырашылі аддаць пашану таленту, арганізаваўшы Свята паэзіі ў яго на радзіме, у вёсцы, дзе ён заўсёды праводзіў лета. Але калі мы там пабывалі, паглядзелі, пабылі на магіле... Вырашылі: трэба, каб у Анатоля Сыса быў годны помнік. Неўпарадкаваная магіла паэта — сорам для нацыі.

Родныя, сёстры паэта хацелі, каб у аснове помніка быў крыж — сімвал пакутаў, непрызнання, неразумення, з якімі ён сутыкаўся ў жыцці. І менавіта такі помнік з'явіцца на яго магіле. Аўтарам стаў скульптар Генадзь Лойка. Твор Лойкі адпавядае адчуванню асобы: крыж, барэльеф самога паэта і яшчэ гняздо на цярновым вянцы, адна з галінак упявецца ў скронь Анатолю, а побач сядзіць птах-салоўка... Гэты помнік быў усталяваны летам. А на дзень нараджэння паэта ён будзе адкрыты. Яго дзень нараджэння святкуюць вядомыя паэты, барды, мастакі, якія спецыяльна прыедуць на Свята паэзіі, назву для якога даў адзін з паэтычных радкоў Сыса: «Дух — гэта, людзі, Я!» Людзі, якія захочуць далучыцца да гэтай падзеі, могуць таксама паехаць у Гарошкаў, дзе будуць гучаць вершы, песні — літаральна пад адкрытым небам. Амфітэатрам імпрэзы стане падворак роднай хаты Анатоля Сыса.

Сапраўды, смерць усё расстаўляе па месцах. І тыя, каго пры жыцці маглі лічыць блізнамі, адкрываецца для людзей па-новаму. А можна ўвогуле не пакінуць памяці пра сябе. Таму што пасля жыцця чалавека застаецца яго праца. Яго справа. Яго словы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

СВЯТАЯ СПРАВА МІКАЛАЯ КУЦАКОВА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Неаднаразова давялося Мікалаю Міхайлавічу звяртацца ў райвыканкамы да тагачаснага старшыні Васіля Максімёнкі і яго намесніка Пятра Несцяровіча. І тут — поўнае ўзаемаразуменне і дапамога. Бо не толькі ўхвалялі яго планы, але і выдзялілі на кошт раённага трыццаць кубаметраў лесу. А талака мужчын з Палесся нарыхтавала яго і даставіла на транспарце мясцовага КСУПа ў вёску на піларраму гаспадаркі.

Узвядзенне царквы пачалося восенню 2006 года з устанаўлення крыжа і асвячэння месца будаўніцтва, што ў самым цэнтры вёскі, на ўзвышшы. Побач — невялікі сквер, дзе стаіць абеліск і помнік землякам, што загінулі ў часы ваеннага ліхалецця. На адной з мемарыяльных пліт і прозвішча бацькі Мікалая — Міхаіла Яфімавіча.

— Вышыня царквы будзе дзесяць метраў, — расказвае Мікалай Міхайлавіч. — Здалёк будзе відаць храм. Трэба быць годнымі сваіх продкаў, іх мудрасці, духоўнай чысціні. Дзе Царква — там святло ў душах, выратаванне, там — жыццё. Боская і зямная ісціна маюць сваю глыбокую сутнасць, свой спрадвечны сэнс: Царкву, веру ў Бога не могуць знішчыць ні гады, ні абставіны. Я хачу, каб жыхары Палесся, іншых вёсак, на многія часы не па сваёй волі адлучаныя ад богаслужэнняў, наблізіліся да Боскага Святла, запалілі яго ў сваіх душах, сагрэлі ім іншых. Асабліва гэта важна для маладога пакалення, нашай змены. Не люблю гаварыць гучных слоў, але скажу: будаўніцтвам храма я хачу ўнесці свой уклад у духоўнасць, у самыя светлыя памкненні і ўчынкі, у добра сваіх землякоў.

Вось дзеля гэтай высокай мэты і стараецца ўсімі сваімі сіламі і ўменнем капітан першага рангу ў адстаўцы. Кожны дзень, лічы, ён на будоўлі, і нам цікава было даведацца, як гэта ўдаецца яму спасцігаць новыя справы — муляра, сталяра, бетоншчыка? Адкуль такія навыкі з'явіліся ў яго, бо нічым падобным раней яму займацца не даводзілася?

— Дапамагаюць Гасподзь Бог і людзі, — гаворыць Куцакоў. — Як пачынаў работы, нават смешна ўспамінаць цяпер. Закласці падмурак складанасцяў асаблівых не было. Выбралі грунт, уклалі ў траншэю бут, забетанавалі. Трэба толькі, каб вуглы супадалі. І вось дайшла справа да кладкі цэглы. Не ведаючы толкам, у якой прапорцыі з цэменту і пяску рабіць раствор (думаю, будзе лепш, калі цэменту больш, для трываласці), на калькулятары пралічыў даўжыню падмурка і разрывы паміж цаглінамі — і пачынаю кладку. Ды што такое? Апошняя цагліна правісае на тры чвэрці, не супадае з вуглом. Разбурыў я той рад, а мужыкі, праходзячы па вуліцы, кажуць: «Міхаліч, што робіш? Не так трэба. Спачатку выкладзі вуглы, а паміж імі вяровачку нацягні. Гэта ж табе не мора. А калі цагліна не ўлезе недзе, дык ты яе — напалову. А ў растворы прапорцыю змяні таксама». Усё затым пайшло як мае быць. Практыка, вопыт — вялікая справа. Кладу цаглінку за цаглінкай, дык калі сколы ў іх сустракаюцца, зачыстку раблю, або іншым бокам яе пакладу, каб усё было раўнютка. Не спяшаюся. Справа робіцца на стагоддзі.

Пастаянны і надзейны памочнік у Мікалая Міхайлавіча — Леанід Зубараў, які за работу нічога не патрабуе. Ён — інвалід з дзяцінства, Божы чалавек, з добрым сэрцам і светлым настроем. Як толькі Куцакоў пачаў сваю справу ў Палессі, ён прыходзіў да яго і збоку моўчкі назіраў за ім. «Можа хочаш дапамагчы мне? — спытаў аднойчы Мікалай Міхайлавіч. «З ахвотай», — сціпла адказаў ён. То вады для замесу раствору паднясе, то пясок праз сіта прасее, каб каменьчыкі ў яго не траплялі, то цэглу падасць. І гэтак — амаль штодня.

Дапамагае і брат Міхаіл, які жыве ў Барсуках. Асабліва трэба адзначыць поўнае ўзаемаразуменне паміж Куцаковым і старшынямі сельсавета Аляксеем Мельнікавым і ПСУП «Палессе-2003» Валерыем Ільюшанкам. З якім бы пытаннем ён ні звярнуўся да іх — падтрымка гарантаваная.

Наогул жа, многія мясцовыя жыхары не абыходзяць увагай клопаты свайго земляка. Яны пасільна дапамагаюць яму маральна і матэрыяльна. Напрыклад, калі вялікагрузны аўтамабіль даставіў на пляцоўку 20 тон цэглы, вадзіцель яго разлічваў, што цэлыя суткі, а можа і больш, давядзецца яму прастаяць. Але не тут тое было. Сабраўся народ, арганізавалі пад кіраўніцтвам Мікалая Міхайлавіча тры разгрузачныя лініі, і праз тры гадзіны справа была закончана.

Вядома, што ў летні час дарослым вяскоўцам работ розных хапае да самых вушэй. А ў школьнікаў — канікулы. Вось многія з іх падчас кладкі сцен таксама дапамагалі Куцакову. І гэты момант, як дарэчы, і іншыя, Мікалай Міхайлавіч разглядае з надзеяй на тое, што неўзабаве, калі будзе пабудаваны храм і ажывіць наваколле сваім малінавым звонам, дзеці ўвойдуць у яго адчыненыя дзверы, каб узбагаціць сябе спрадвечнымі ісцінамі праваслаўя. А пройдзе час, стануць яны татамі і мамамі і прывядуць сюды ўжо сваіх дзяцей. Ці ж не гэта будзе працягам той духоўнай традыцыі, якая звяжа мінулае і будучае ў адзінае цэлае?

Гармонік

Калі ў 2006 годзе Мікалай Міхайлавіч прыехаў з Масквы на сваю радзіму, жыў ён напачатку ў свайго брата Міхаіла ў Барсуках. А потым старшыня сельсавета Аляксей Мельнікаў параіў яму звярнуцца ў райвыканкам, каб там дазволілі яму перабрацца ў Палессе, бліжэй да месца будоўлі. Кіраўнікі яго пасадзейнічалі ў гэтым, і Куцакоў перасяліўся туды ў будынак былой аптэкі. Ён і Міхаіл адрамантавалі дах, замяніўшы на ім шыфер, навялі парадак у адным з пакояў, які ён заняў. Зручна: гэта побач з новабудоўляй, цераз дарогу.

Пасля працоўнага дня бярэ ён у рукі гармонік. Мікалай Міхайлавіч марыў мець такі музычны інструмент. Але ў сям'і, дзе васьмёра дзяцей, былі на першым плане зусім іншыя патрэбы. А як хлопец зайздросціў сваім сябрам-аднавяскоўцам — Кірылу Куцакову ды Івану Геўрасёву! Яны гралі на гармоніках, а яму давяралі толькі бубен.

Тыя вясковыя вячоркі і святы жывуць у памяці па сёння. І ўсё ж, значна пазней, у сталым ужо ўзросце Мікалай Міхайлавіч ажыццявіў запаветную мару. У Маскве ён пазнаёміўся з лепшымі гарманістамі Расіі, якія паказвалі сваё высокае майстэрства па тэлебачанні ў праграме «Грай, гармонік». Тройчы ездзіў Куцакоў у горад Бор Ніжненаўгародскай вобласці да самага славутага ў краіне прафесіянала Пічугіна, каб той зрабіў яму гармонік. Бачачы такую прагу да музыкі, Барыс Рыгоравіч не вытрымаў, развітаўся з гармонікам, які толькі што змайстраваў для сябе. Побач з упрыгажэннямі спецыяльную пласціну з прозвішчам новага ўладальніка прымацаваў.

Мікалай Міхайлавіч бярэ ў рукі гармонік, і праз адчыненыя дзверы па сухапутным Палессі паплылі меладычныя і чароўныя гукі вальса «Амурскія хвалі». Заўважаем форменны кіцель марскога афіцэра з пагонамі і ордэнскімі планкамі, што вісіць на сцяне як напамінак Куцакову аб яго доўгай службе, і просім Мікалая Міхайлавіча прымераць яго. Ды і яму самому гэта цікава: ці змянілася што ў яго фігуры за тыя пятнаццаць гадоў, калі ён пайшоў на заслужаны адпачынак? Нічога падобнага: цюцелька ў цюцельку. Кіцель нібы пашыты на яго па сённяшніх мерках.

І тут мы прыгадваем размову з намеснікам старшыні Чачэрскага райвыканкама Пятром Несцяровічам, які сказаў пра яшчэ адно хобі Куцакова: ён — добры фізкультурнік, майстар спорту па гарадках, і ў раёне зацікаўленыя ў тым, каб ён патрэніраваў мясцовую каманду. Ці так гэта, пытаемся ў Мікалая Міхайлавіча. Так, адказвае ён. Спортам займаўся сур'ёзна яшчэ ў школе. У час вайсковай службы на ўзроўні кандыдата ў майстры спорту па самба неаднаразова выходзіў на татамі. Быў першым нумарам каманды Ленінградскага гарнізона па гарадошным спорце, а ў 50-гадовым узросце ўдзельнічаў у лыжным марафоне (60 кіламетраў) «Лыжня Расіі». Што датычыцца дапамогі мясцовым спартсменам, то ён не супраць паказаць ім майстар-клас.

Жывая вада

Нядаўна Мікалай Міхайлавіч набыў у асабістую ўласнасць пусты цагляны дом, які Людміла Віктараўна даводзіць да ладу. «Для пастаяннага жыхарства?» — пытаем у Куцаковых. І яны апавядаюць, што час усё расставіць на свае месцы, што Бог падкажа, дапаможа разабрацца, што да чаго. Так было ўжо не аднойчы, сцвярджае Мікалай Міхайлавіч. Вось толькі адзін момант.

Калі ў 1934 годзе закрылі храм, то абразы і ўсе царкоўныя рэчы былі пагружаныя на калёсы і спаленыя на скрыжаванні дарогі на Асінаўку, як расказвалі старажылы. Там цэлымі дзесяцігоддзямі не расла трава, пакуль зямлю не ўзаралі трактарам. Людзі думалі, што ўсё ўжо было знішчана. Але... Калі са сцен царквы здзіраліся тыя рэчы, некаму ўдалося забраць з сабой напрастольны крыж, з якім рабіў богаслужэнні айцец Васілій. Ён быў знойдзены ў 1972 годзе жанчынай-верніцай, у якой муж быў камуністам. Яна нічога яму аб гэтым не сказала, а калі рыхтавалася да смерці, адпісала свой дом блізкаму сваяку Леаніду Зубараву, памочніку Куцакова. Ён перадаў яго па яе просьбе другой сваёй цёткі, а тая — пляменніцы ў Буда-Кашалёўскі раён.

Пра ўсё гэта Леанід і расказаў Мікалаю Міхайлавічу, які толькі і марыў аб тым, каб у адроджанай царкве з'явілася якая-небудзь рэч (хай сабе кавалак дрэва ці што іншае) з ранейшага храма, якая б духоўна звязала былыя часы з сённяшнімі. Ён адшукаў тую жанчыну, і яна паабяцала прывезці напрастольны крыж праз месяц. Ішлі тыдні, а крыжа ўсё не было. І вось, калі Куцакоў паклаў апошнюю цагліну на крыжы алтара, і з'явілася тая жанчына. У той жа самы дзень. Супадзенне? А гэта — як паглядзець. Напрастольны крыж, гаворыць Мікалай Міхайлавіч, зойме сваё пачэснае месца. На алтары, дзе прысутнічае Гасподзь Бог.

І яшчэ пра адно хацелася б расказаць. Недалёка (метраў за 250—300) ад узводзімага храма ў лагчыне знаходзіцца крыніца. У ёй б'е ажно дзевяць ключоў. Называецца яна панскай, бо ў далёкія часы ёй не дазвалялася карыстацца простаму люду. Б'юць ключы не адну сотню гадоў. З яе бралі і бяруць ваду жыхары і цяпер. А была яна неўпарадкаваная. І вось сёлетняй вясной Мікалай Міхайлавіч зрабіў новы зруб, дах над ім, падсыпаў вакол шчэбеню, паставіў драўляны крыж. А 7 красавіка, на дзень Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы, крыніцу асвяціў благачынны Чачэрска-Веткаўскай акругі, настаяцель храма Праабражэння Гасподня протаіерэй Георгій. Жывая пульсуе вада ў крыніцы — жывыя, святыя справы Мікалая Міхайлавіча Куцакова. Узвышанае і зямное. Зямное і ўзвышанае...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ, Міхаіл БОЛСУН.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«3» ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный аукцион

по продаже объектов коммунальной собственности Узденского района, принадлежащих на праве хозяйственного ведения районному унитарному предприятию «Узденское ЖКХ», и права заключения договора аренды земельного участка необходимого для их обслуживания

На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:

Проходную завода (инв. № 623/С-7648), общей площадью 22,1 кв.м; склад (инв. № 623/С-7678), общей площадью 232,6 кв.м; склад (инв. № 623/С-7680), общей площадью 234,4 кв.м; котельную (инв. № 623/С-7677) с дымовой трубой, общей площадью 306,4 кв.м; модуль «Орск» (инв. № 623/С-7

ОАО «Белаттракцион» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)

ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже зданий и иного имущества, расположенного на ул. Могилевской, 68 в г. Минске, единым лотом (лот № 1).

В состав лота № 1 входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование имущества		Кол-во шт/кг
1.	01010546	Административное здание (инв. № 500/С-4099) общ. пл. 304,8 кв.м	1
2.	01010547	Котельная (вспом. здание, инв. № 500/С-22741) общ. пл. 69 кв. м	1
3.	000328	Асфальтобетонное покрытие	1
4.	01102105	Ограждение территории	1
5.	000466	Котел SLIM 1.150 I 3E BAXI IT/ES	1
6.	000467	Котел SLIM 1.150 I 3E BAXI IT/ES	1
7.	01310286	Кондиционер БК1500 с устр УМ 1500	1
8.	000093	Холодильник «Минск 16ЕС»	1
9.	01380459	Холодильник «Чинар» КШ 240	1
10.	000164	Витрина стеклянная	1
11.	000165	Витрина стеклянная	1
12.	000101	Панно цветовое	1
13.	000301	Стул для кафе	1
14.	000303	Стул для кафе	1
15.	000304	Стул для кафе	1
16.	ТМЦ	Колесо рулетки б/у	3
17.		Электродвигатель 1.5к/Вт б/у	2
18.		Тиски	1
19.		Припой	33,0
20.		Канифоль	34,0
21.		Болты	73,5
22.		Винты 8*51	105,0
23.		Граверы (винты)	288,5
24.		Гайки	18,0
25.		Шурупы 6-31	30,3
26.		Ткань декоративная (сукно)	22,0
27.		Ткань с рисунком (сукно)	1
28.		Ткань Американской рулетки (сукно)	7
29.		Замок Б362	478
30.		Печь СВЧ (Вежа)	1
31.		Манометр 100 0-0,6 Мпа	1
32.		Шкаф железный для Паротрупера	1
33.		Огнетушитель ОУ-5	10
34.		Огнетушитель ОУ-5	1
35.		Стеллаж металлический	1
36.		Урна формы «Пингвин»	12
37.		Шкаф металлический	2
38.		Шкаф металлический	1
39.		Набор компьютерных колонок	1
40.		Кресло «Дарвяное/Экстра люкс»	1
41.		Лестница высотная	1
42.		Огнетушитель	2
43.		Огнетушитель 01.05.2000.	1
44.		Огнетушитель ОУ-2 (3л)	1
45.		Огнетушитель ОВ-2	1
46.		Полка навесная	9
47.		Сейф	5
48.		Сейф	1
49.		Сейф бытовой	1
50.		Сейф засыпной 01.05.2002	1
51.		Сейф насыпной 01.08.1999	1
52.		Сканер А4 01.08.2003	1
53.		Стол	1
54.		Стол 1-тумбов.	15
55.		Стол 2-тумбов. 8.99	2
56.		Стол офисный (приемн.) 12.03	1
57.		Стул «Престиж» (приемн.) 11.99	1
58.		Стул ИЗО (серые) 9.04	9
59.		Стул п/м (дерев.) 01.02	15
60.		Шкаф с антрессолью (книжный)	7
61.		Шкаф	9
62.		Шкаф каталожный ШК-26	8
63.		Принтер лазерн. Samsung ML1521	1
64.		Монитор17 Samsung Samtron 76BDF	1
65.		Кабель КГ 3*2,5+1*1,5 РФ	50
66.		Кабель КГ 2,6	20
67.		Провод ПВС 2*.76	12
68.		Кабель ТПП (тел. многожильный)	75

Земельный участок площадью 0,1733 га с кадастровым номером 500000000004000641 предоставлен во временное пользование на срок до 31.07.2010 включительно для эксплуатации административного и вспомогательного зданий.

Начальная цена лота снижена и составляет 939 275 420 белорусских рублей без учета НДС.

Условие аукциона – сохранение за ОАО «Белаттракцион» права безвозмездного пользования кабинетом № 13 общей площадью 26,5 кв. м в административно-хозяйственном здании (инв. № 500/С-4099) и помещением архива общей площадью 10,9 кв. м во вспомогательном здании (инв. № 500/С-22741) на срок до окончания работы ликвидационной комиссии ОАО «Белаттракцион» (ориентировочный срок окончания работы ликвидационной комиссии – 01.01.2009).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка и платы за участие в аукционе в размере 4 базовых величин; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 90 000 000 белорусских рублей и плата за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 15 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **11 ноября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **10 ноября 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 227 48 36, (017) 227 40 22 –

УП «Минский городской центр недвижимости»;

(017) 222 73 14 – ОАО «Белаттракцион»

Интернет: www.mgcn.by

УНП 190398583

«КРАПАВАЕ БРАЦТВА» ПАПОЎНІЛАСЯ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У чацвер, 23 кастрычніка, ва ўнутраных войсках МУС Беларусі скончыўся апошні этап кваліфікацыйных іспытаў на права нашэння Крапавага берэта. У гэты раз паспаборнічаць за сімвал мужнасці вырашылі больш за 50 ваеннаслужачых, сярод якіх — курсанты факультэта ўнутраных войскаў, ваеннаслужачыя вайсковых часцей, ваеннаслужачыя брыгады спецыяльнага прызначэння, прадстаўнікі Дэпартамента выканання пакаранняў, супрацоўнікі палкоў патрульна-паставой службы міліцыі і міліцыі спецыяльнага прызначэння, спецыяльных ротаў хуткага рэагавання органаў унутраных спраў. Прэтэндэнты дэманстравалі тэхніку рукапашнага бою, прайшлі пятнаццацікіламетровы марш-кідок, які быў ускладнены дадатковымі заданнямі (адціснуцца, перапаўзці, перанесці раненага). Самым складаным стаў апошні этап: на шляху — багна, калючы дрот, бар'еры, драўляныя сцены, штурмавая паласа, канатная пераправа. Пасля васьмі кіламетраў перашкодаў усіх, хто дайшоў да фінішу, чакаў апошні іспыт — трэба было вытрымаць дванаццацихвілінны спарынг з адным з прэтэндэнтаў і трыма ўладальнікамі Крапавых берэтаў. У выніку ўсе іспыты вытрымалі шаснаццаць байцоў. Усяго ж у Беларусі больш за 600 уладальнікаў Крапавых берэтаў.

Спорт-тайм

ТРЭЦІ ТУР ПАРАДАВАЎ БУЙНЫМІ ПЕРАМОГАМІ

Адбыліся ўсе матчы трэцяга тура групавога раўнда Лігі чэмпіёнаў. У адрозненне ад буйных лікаў, якія былі зафіксаваны ў аўторак, серада прынесла менш эфектыўны футбол. Група А: «Бардо» (Францыя) — ЧФР (Румынія) — 1:0, «Чэлсі» (Англія) — «Рома» (Італія) — 1:0; Група В: «Інтэр» (Італія) — «Анартосіс» (Кіпр) — 1:0, «Панацінайкас» (Грэцыя) — «Вердэр» (Германія) — 2:2; Група С: «Шахцёр» (Украіна) — «Спортынг» (Партугалія) — 0:1, «Базэль» (Швейцарыя) — «Барселона» (Іспанія) — 0:5; Група D: «Атлетыка» (Іспанія) — «Ліверпуль» (Англія) — 1:1, ПСВ (Галандыя) — «Марсэль» (Францыя) — 2:0; Група Е: «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — «Селтык» (Шатландыя) — 3:0, «Вільярэал» (Іспанія) — «Ольбарг» (Данія) — 6:3; Група F: «Баварыя» (Германія) — «Фіярэнціна» (Італія) — 3:0, «Сцяўа» (Румынія) — «Ліён» (Францыя) — 3:5; Група G: «Фенербахча» (Турцыя) — «Арсенал» (Англія) — 2:5, «Порту» (Партугалія) — «Дынама» (Кіеў) — 0:1; Група Н: «Зеніт» (Расія) — БАТЭ (Беларусь) — 1:1, «Ювентус» (Італія) — «Рэал» (Іспанія) — 2:1.

ГРУПАВЫ РАЎНД КУБКА УЕФА СТАРТАВАЎ

23 кастрычніка адбыліся матчы першага тура групавога раўнда Кубка УЕФА. ЦСКА пачаў з буйной перамогі над «Дэпартыва». «Севілья» абыграла «Штатгарт», а «Удзінэзе» — «Тотэнхэм». Вось вынікі матчаў. Група А: «Шальке-04» (Германія) — ПСЖ (Францыя) — 3:1, «Твентэ» (Галандыя) — «Расінг» (Іспанія) — 1:0; Група В: «Галатасарай» (Турцыя) — «Алімпіякас» (Грэцыя) — 1:0, «Герта» (Германія) — «Бенфіка» (Партугалія) — 1:1; Група С: «Севілья» (Іспанія) — «Штутгарт» (Германія) — 2:0, «Партызан» (Сербія) — «Сампдорыя» (Італія) — 1:2; Група D: «Удзінэзе» (Італія) — «Тотэнхэм» (Англія) — 2:0, «Дынама» (Загрэб, Харватыя) — НЕК (Галандыя) — 3:2; Група Е: «Херэнвен» (Галандыя) — «Мілан» (Італія) — 1:3, «Брага» (Партугалія) — «Портсмут» (Англія) — 3:0; Група F: «Жыліна» (Славакія) — «Гамбург» (Германія) — 1:2, «Астан Віла» (Англія) — «Аякс» (Галандыя) — 2:1; Група G: «Капенгаген» (Данія) — «Сент-Эцьен» (Францыя) — 1:3, «Русенборг» (Нарвегія) — «Бруге» (Бельгія) — 0:0; Група Н: ЦСКА (Расія) — «Дэпартыва» (Іспанія) — 3:0, «Нансі» (Францыя) — «Фейернорд» (Галандыя) — 3:0.

«ДЫНАМА» НАРЭШЦЕ ВЫЙГРАЛА

Мінскае «Дынама» перарвала серыю з дзевяці паражэнняў запар і пакінула апошні радок турнірнай табліцы чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі. Гэта стала магчымым дзякуючы гасцявой перамозе над васкрасенскім «Хімікам» — 3:1. Такім чынам, у дывізіёне Усевалада Баброва «бела-блакітныя» па-ранейшаму займаюць апошняе, шостае месца, набраўшы 14 ачкоў у 20 матчах. Аднак у агульнай табліцы рэгулярнага першынства сталічны клуб перамясціўся з 24-га на 23-і радок. Наступны паядынак беларусы правядуць 28 кастрычніка. Дома яны памераюцца сіламі з казанскім «Ак Барсам».

ФІНАЛЬНЫЯ ТУРЫ — У 14 ГАДЗІН

Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола» прыняла рашэнне, што ўсе матчы 29-га і 30-га тураў чэмпіянату краіны ў вышэйшай лізе пачнуцца ў адзін і той жа час. Такім чынам, 9 і 16 лістапада каманды будуць сустракацца ў 14 гадзін.

БЭКХЭМ У «МІЛАНЕ»?

Англійскі паўабаронца Дэвід Бэкхэм, які выступае ў амерыканскай лізе MLS за «Лос-Анджэлес Гэлэксі», у студзені можа стаць гульцом «Мілана». Віцэ-прэзідэнт «Мілана» Адрыяна Галіяні заявіў, што клуб збіраецца ўзяць футбаліста ў арэнду. «Так, мы думаем пра гэта і вядзём перамовы з яго агентам. Спадзяюся, зможам узяць яго ў арэнду. У пачатку студзеня ён прыляціць у Мілан. Тады мы і плануем заключыць кантракт. Дэвід зацікаўлены ў тым, каб выступаць за наш клуб».

ІНФАРМБЮРО

Грыбамі сталі труціцца болей

Дзіўна, але ў XXI стагоддзі, суайчыннікі не стамляюцца дэманстраваць узоры сярэднявечнай цемры. А як яшчэ растлумачыць хваробу 35-гадовага брастаўчаніна, які трапіў у рэанімацыю абласной бальніцы з дыягназам «атручэнне грыбамі»? Ён ужываў у ежу так званыя польскія грыбы ў сырым выглядзе. Калі медыкі спыталі ў пацыента, навошта так рабіў, чалавек сказаў, што заўсёды так еў. Маладыя, «мякка кажучы», экстрэмалы ўзялі за моду есці мухаморы і яшчэ горшую брыдоту пад назвай псілацыбе, каб атрымаць прывідны кайф. Адным словам, з пачатку сезона і да 20 кастрычніка на Брэстчыне атруціліся сырымі і прыгатаванымі грыбамі 27 чалавек. На шчасце, абышлося без лятальных вынікаў. Але медыкі так занепакоіліся сітуацыяй, што склікалі ў абласным цэнтры гігіены і эпідэміялогіі спецыяльную прэс-канферэнцыю.

Спецыялісты звярнулі ўвагу на тое, што сёлета зафіксаваны выпадкі атручэння нават звычайнымі грыбамі, такімі, як лісічкі і белыя. Адбылося не атручэнне ўласна ядамі, а хранічныя захворванні абвастрыліся да крайняй ступені, іх справакавала ўжыванне цяжкай грыбной ежы. Урачы падкрэслівалі, што засвоіць грыбы можа арганізм здаровага чалавека, а вось дзецям, старым, людзям з хранічнымі захворваннямі грыбы лепей не ўжываць зусім. Супрацьпаказаны гэтыя дары лесу цяжарным і тым жанчынам, якія кормяць дзяцей.

Урачы-практыкі прасілі зноў і зноў напамінаць чытачам, як небяспечна збіраць незнаёмыя грыбы. Летась ад бледнай паганкі ў вобласці памерла два чалавекі, а гадоў дзесяць таму каварны грыб загубіў усю сям'ю, якая прыехала сюды на адпачынак з Казахстана.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк страхового полиса обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серия АЖ № 1663037 считать недействительным.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЗ РЭЦЭПТА

Гронкі здароўя



Напэўна, гэта адны з самых смачных лекаў на свеце. Карысныя ўласцівасці вінаграду былі вядомыя са старажытных часоў.

Ад якіх толькі хваробаў не лечаць салодкія сакавітыя ягады! Сярэдневяковыя медыкі лячылі імі ангіну, кашаль, паніжалі жар. Земскія лекары лячылі вінаградам усё: ад пухлін да меланхоліі, а лісце прыкладвалі да ран, каб хутчэй загойваліся.

Калі вы вярнуліся з работы стомленымі, з'ешце некалькі ягад вінаграду. Неўзабаве адчуеце прыліў сіл. Глюкоза, фруктоза, цукроза, якіх так многа ў вінаградзе, падобна матчынаму малаку і мёду, адразу паступаюць у кроў і хутка засвойваюцца арганізмам. Эфект узмацняюць мінеральныя солі і мікраэлементы, а таксама вітаміны — аскарбінавая кіслата, В, В3, Р. У вас гіпертанія? І тут дапаможа вінаград. Ён нармалізуе рытм сэрца і артэрыяльны ціск. Есці яго лепш праз 1,5—2 гадзіны пасля яды (ці да). У дзень можна з'ядаць не больш, чым 2 кг, а соку выпіваць — 1,2 л. Не спалучайце вінаград з тлустымі і салёнымі стравамі, кефірам, малаком, алкаголем, вадой з газам. Магчыма расстройства страўніка. Пакутуеце ад запораў? Паспрабуйце палячыцца вінаградным сокам. Піце яго ў тры прыёмы: нашча, за дзве гадзіны да абеду і праз тры гадзіны пасля абеду, пачынаючы з 3 мл на 1 кг вагі цела. Паступова штодзённая норма соку павінна складаць 200—600 мл, але не больш. Вінаград — гэта эфектыўны слабіцельны і мачагонны сродак. Ён перашкаджае ўтварэнню камянёў у нырках, жоўцевым пузыры, хутка знімае ацёкі. Не можаце справіцца з бранхітам? Зноў жа дапаможа вінаградны сок. Хочаце нармалізаваць абмен рэчываў? Ешце разынкі. Заліце іх вінаградным воцатам (4:1), настойвайце тыдзень, а затым піце па 1 ч. лыжцы тройчы на дзень праз паўгадзіны пасля яды.

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

Лячыце зубы

Часта мы нават і не падазраём, што прычынай сур'ёзнага захворвання якога-небудзь унутранага органа можа аказацца... хворы зуб. Аднак урачэбная практыка раз-пораз пацвярджае гэта.

Вучоныя з Германіі налічылі каля 80 захворванняў, у аснове якіх ляжыць ачаг інфекцыі, размешчаны ў зубах ці дзясnах. Сярод іх сардэчна-сасудзістыя парушэнні, рэўматызм, хваробы органаў стравання, нырак, вачэй, вушэй, скуры, эндакрынных залоз і нават нервовыя расстройствы. Ачаг інфекцыі ў роце не толькі іграе ролю пускавога механізму для многіх захворванняў, але і абцяжарвае іх цячэнне. Так, у 98 працэнтаў язвеннікаў, як правіла, выяўляецца парадантоз. Мікробы, якія кішаць у хворым зубе, выдзяляюць таксіны, што ўзбуджаюць зубны нерв і праз яго парушаюць работу іншых органаў. Таму не варта цягнуць з лячэннем нават маленькай дзірачкі ў зубе. Не дарэмна медыкі Старажытнага Усходу казалі, што зуб — гэта свяцільня, страта якой набліжае да цемры.

◆◆◆

Стрэс з найменшымі стратамі

Націскаючы на кропку ў самай сярэдзіне далоні, можна паменшыць нервовае напружанне і палегчыць вынікі стрэсу. Калі вы схільныя нерваваць па розных прычынах, вазьміце за правіла масіраваць не толькі цэнтр далоні, але і аснову вялікага пальца. Гэта не толькі зніме напружанне, але і спазмы рознага паходжання.

-2536-

УЛАСНЫ ВОПЫТ

Вырашаем любую праблему

Застарэлыя плямы ад садавіны можна выдаліць, калі патрымаць забруджаную рэч у растворы лімоннай кіслаты (2 г на шклянку вады), а потым прапаласкаць халаднаватай вадой пад кранам.

◆◆◆

Скрыўленыя вязальныя пластмасавыя пруткі лёгка выпраміць наступным чынам: апусціце іх у кіпень, праз некалькі секундаў дастаньце і патрымайце ў халоднай вадзе.

◆◆◆

Пацёртасці на лакіраванай сумачцы стануць незаўважнымі, калі працерці яе ватным тампонам з рыцынай. Пасля чаго сумку вытрыце сухой анучкай.

◆◆◆

Туфлі з натуральнай скуры карычневага колеру выдатна выглядаюць пасля чысткі кафейнай гушчай.

◆◆◆

Калі стары дзіцячы гумавы мячык разрэзаць напалам і ў цэнтры сферы зрабіць адтуліны для садовых нажніц, атрымаецца надзейны шчыт, які засцеражэ вашы рукі пры абразанні калючых раслін.

Хітрае рашэнне

Вакол вешалак і кручкоў шпалеры затлушчваюцца і драпаюцца хутчэй. Каб гэтага не адбывалася, з кавалачкаў самаклейнай плёнкі (яна можа кантраставаць са шпалерамі, але не парушаць агульнага колеравага рашэння пакоя) выражце кружкі (ці іншыя фігуры) і наклейце іх вакол вешалак. Атрымаецца прыгожа і функцыянальна.

ІДЭІ МАЙСТРУ

А што па паліцы?

Нават калі ў вашай кватэры шмат мэблі, усё роўна заўсёды не хапае маленькай палічкі.

Чаму б яе не паставіць у гэты пусты куток — для кветак? Ці не павесіць на сцяну?

Палічкі могуць быць самых розных формаў, і зрабіць іх зусім не складана. Для абутку, посуду, сувеніраў, кніг...



-2537-

Фонд «Минскоблгосимущество» 27 ноября 2008 года: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион

по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для их обслуживания, составляющих предметы аукциона

На аукционные торги выставляются:

№ лота/ время проведения	Наименование недвижимого имущества	Характеристика недвижимого имущества	Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка для участия в аукционе, рублей	Продавец недвижимого имущества
1 / **11.00**	Административное здание (инв. № 610/С-96), расположенное в г. Борисове Минской области, ул. Минская, 21	Здание одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, частично обложенные кирпичом, перегородки дощатые оштукатуренные, крыша шиферная, полы дощатые линолеум, вентиляция – естественная, имеются инженерные коммуникации, 1935 года постройки, 1962 года постройки подвал и пристройка, в 1991 году произведен капитальный ремонт. Общая площадь 480,2 кв.м	Площадь 0,1616 га. Срок аренды земельного участка 25 лет. Арендодатель: Борисовский райисполком Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с водоохраной зоной р. Березина	**106 413 848** (в том числе недвижимое имущество — 66 145 870, право заключения договора аренды земельного участка 40 267 978)	8 000 000	Государственное производственно-торговое объединение «Белхудожпромыслы, г. Минск, ул. Захарова, 36 тел. (017) 294 80 88
2 / **11.00**	Склад (инв. № 610/С-354), расположенный в г. Борисове Минской области, ул. Минская, 21	Здание одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная двухскатная, вентиляция – естественная, инженерные коммуникации отсутствуют, 1962 года постройки. Общая площадь 34,6 кв.м	Площадь 0,0620 га. Срок аренды земельного участка 25 лет. Арендодатель: Борисовский райисполком Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с водоохраной зоной р. Березина	**16 413 067** (в том числе недвижимое имущество — 963 719, право заключения договора аренды земельного участка 15 449 348)	1 000 000	Государственное производственно-торговое объединение «Белхудожпромыслы, г. Минск, ул. Захарова, 36 тел. (017) 294 80 88
3 / **11.00**	Капитальное строение (диспетчерский пункт со стоянкой) (инв. № 610/С-7654), расположенное в г. Борисове Минской области, ул. Чапаева, 78	Здание двухэтажное 1995 года постройки, фундамент бетонный, стены и перегородки панельные, перекрытия железобетонные, крыша совмещенная, полы бетонные, линолеум, имеется электроснабжение. Площадь 60 кв.м. Стоянка автомобилей 13 701 кв.м, грунтовое покрытие. Территория ограждена железобетонным забором	Площадь 1,3980 га. Срок аренды земельного участка 25 лет. Имеется ограничение в использовании 0,0197 га — охранная зона магистральных трубопроводов (теплофикации). Арендодатель: Борисовский райисполком	**265 282 496** (в том числе недвижимое имущество — 71 430 579, право заключения договора аренды земельного участка 193 851 917)	15 000 000	Дочернее унитарное предприятие «Грузовой автомобильный парк № 1» РУП «Миноблавтотранс», г. Борисов, ул. Чапаева, 78, тел. (0177) 76 40 67, 76 40 60
4 / **14.30**	Здание пожарного депо отдельного поста (инв. № 644/С-37927), расположенное в дер. Краснодворцы Солигорского района Минской области	Здание одноэтажное 1981 года постройки, фундамент - сборные железобетонные блоки, перегородки кирпичные, дощатые, перекрытия — железобетонные плиты, крыша совмещенная. Имеются инженерные коммуникации. Общая площадь 298 кв.м	Площадь 0,0781 га. Срок аренды земельного участка 20 лет. Арендодатель: Солигорский райисполком	**28 632 158** (в том числе недвижимое имущество — 27 286 808 право заключения договора аренды земельного участка 1 345 350)	2 500 000	Учреждение «Минское областное управление Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь», г. Минск, ул. Нестерова, 9а, тел. 243 25 11, 242 82 70

Земельные участки отведены ля обслуживания и эксплуатации недвижимого имущества.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН: 1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Борисовским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка. Оплата по пунктам 1, 2 и за объекты должна быть произведена до 31 декабря 2008 года.

Порядок проведения аукциона определен с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи 25 ноября 2008 г. до 17.00.

Гэта іх рукі надаюць зефіру сапраўдны смак: Ніна РЭКІШ, Вольга СОНДАК, Раіса ШЛЯЧЫНА, Наталля ЕРАШОНАК.

З дзяцінства цягнецца рука да смакаты з "Харчавіка"

Перш, чым непасрэдна пачаць размову пра вытворчасць кандытарскіх вырабаў на бабруйскім ААТ «Чырвоны харчавік», звернем увагу на два паведамленні з сеткі Internet.

«Санітарныя ўрачы шукаюць на прылаўках Свярдлоўскай вобласці патэнцыйна небяспечныя прадукты... У дзіцячым харчаванні, малацэ, цукерках, шакаладзе з Паднябеснай было вызначана ўтрыманне меламіну. Гэта ядавітае хімічнае рэчыва стала прычынай узнікнення розных захворванняў больш чым у 53 тысяч дзяцей Кітая. Чацвёра малых памерлі.

У чатырох гандлёвых пунктах Заўралля знойдзены кітайскі заменнік сухога малака. 245 кілаграмаў «Sunny Milky» зняты з рэалізацыі. На Паўднёвым Урале на 13 прадпрыемствах гандлю выяўлены кітайскія цукеркі, печыва, зефір, кексы і мармелад. Спынены продаж 453 кілаграмаў кандытарскіх вырабаў. Таксама зняты з продажу 3,5 тоны «Sunny Milky» і 89 кілаграмаў «Залатой даліны» *(regions.ru/news 14.10.2008)*.

Наступнае паведамленне больш даўняе, але ад гэтага не менш цікавае.

«У прадпрымальніка з прыморскага гарадка ў Перу ўзнікла бліскучая ідэя пачаць на сваёй фабрыцы выраб мармеладу і печыва з водарасцяў. З сыравінай праблем не было. Высновы японскіх акеанолагаў, зробленыя на падставе шматгадовых эксперыментаў былі такімі: прадукцыя папярэджвае развіццё ракавых клетак, нармалізуе ўзровень халестэролу, танізуе сардэчную дзейнасць і, як кажуць, пераўзыходзіць па сваіх паказчыках віагру. Нездарма цуда-печыва і цуда-мармелад у асноўным раскупляюцца пакупнікамі-мужчынамі» *(tiwy.com 15.11.2003)*.

У гэтых двух паведамленнях — дыяпазон уплыву на арганізм чалавека сціплых, адносна танных кандытарскіх вырабаў, якія сёння мы можам сустрэць на паліцах крамаў. Будзем лічыць што беларускія санітарныя ўрачы не дапусцяць з'яўлення ў краіне прысмакаў з меламінам ці іншай атрутай. Але ці не лепш усё ж есці сваё і быць спакойным за дзяцей і мужчын? Тым больш, што экспансія замежных кандытарскіх вырабаў працягваецца. Калі ў 2007 годзе на наш рынак было ўвезена мармеладу, пасцілы, зефіру больш за 600 тон, то ў гэтым годзе ўжо больш за 1000! Няма сумнення, што сёлета будзе пераўзыдзена і агульная мінулагодняя лічба ўвезеных кандытарскіх вырабаў у 15 000 тон.

У гэтых умовах прадукцыя бабруйскага ААТ «Чырвоны харчавік» набывае выключную значнасць. Яна дазваляе супрацьстаяць замежнай навале і забяспечвае пакупніку магчымасць выбару.

Гісторыя гэтага прадпрыемства бярэ пачатак з канца XIX стагоддзя, аднак выразным вытворцам кандытарскіх вырабаў фабрыка стала толькі пры савецкай уладзе. З 1924 года дзеці пралетарыяў і сялян пачалі атрымліваць ад яе спачатку халву, потым карамель. Сучасны «Чырвоны харчавік» вырабляе 120 найменняў найсмачнейшай прадукцыі — халвы, зефіру, мармеладу, цукерак. Апошніх пяць гадоў яго ўзначальвае Мікалай Піліпавіч Чыслоў. Мікалай Піліпавіч — невыпадковы чалавек, родам ён з недалёкай ад Бабруйска вёскі Новае Вялічкава, прыйшоў на фабрыку ў 1979 годзе пасля завочнага заканчэння Магілёўскага тэхналагічнага інстытута. Да гэтага за плячамі была вучоба ў Бабруйскім механіка-тэхналагічным тэхнікуме, служба ў войску, праца на шынным камбінаце. Абранне ім прафесіі механіка машын для харчовай прамысловасці адбылося свядома. Нават дыпломны праект у інстытуце Мікалай Піліпавіч абараняў па тэме непасрэдна звязанай з вытворчасцю. Прыйшоўшы на «Чырвоны харчавік» ён доўгі час працаваў тут галоўным механікам, галоўным інжынерам, машыны і працэсы ведае да тонкасцяў. Менавіта з яго імем звязаны эканамічныя дасягненні прадпрыемства апошніх гадоў — стабільная праца калектыву пры пастаянным росце вытворчасці і збыце гатовай прадукцыі. Адзначым пры гэтым, што прадукцыя гэта спецыфічная, яна мае абмежаваны тэрмін захоўвання і не ўваходзіць у кошык пражыткавага мінімуму. А гэта значыць, што калі маецца рост яе продажу, то людзі сапраўды маюць у ёй патрэбу і галасуюць за якасць рублём.

— За дзевяць месяцаў гэтага года пры плане росту вытворчасці ў 110 працэнтаў намі дасягнуты паказчык — 112,7 працэнта, ёсць падставы меркаваць, што будуць пераўзыдзены і гадавыя паказчыкі, — кажа Мікалай Піліпавіч. — Наша прадукцыя на айчынным рынку даўно заняла тое месца, якое ёй належыць па праву. Гандлёвая марка (брэнд) «Чырвонага харчавіка» стала беларускай нацыянальнай прыкметай і паспяхова прадстаўляе нашу краіну за мяжой. Расійскі спажывец даўно цэніць нашу марку. Тры гады таму мы перажылі цяжкасці ў сувязі са зменнем парадку налічэння ПДВ у разліках з Расіяй, аднак сёння пастаўляем у гэту краіну каля 4,5 тыс. тон зефіру і мармеладу. Нядаўна нам удалося дамовіцца наконт яе пастаўкі ў некаторыя гандлёвыя сеткі Санкт-Пецярбурга і Масквы, і мы з упэўненасцю глядзім на гэты рынак.

— Відавочна, падставы для аптымізму хаваюцца ў тэхналогіях і сыравіне?

— Так. У першую чаргу. Нашы тэхналогіі маюць свае сакрэты. На самых адказных працэсах працуюць сапраўдныя майстры справы. Ніякімі рэцэптамі ці інструкцыямі іх вопыт не замяніць. Пакупнікі з далёкага замежжа патрабуюць, каб мы пастаўлялі свой зефір і мармелад такімі, якімі яны былі трыццаць, а то і пяцьдзесят гадоў таму. І мы з гэтым паспяхова спраўляемся.

— Выходзіць, на прадукцыі «Чырвонага харчавіка» ў Еўропе фарміруецца паняцце сапраўднага смаку?

— Менавіта так. У Ізраілі жыве вялікая колькасць ураджэнцаў з былога Саюза і з Бабруйска ў прыватнасці. Спажыванне нашага зефіру з нязменнай кардоннай каробкі «Ружа» выклікае ў іх настальгічны ўспамін, гонар за родны горад і Беларусь. Мы ўлічваем гэта і імкнёмся дагадзіць густу. Як вынік — пастаўкі прадукцыі ў гэту краіну даволі значныя.

Пастаўляем мы свае вырабы і ў Злучаныя Штаты, Германію, Украіну, Малдову, Латвію (нягледзячы на тое, што ў гэтай краіне маецца свой гігант кандытарскай вытворчасці — фірма «Лайма»). У параўнанні з мінулым годам экспарт нашай прадукцыі ўзрос на 130 працэнтаў.

Дзякуючы пашырэнню фірменнага гандлю за апошнія гады змянілася карціна і на ўнутраным рынку. У Мінску мы адкрылі свой фірменны магазін у гандлёвым цэнтры «Globo» па вул. Уманскай, 54. Калі ў мінулым годзе мы пастаўлялі ў гандлёвую сетку штомесяц каля 900 тон прадукцыі, то цяпер ужо каля 1200 тон. І гэта пры тым, што ў гандлі нашы зефір, халву ці мармелад у большай частцы фасуюцца і прадаюцца без спасылкі на вытворцу. Пакуль гандаль супраціўляецца беларускай прадукцыі, спажывец самастойна вызначыў нам годнае месца.

У цэху № 2 на патоку мармелад, які любяць і дарослыя, і дзеці. Начальнік цэха № 2 Вера ПЯТРОВА і механік цэха Аляксандр ЦЮЛЬКІН.

Вадзіцель электрапагрузчыка Марына СЕЛІВЕРСТАВА.

Наш эканамічны поспех мог бы быць яшчэ большым, калі б была магчымасць самім вызначаць цану на свае вырабы. Крыўдна, што гандаль увозіць дарагое і не вельмі якаснае ў той час, як выдатныя беларускія харчовыя прадукты вырабляюцца ў Беразе Гомельскай вобласці. Магутнасцяў гэтых прадпрыемстваў не хапае, ды і цэны на айчынную крухмальную патаку на 50 працэнтаў вышэйшая за імпартную. Таму бабруйскія вытворцы завозяць яе з Украіны.

Усе выходныя кампаненты для халвы (у тым ліку і лекавая салодка) праходзяць прыдзірлівы ўваходны кантроль, і толькі пасля гэтага трапляюць на вытворчасць. Паспытайце бабруйскую халву і вы пераканаецеся ў тым, што яе адрознівае вытанчаны смак сапраўднага паўднёвага прысмаку. А якая разнастайнасць халвы можа чакаць вас у бліжэйшай краме: халва цукровая, халва з ванільным пахам, сланечнікавая халва з какосам, з макам, міндалём, карыцай, ізюмам і, нават, халва ў шакаладзе! Магчыма, вы ўсё гэта паспытаеце, калі бліжэйшая крама сапраўды працуе для вас — спажыўца...

Не менш адказна падыходзяць на «Чырвоным харчавіку» і да вырабу іншых відаў прадукцыі. Высокай якасці ў многім спрыяе атэстацыя вытворчасці на адпаведнасць стандарту СТБ 1470-2004 «Сістэмы якасці. Кіраванне якасцю харчовых прадуктаў на аснове аналізу рызыкі і крытычных кантрольных кропак». Гэта вельмі важны дакумент і важная атэстацыя. Раней, калі ўсе харчовыя прадукты былі экалагічна чыстымі, не было вострай неабходнасці кантраляваць іх вытворчасць. Аднак апошнім часам свет змяніўся. Пастаянна мяняецца экалогія, з'явілася генетычна мадыфікаваная сельскагаспадарчая сыравіна, у сельскагаспадарчай вытворчасці прымяняюцца ўсё новыя і новыя ядахімікаты, кансерванты, гарманальныя прэпараты, фарбавальнікі, араматызатары і г.д. Таму сусветная супольнасць, заклапочаная гэтымі фактарамі, выпрацавала адпаведныя метады абароны. На харчовых прадпрыемствах Еўропы яны ажыццяўляюцца згодна з нацыянальнымі нарматыўнымі дакументамі на падставе дырэктывы Савета Еўрапейскай супольнасці 93/43. Беларусь таксама ідзе ў нагу з гэтым працэсам і вытворчасць «Чырвонага харчавіка» яскравае таму сведчанне. Гэта пацвярджаюць высокія ўзнагароды шматлікіх конкурсаў і выстаў. У лютым з міжнароднага конкурсу «Лепшы прадукт 2008 года» 15-й міжнароднай выставы «Прадэкспа-2008» яно прывезла залатыя ўзнагароды за зефір «Бела-ружовы», мармелад «Фруктовыя забавы сметанковыя», цукеркі «Малочныя забавы». У красавіку «Чырвоны харчавік» удзельнічаў у выставе «Interfood-2008» у Санкт-Пецярбургу, у маі — у выставе-конкурсе «Усерасійская марка (III тысячагоддзе). Знак якасці XXI стагоддзя», з якой прывезены таксама залаты Знак якасці за бела-ружовы зефір.

Дырэктар прадпрыемства Мікалай ЧЫСЛОЎ.



Тэхналогія вырабу зефіру на «Чырвоным харчавіку» пабудавана на выкарыстанні пекціну. Пекцін — (ад грэчаскай *pektos* — згорнуты, застылы) гэта рэчыва з клейкімі ўласцівасцямі раслiннага паходжання, якое адносіцца да растваральных харчовых валокнаў. Самая каштоўная яго ўласцівасць — ачышчаць арганізм ад радыеактыўных элементаў, таксічных металаў і пестыцыдаў. Пекцін зніжае ўтрыманне халестэрыну, паляпшае крываток, спрыяе паляпшэнню абмену рэчываў. Бабруйскія вытворцы ўжываюць яго пры прыгатаванні сумесі цукровага яблычнага пюрэ як асновы для наступнага вырабу зефірнай масы. Пакуль пекцін яны купляюць у Францыі, хоць згодна з Пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 31 жніўня 2007 г. № 1122 плануецца да 2010 года пабудаваць завод па вырабе пекціну магутнасцю 600 тон у год з адходаў цукровай вытворчасці ў СЭЗ «Віцебск». Калі гэта адбудзецца, тады беларуская кандытарскія вырабы працягнуць сваё шэсце па планеце. Ну, а пакуль...

— Мы выкарыстоўваем агар у колькасці 10—12 тон у год для прыгатавання мармеладнага жэле. Агар уяўляе сабой парашок, атрыманы з бурых марскіх водарасцяў. Ён валодае выдатнай здольнасцю згушчэння водных растворaў а таксама здольнасцю выводзіць з арганізма радыенукліды і цяжкія металы (свінец, ртуць і інш.). Не выключана, што японскія вучоныя адшукалі ў агары і нейкія іншыя каштоўныя ўласцівасці, бо апошнім часам Японія актыўна скупляе яго на сусветных рынках. Кошт на агар імкліва расце.

Мы купляем агар у Чылі. Аднак пры прыгатаванні некаторых гатункаў мармеладу выкарыстоўваем і жэлацін.

— Відаць, для кандытараў ён павінен вызначацца асаблівай чысцінёй?

— Так. У нашай краіне выраб такога жэлаціну амаль не наладжаны. Даводзіцца купляць яго за мяжой, хоць гэта харчовая дабаўка таксама з'яўляецца лячэбнай для цэлага шэрагу хваробаў касцей і суставаў.

— Асноўнай большасці вашых вырабаў з'яўляецца звычайны яблык. Відавочна, хоць у гэтым мы не маем залежнасці ад замежнага?

— Да яблыкаў у нас свае патрабаванні. Спажываем у асноўным асеннія гатункі, багатыя пекцінам. Польскіх яблыкаў не спажываем. Купляем яблыкі ў буйных садавінных гаспадарках Беларусі, якія гарантуюць нам экалагічную чысціню гэтых пладоў. У месяц «Чырвоны харчавік» перарабляе іх каля 220 тон.

Як бачыце, наша вытворчасць экалагічна чыстая, што і забяспечвае высокі попыт на нашу прадукцыю. Дастаткова сказаць, што працуем мы практычна з колаў: задзел гатовай прадукцыі на складзе не перавышае двухсутачнай прадукцыйнасці. Штомесяц 200—250 тон прадукцыі ідзе за мяжу. Вытворчасць наша выгадная. Абарот капіталу не перавышае двух месяцаў. Прадпрыемства амаль не мае перад сабой запазычанасці кліентаў, у тым ліку і з боку спажывецкай каапэрацыі.

— Вам можна спачываць на лаўрах...

— Да гэтага далёка. Мы сочым за тым, у якім накірунку рухаюцца канкурэнты. У Расіі з года ў год назіраецца рост вытворчасці кандытарскіх вырабаў, а значыць і нам спыняцца нельга. Хаця расійскім вытворцам прасцей: у іх больш самастойнасці і менш справаздачнасці. Наша ж прадпрыемства кантралюецца па 13 паказчыках! А на маю думку, дастаткова было б па двух — рэнтабельнасці і прыбытку.

Ёсць тут над чым падумаць. Тым больш, што «Чырвоны харчавік» сапраўды развіваецца дынамічна — рост прадукцыйнасці працы апярэджвае колькасны рост супрацоўнікаў. І гэта пры тым, што ў яго складзе акрамя асноўнай вытворчасці вялікае далучанае сельгаспрадпрыемства ў Цялушы. Некалі з ім былі праблемы, але зараз і яно выходзіць на самаакупнасць. Калі ёсць гаспадар, то ён праявіць сябе ўсюды.

Немагчыма ў адным артыкуле расказаць пра разнастайныя бакі дзейнасці «Чырвонага харчавіка». Гэта прадпрыемства развіваецца ўпэўнена і дынамічна. Старыя традыцыі тут гарманічна суіснуюць з сучаснымі маркетынгавымі даследаваннямі рынку і выкананай з густам, змястоўнай рэкламай.

Грунтуючы сваю стратэгію на заваёве замежных рынкаў, бабруйскія вытворцы не абыходзяць увагай і беларускі рынак. Кожны з нас, пакаштаваўшы любы са 120 яго вырабаў, адчуе сапраўдную асалоду і гонар за тое, што зроблена ў Беларусі.

Гандлярам пакідаем сайт прадпрыемства ў сетцы інтэрнэт — www.zefir.by, — на якім змешчаны поўны пералік і цэны на прадукцыю.

Віктар ХУРСІК.

WWW.ZEFIR.BY

УНП 700067279

АДРАС ПРАДПРЫЕМСТВА
213800 г. Бабруйск,
вул. Бахарава, 145.
Тэл./факс: +375 (225) 48 27 30
E-mail:market@zefir.by

Краіна здароўя

Выпуск № 49 (105)

ГАЛАЎНЫ БОЛЬ МОЖА СІГНАЛІЗАВАЦЬ АБ ЦЯЖКАЙ ХВАРОБЕ

На пытанні чытачоў адказваў прафесар, загадчык нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Неўралогія і нейрахірургія», член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук, Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Арнольд СМЕЯНОВІЧ.

(Працяг. Пачатак у нумары за 21, 22 кастрычніка).

☎ — Дзень добры! Жлобінскі раён, Марыя Іванаўна… 10 месяцаў назад з сынам здарылася няшчасце — моцны ўдар галаўнога мозга, у выніку чаго — спастычны тэтрапарэз. Яго выпісалі са стацыянара, цяпер мы дома самі змагаемся з бядой…

— Працэс аднаўлення ў дадзеным выпадку — вельмі працяглы. У хуткім часе вам трэба зноў звярнуцца да галоўнага ўрача раёна або бальніцы, у якой ляжаў сын, каб нагадаць аб чарговай рэабілітацыйнай шпіталізацыі. Абавязковыя курсы лячэння ў дадзеным выпадку паказаны двойчы ў год. Трэба змагацца, безумоўна, дапамагаць хвораму выконваць рэкамендацыі ўрачоў. І пастаянна распрацоўваць суставы...

— Гэта мы робім, наймаем масажыста…

— Правільна. Майце на ўвазе, што працэс рэабілітацыі будзе вельмі працяглым.

☎ — Уладзімір Андрэевіч, 52 гады, Брагін. У мяне спадчынная абцяжаранасць па абедзвюх бацькоўскіх лініях па вострым парушэнні мазгавога кровазвароту. Зараз ужо адчуваю першыя сур'ёзныя клінічныя праяўленні — рассеянасць, забыўлівасць. Мяркую, патрэбна прафілактыка, а раённы неўрапатолаг прызначае аміналон, цынарызін… Можа, трэба прайсці доплераграфію?

— Абсалютна правільна. Варта прайсці гэта даследаванне, паколькі ў вас могуць быць такія парушэнні. У Брагіне, праўда, наўрад ці магчыма зрабіць доплераграфію...

— Можна ў Гомелі, у Гомельскім цэнтры радыяцыйнай медыцыны і анкалогіі чалавека.

— Папрасіце туды накіраванне ў свайго лечачага ўрача. Або звярніцеся ў Гомельскую абласную клінічную бальніцу. Вас павінны абследаваць неўролагі. Абследаваць і прызначыць адпаведнае лячэнне.

☎ — Званю з Міёраў. Антаніна Мікалаеўна. У верасні сын упаў з вышыні і цяпер знаходзіцца ў Віцебскай абласной бальніцы, у нейрахірургіі. Моцная траўма галавы, кровазліцё, быў ацёк мозга. Шосты тыдзень ён без свядомасці. Але расплюшчвае вочы, крыху чуе, імкнецца выконваць каманды…

— А рух у руках і нагах ёсць?

— З правага боку ёсць, а вось левы…

— Значыць, у большай ступені пацярпела правае паўшар'е…

— Дзесяць дзён таму пачаліся танічныя сутаргі. Зараз колюць себазон. Што можна яшчэ зрабіць?

— Ёсць шмат прэпаратаў, якія зніжаюць мышачны тонус, але з імі трэба быць вельмі асцярожным, паколькі адначасова яны ўзмацняюць слабасць у канечнасцях. Каб рух заставаўся, можа, і не трэба іх прымаць... Урачы на месцы павінны гэта вырашыць.

— А якія могуць быць наступствы, калі ён можа прыйсці ў свядомасць?

— Наступствы могуць быць розныя. Можа ўсё паступова аднавіцца, а можа штосьці застацца нязменным на ўсё жыццё. Гэта залежыць ад ступені паражэння галаўнога мозга...

— Скажыце яшчэ, калі ласка, ці можа сын лячыцца ў Мінску, паколькі ён прапісаны ў Бараўлянах? Ён проста прыехаў да нас на выхадныя, і нам далі накіраванне ў Віцебск…

— Калі ён прапісаны ў Бараўлянах, значыць, мае права абслугоўвацца ў Мінскай абласной клінічнай бальніцы.

— Там таксама ёсць нейрахірургічнае аддзяленне?

— Яму ўжо не патрэбна нейрахірургічная дапамога. У бліжэйшы час спатрэбяцца рэабілітацыя, неўралагічнае аддзяленне. У аднаўленчым перыядзе ім павінны займацца неўролагі, якія ў Мінскай абласной бальніцы, вядома ж, ёсць.

— Зараз сына нельга транспартаваць?

— Такіх хворых не перавозяць.

— А ў ваш цэнтр як можна трапіць?

— Як такога нейрахірургічнага цэнтра яшчэ пакуль няма — ён будуецца. Мы працуем на базе 5-й гарадской клінічнай бальніцы.

— Зразумела. Дзякуй вялікі.

☎ — Орша, Таццяна. Пра маці хачу спытаць… Ёй 78 гадоў, у яе дысцыркуляторная энцэфалапатыя 2-3-й ступені. Страчвае памяць, арыентацыю…

— Гэта неўралагічны дыягназ, і лячэннем у дадзеным выпадку займаюцца неўролагі. Такое распаўсюджанае ў сталым узросце захворванне ўзнікае ў выніку атэрасклератычнага паражэння сасудаў галаўнога мозга.

— А вы чулі пра цытамедзіны?

— Безумоўна, але нікому не раю займацца самалячэннем. Звярніцеся ўсё ж такі да неўролага.

— Але нашы ўрачы нічога пра іх не ведаюць…

— Правільна, таму што гэта эксперыментальныя даследаванні, і пакуль дакладна не вядома, калі яны завершацца і які эфект дадуць.

— Скажыце, а нельга спыніць гэты працэс?

— Спыніць нельга, можна толькі прыпыніць. У многім працэс абумоўлены ладам жыцця чалавека. Як бы мы ні спадзяваліся на лекі, але важныя дыета — нятлустая ежа, паболей агародніны, адпачынак... Гэта спрыяе зніжэнню тэмпаў прагрэсавання захворвання. А лячэнне звязана з паляпшэннем кровазвароту галаўнога мозгу. Ёсць вялікая колькасць лекаў для гэтых мэтаў, але, як у выпадку з любымі іншымі лекавымі прэпаратамі, тут патрэбны індывідуальны падыход.

☎ — Мінск, Сяргей Юльянавіч. Мне 62 гады. Было шунціраванне сэрца… У сакавіку ва ўнутранай соннай артэрыі злева выдалілі тромб… Падчас хады ёсць задышка. Скажыце, яна будзе працягвацца ці варта рабіць аперацыю па прычыне закрыцця правай унутранай соннай артэрыі?

— Калі закрыццё адбылося, вы ўжо ніяк на гэта не паўплываеце. Сасуды галаўнога мозгу звязаны паміж сабой каналамі, там існуе так званы калатэральны кровазварот. Дзякуючы гэтаму, праапераваная левая артэрыя забяспечвае кроўю і правае паўшар'е. Акрамя таго, у вас яшчэ працуюць дзве пазваночныя артэрыі. Так што з чатырох артэрый выключылася толькі адна. Задышка ж можа быць з-за праблем з сэрцам. Калі б пагаршаўся кровазварот у сасудах, тады вы павінны былі б адчуваць слабасць у назе, руцэ, а задышка — з-за сэрца, якое не спраўляецца са сваёй функцыяй. Сасуды таксама трэба лячыць. Паляпшаць кровазварот, прымаць адпаведныя прэпараты. Ці з вялікага шмат. Звярніцеся ў паліклініку па накірунак ў неўралагічнае аддзяленне 9-й бальніцы або бальніцу хуткай дапамогі, каб вас абследавалі, падабралі патрэбныя прэпараты.

— А без медыкаментаў не абысціся? Яны, хутчэй за ўсё, дарагія, а я пенсіянер…

— Я маю на ўвазе лячэнне стацыянарнае.

— А ад чаго можа быць галавакружэнне?

— Яно можа быць звязана з недастатковым мазгавым кровазваротам.

— Значыць, трэба трэніраваць сардэчную мышцу?

— Паколькі сэрца ў вас праапераванае, то з ім цяпер варта быць асцярожным. Тым не менш пэўныя фізічныя нагрузкі павінны быць. Звяртайцеся да неўролага, можаце і да неўрахірурга ў нашым цэнтры — Капацэвіча Сяргея Віктаравіча.

☎ — Магілёў турбуе. Аляксандр Іванавіч. Мне 50 гадоў. У задне-чарапной ямцы пастаянна адчуваю ціск, вось ужо 13 гадоў… Абследаваўся. Унутрычарапны ціск нармальны, але ёсць змешаны тып парушэння мазгавой дынамікі з рэзка выражанай перавагай ангіяспазма, зніжанае крованапаўненне артэрыяльных сасудаў галаўнога мозгу. Выявілася арахнаідальная кіста. Што вы параіце?

— Я раю вам пад'ехаць у Бальніцу хуткай дапамогі да загадчыка аддзялення, галоўнага нейрахірурга Магілёўскай вобласці Канавалава Юрыя. Пакажыце свае здымкі. Завочна разабрацца ў тым, якое ўздзеянне аказвае кіста, мне цяжка.

☎ — Ірына з Кобрына турбуе. Падкажыце, ці абавязкова абследавацца пры галаўных болях ці дастаткова проста здымаць іх з дапамогай прэпаратаў?

— Заўсёды пры галаўным болі варта абследавацца, паколькі гэта асноўны сімптом праяўлення пухліны. Асабліва ўважлівым трэба быць у дачыненні да болю, якога ніколі не было, і калі з кожным разам чалавек пакутуе ўсё больш. Пры паратоўных галаўных болях, якія не знімаюцца лекамі, трэба абавязкова рабіць камп'ютэрную тамаграфію. Адпаведныя апараты сёння ёсць ва ўсіх буйных бальніцах, у тым ліку ва ўсіх абласных дыягнастычных цэнтрах... Абследавацца трэба для таго, каб выключыць наяўнасць пухліны ці анеўрызмы...

— А з чым наогул можа быць звязаны галаўны боль?

— З павышаным ціскам, са спазмамі, якія добра знімаюцца спецыяльнымі прэпаратамі. Іх вельмі многа, і падбіраць варта індывідуальна. Як правіла, аднаму дапамагае адзін, другому — іншы...

— А прывыканне да гэтых лекаў можа развіцца?

— Можа, і як правіла, развіваецца. Праўда, потым, калі праз нейкі час чалавек зноў да яго вяртаецца, яму зноў дапамагае.

— Наколькі рэальна пазбегнуць рэцыдыву інсульту?

— Інсульт — кровазліццё, прычына — высокі ціск. Пазбегнуць рэцыдыву можна з дапамогай рэжыму і правільна падабранага медыкаментознага лячэння. Калі не вытрымліваць дыету і г.д., нічога добрага не будзе.

☎ — Баранавічы, Міхаіл, 46 гадоў. Дыягназ — транзіторная ішэмічная атака пры артэрыяльнай гіпертэнзіі 2 рызыка 4. Ціск звычайна не ўзнімаецца вышэй за 130/90.

— Вы павінны знаходзіцца пад дасканалым наглядам неўролага і выконваць усе яго рэкамендацыі. І абавязкова вытрымліваць рэжым харчавання, адпачынку і г.д. Таму што гіпертанічная хвароба, калі ўжо з'явілася, нікуды не знікне. Значыць, вы абавязаны ўсё жыццё прымаць спецыяльныя прэпараты. Звярніце ўвагу на свой лад жыцця і медыкаментозную дапамогу.

☎ — Слуцкі раён. Ганна Сцяпанаўна звоніць. Мне 76 гадоў… Вось ужо 30 гадоў высокі ціск, нічога не дапамагае. Як мне процістаяць павышанаму ціску, які ўзнімаецца ноччу, каля 2-й гадзіны?

— Вам неабходна вырашаць вашы пытанні з неўролагам, які прызначыць адпаведныя прэпараты. Яны абавязкова дапамогуць процістаяць павышанаму ціску. І звярніце, калі ласка, увагу на свой лад жыцця, асабліва на харчаванне.

☎ — Валянціна Васільеўна з Беразіно. Мне 43 гады. У мяне вельмі моцныя галаўныя болі ў скроневай частцы злева вось ужо два тыдні. Ціск узнімаецца да 160, я трымаю яго ў норме да 140. Прымаю прэпараты, якія зніжаюць ціск. Абследавалася ў абласной бальніцы: ангіяспастычны тып парушэння гемадынамікі, зніжэнне крованапаўнення артэрыяльных сасудаў мозгу злева на фоне гіпертанічнай хваробы.

— Вам трэба быць пад пастаянным назіраннем неўролага, і дасканала праводзіць лячэнне гіпертаніі. Інакш сітуацыя будзе толькі пагаршацца. Неўролаг павінен падабраць неабходныя прэпараты.

— Неўролаг кажа, што мной павінен займацца тэрапеўт.

— Няпраўда. У вас не толькі павышаны ціск, але ёсць і лёгкае парушэнне мазгавога кровазвароту, а гэта ўжо неўралагічны дыягназ. Калі не будзе лепш, папрасіце накірунак ў Мінскую абласную бальніцу.

— Дык я там і была…

— У такім выпадку вазьміце ў свайго ўрача накірунак у наш цэнтр неўралогіі і нейрахірургіі, да неўролага.

«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО. (Працяг будзе.)

Халадовая алергія: уцяпляемся і загартоўваемся

З надыходам халадоў нагадвае аб сабе халадавая алергія (яшчэ халадовая крапіўніца). На першы погляд, назва нейкая дзіўная. Хіба можа быць алергія на надвор'е? Аказваецца, можа.

Вы пазнаеце яе па…

…нясцерпным свербе, смыленні, чырвоным сыпе (як быццам вас абхвасталі крапівой), закладзеным носе, ацёку і прыпухласці скуры. У цяжкіх выпадках з'яўляюцца вадыры, вочы чырванеюць і запаляюцца, узнікае спазм бронхаў, што прыводзіць да ўскладнення дыхання. Сімптомы праяўляюцца праз некалькі хвілін пасля ўздзеяння холаду, у цёплым памяшканні прыкладна праз паўгадзіны знікаюць. (У некаторых людзей халадовая крапіўніца з'яўляецца не тады, калі яны мерзнуць, а калі ўжо адаграваюцца.) Ад халадовай алергіі часцей церпяць скура твару, рук, вушэй, слізістая абалонка вуснаў, галёнкі. Твар і рукі — таму што аказваюцца неабароненымі ад марозу і ветру. У вобласці галёнак і перадплеччаў мала тлушчавых і потавых залозаў, з-за гэтага яны адчувальныя да нізкай тэмпературы.

Халадовая алергія — рэакцыя арганізма на холад, сырасць, мароз. Такую рэакцыю ўрачы называюць «псеўдаалергічнай»: ад звычайнай алергіі адрозніваецца тым, што ў арганізме адсутнічае чужароднае рэчыва-алерген, які запускае механізм хваравітай рэакцыі.

Сустракаецца некалькі відаў алергічных рэакцый на холад. Самая простая і найбольш распаўсюджаная — чыста халадовая алергія, не звязаная з нейкімі іншымі захворваннямі. Яна праяўляецца літаральна праз некалькі хвілін пасля ўздзеяння паніжаной тэмпературы. Іншыя формы халадовай алергіі развіваюцца пры наяўнасці розных хранічных захворванняў (парушэнні функцый шчытападобнай залозы, чырвоная ваўчанка, танзіліт, халецыстыт) і працякаюць значна цяжэй. Сустракаецца і спадчынная форма алергіі на холад, якая суправаджаецца адчуваннем пякоты, а не свербу, і з'яўляецца больш рэакцыяй арганізма на вецер, чым на холад.

Хочаце даведацца, ці схільныя вы да халадовай алергіі? Зрабіць гэта лёгка. Проста вазьміце кубік лёду і прыкладзіце яго хвілін на 20 да ўнутранага боку перадплеча. Затым паглядзіце, ці ёсць высыпка, ці з'явіўся сверб. Пры наяўнасці такіх сімптомаў можна меркаваць, што ў вас адчувальнасць скуры да холаду павышаная. (Аднак памятайце, што гэты тэст падыходзіць толькі для пацвярджэння самай простай формы халадовай алергіі, не звязанай з іншымі захворваннямі. Больш складаныя віды алергічнай рэакцыі на холад неабходна выяўляць у лабараторных умовах.)

Калі з'явіліся хоць нязначныя падазрэнні на наяўнасць халадовай алергіі, абавязкова звярніцеся да ўрача-алерголага, і чым раней вы гэта зробіце, тым лепш.

На жаль, прывыкнуць да холаду немагчыма. Таму ваша задача — максімальна зменшыць яго ўздзеянне на арганізм.

- Самае простае і надзейнае правіла — перад выхадам з дома піце цёплы чай і ўцяпляйцеся. Цёплыя шалікі і пальчаткі, глыбокія капюшоны, доўгае паліто — абавязковыя складнікі вашага гардэробу.
- Адмоўцеся ад адзення са штучных валокнаў, сінтэтыкі. І, як ні дзіўна, — будзьце асцярожныя з шэрсцю, бо яна сама па сабе можа стаць алергенам. Таму пастарайцеся, каб шарсцяныя світары, кофтачкі, сукенкі не дакраналіся да голага цела, — паддзявайце баваўняную, фланэлевую або льняную бялізну.
- Перад выхадам на вуліцу (прыкладна за 30 хвілін) накладвайце на твар і рукі тонкі слой пажыўнага крэму. Можна прыпудрыць скуру рассыпістай пудрай. Вусны змазвайце гігіенічнай памадай.
- Адчуўшы нядобрае, адразу прыміце антыгістамінны прэпарат. (У халодную пару яго, на ўсялякі выпадак, заўсёды насіце з сабой.)
- Калі алергічная рэакцыя ўсё-такі пачалася, некалькі разоў на дзень месцы сыпу змазвайце масленым растворам вітаміну Е або працірайце растворам соды (1/3 ч. лыжкі на шклянку цёплай вады), густа прыпудрывайце кукурузным крухмалам. Здымае раздражненне скуры ванна з адварам рамонку ці з тым жа крухмалам.
- На моцным ветры слязяцца вочы — дапамогуць вочныя каплі, якія валодаюць заспакаяльным дзеяннем. Не менш эфектыўныя тут і настоі некаторых лекавых траў, напрыклад, адвар насення кмену або кветак сіняга васілька. Працэджаную вадкасць трэба закапваць у вочы 2—3 разы на дзень, прычым лепш за некалькі гадзін да выхаду на вуліцу. Памятайце, што ў халодную пару лепш не раздражняць вочы нашэннем кантактных лінзаў і празмерным макіяжам.
- Калі на холадзе ў вас закладае нос, за 10—15 хвілін да выхаду закапайце любыя кроплі супраць алергіі. (Сасударасшыральныя сродкі ад насмарку выкарыстоўваць не рэкамендуецца.)
- Ні ў якім разе не мучце скуру пастаяннымі гігіенічнымі працэдурамі: мыла, асабліва танныя яго гатункі на шчолачнай аснове, толькі перасушвае яе, пазбаўляючы натуральнай ахоўнай змазкі. Прыняўшы душ вечарам, нанясіце на скуру, яшчэ пакрытую кроплямі вады, увільгатняльны крэм або касметычны алей.
- Пастарайцеся выключыць са свайго рацыёну прадукты, якія могуць узмацніць праявы халадовай алергіі: рыбу, мёд, яйкі, шакалад, цытрусавыя.
- Каб папярэдзіць рэцыдывы захворвання, пачніце загартоўвацца. Добра зарэкамендавалі сябе абціранне і абліванне вадой з паступовым зніжэннем тэмпературы. Пасля працэдуры кожны раз расцірайце цела махровым ручніком да пачырванення скуры.
- Памятайце таксама, што своечасовае і старанное лячэнне хранічных захворванняў — неабходная ўмова для пазбаўлення ад халадовай алергіі.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Акцыі

СПЫНІЦЬ ІНСУЛЬТ!

Каля 100 пунктаў вызначаны месцам правядзення акцыі «Разам супраць інсультаў», якая пройдзе ў сталіцы 29 і 30 кастрычніка.

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў Камітэце па ахове здароўя Мінгарвыканкама, урачэбна-сястрынскія брыгады будуць працаваць у гэтыя дні ў гарадскіх паліклініках, аптэках, буйных магазінах, гандлёвых цэнтрах, а таксама на прамысловых прадпрыемствах. У прыватнасці, свае плошчы для правядзення акцыі прадаставілі ўніверсамы «Першамайскі», «Аўтазаводскі», «Чкалаўскі», «Магілёўскі», «Радзівілаўскі», «Рублёўскі» (на вуліцах Р. Люксембург і 2-м завулку Багратыёна), «Трактаразаводскі», «Прастор-маркет», «Рыга», ЦУМ, магазін «Тавары для жанчын», «Еўрапейскі», «Вільнюс», гандлёвыя цэнтры «Дзмітрыеў кірмаш», «Максімус» (на вуліцах Лабанка і Ясеніна), «Кірмаш», «Карона», «Рыга», Камароўскі рынак, Маскоўскі рынак, Дом быту на вуліцы Ташкенцкай.

У акцыі возьмуць непасрэдны ўдзел гарадскія паліклінікі № 2, 4, 7, 8, 9, 12, 13, 14, 15, 18, 20, 25, 26, 29, 30, 31, 32, 33, 34, 35, амбулаторыі № 1 і № 2, а таксама аптэкі № 19 (пр-т Незалежнасці, 119), № 110 (вул. Русінава, 9), № 112 (вул. Гінтаўта, 14), № 45 (вул. Галадзеда, 63), № 7 (пр-т Партызанскі, 64), № 105 (вул. Танкавая 34/2), № 104 (пр-т Пераможцаў 75-1), № 101 (вул. Якубоўскага, 32-а), № 6 (вул. Панчанкі, 44), № 106 (вул. Прытыцкага, 78), № 91 (вул. Адзінцова, 36), № 34 (вул. Уральская, 16), № 62 (пр-т Пушкіна, 41), № 79 (вул. Сердзіча, 88), № 40 (вул. Берута, 20). Падтрымалі акцыю таксама Адміністрацыі Фрунзенскага, Кастрычніцкага і Партызанскага раёнаў.

29 і 30 кастрычніка ўсе ахвотнікі змогуць наведаць названыя ўстановы, дзе для іх будзе складзена індывідуальная «карта прагназавання ўзнікнення мазгавога інсульту». Акрамя таго, у гэтыя дні будуць працаваць тэлефоны «гарачых ліній» у Мінскім гарадскім кардыялагічным дыспансэры **315 13 19** (з 9.00 да 19.00) і ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры неўралогіі і нейрахірургіі **267 17 13** (з 9.00 да 17.00).

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка вёскі Хорск Слонімскага раёна Любоў УРУНІЧ цалуе сваю ўнучку Машу.

Сакрэты даўгалецця

ЧАМУ МЫ ГУБЛЯЕМ 30—40 ГАДОЎ ЖЫЦЦЯ?

Апошнія паўтара стагоддзя сярэдняя працягласць жыцця жыхароў нашай планеты працягвала расці. У развітых краінах свету яна дасягае зараз 84-86 гадоў. Па дадзеных Інстытута народанасельніцтва ААН, чакаемая сярэдняя працягласць жыцця ў дзяцей, народжаных пасля 2000 года, складае 103 гады для хлопчыкаў і 107 гадоў — для дзяўчынак. Фактычна насельніцтва планеты старэе на тры месяцы кожны год.

Зразумела, што механізмы старэння чалавечага арганізма сёння цікавяць вельмі многіх. Чаму мы ўсе старэем па-рознаму? Што паскарае працэсы старэння? Ці можна старэць прыгожа? Аб усім гэтым — наша гутарка з дацэнтам кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдатам медыцынскіх навук Любоўю ВАРОНІНАЙ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Любоў Пятроўна, вельмі часта імяніннікам жадаюць дажыць да 100 гадоў, і мала хто задумваецца над тым, а ў якім стане цела і душы можа падысці чалавек да гэтага ўзроставага парога. Разам з тым ёсць дастаткова прыкладаў, калі чалавек у вельмі сталым узросце захоўвае і інтарэс да жыцця, і фізічную актыўнасць…

— Я адразу хачу падкрэсліць, што геранталогія — гэта тая галіна медыцыны, дзе намешаны домыслы, міфы, спекуляцыі і ісціна. Тэрмін «геранталогія» ўвёў у 1903 годзе Ілля Мечнікаў. Сам ён пачаў рана старэць і спрабаваў апісаць тыя змяненні, што адбываліся ў яго арганізме. Вядомы расійскі вучоны дажыў да 71 года і пакінуў шмат цікавых работ, якія з задавальненнем чытаюць па сённяшні дзень.

Усе жадаюць жыць доўга, але ніхто не хоча быць старым. Між іншым, старэнне і старасць — зусім не ідэнтычныя паняцці. Старасць — заключны перыяд узроставага развіцця арганізма чалавека. А старэнне — гэта разбуральны працэс, які зніжае адаптацыйныя магчымасці арганізма і спрыяе развіццю ўзроставай паталогіі. Ёсць меркаванне, што працэс старэння запускаецца фактычна з моманту нараджэння чалавека. Але з ім можна паспрачацца: гэта старэнне ці ўсё ж такі развіццё арганізма? Да таго ж працэсы старэння могуць ісці з рознай хуткасцю ў розных органах і тканках. Медыкі выдзяляюць два тыпы старэння: фізіялагічны і паталагічны. Прынята лічыць, што пры фізіялагічным старэнні біялагічны ўзрост чалавека адпавядае пашпартнаму, а пры паталагічным назіраецца паскоранае старэнне, калі тыя ці іншыя органы зношваюцца ў чалавека хутчэй, чым у яго аднагодкаў. На працягу дзесяцігоддзяў у свеце дыскутуюць на тэму, а ці абавязкова старэнне павінна асацыявацца з такімі захворваннямі як рак, інсульт, нервова-дэгенератыўныя захворванні, ці можа старэнне быць цалкам здаровым, так бы мовіць, фізіялагічным? Гэтай праблемай займаўся Балтыморскі праект Нацыянальнага інстытута старэння ЗША, дзе на працягу 40 гадоў назіраліся здаровыя добраахвотнікі. Навукоўцы спрабавалі вызначыць маркеры старэння. Але эксперымент быў асуджаны на няўдачу, паколькі высветлілася, што дынаміка паказчыкаў вельмі моцна вар'іруецца ў розных людзей. Усе старэюць па-рознаму, і ўзроставыя змяненні назапашваюцца настолькі непрыкметна, што агульныя заканамернасці вывесці складана. Сапраўды, ёсць паказчыкі, якія дакладна сведчаць аб паталагічным старэнні арганізма. Напрыклад, ранняе пасіўненне валасоў зусім не звязана са старэннем арганізма. А вось гіперхалестэрымія — фактар, які ўказвае на старэнне арганізма.

Праца ў калектыве адцягвае старасць.

Акрамя інтэгральнага біялагічнага ўзросту выдзяляюць яшчэ ўзрост асобных сістэм (сардэчна-сасудзістай, дыхальнай, клетачнай і г.д.), а таксама псіхалагічны, сацыяльны і інтэлектуальны ўзрост. Была таксама здзейснена спроба прасачыць, ці залежаць тэмпы старэння ад палавой прыналежнасці. Высветлілася, што ў жанчын гэтыя тэмпы больш марудныя, чым у мужчын, асабліва ва ўзросце ад 29 да 59 гадоў.

— А ці вядома, на колькі гадоў жыцця запраграмаваны прыродай чалавек?

— Па апошніх дадзеных, на 110—120 гадоў — гэта менавіта той узрост, калі розныя клетачныя і кропкавыя мутацыі яшчэ сумяшчальныя з жыццём. Выходзіць, што каля 30—40 гадоў у нас выпадаюць. Ці можна іх вярнуць?

Мяркуецца, што прыкладна на 50 працэнтаў працягласць нашага з вамі жыцця залежыць ад генетычных фактараў. Сярэдні ўзрост маіх пацыентаў складае 80-85 гадоў. І ў мяне ёсць дастаткова прыкладаў, калі ў людзей у гэтым узросце ў норме можа быць і сардэчна-сасудзістая сістэма, і дыхальная, і зрок, і слых, і апорна-рухальны апарат. Не назіраецца нават атэрасклерозу. Цікавімся, як чалавек харчуецца. Высвятляецца, што як большасць беларусаў — бульбай з салам. Пытаемся, а ці курыць ён. «Курыў і буду курыць, — адказвае, — бо цыгарка мяне выратавала ў вайну». І тут ужо разумееш, што ў фізіялагічныя працэсы ўмяшалася генетыка, хоць чалавек і не прыкладаў асаблівых намаганняў для таго, каб замарудзіць працэс старэння. Ёсць нават тэрмін «феномен ухілення ад смерці» — гэта калі цэлы шэраг паталогій, характэрных для састарэлага ўзросту, у чалавека не назіраецца.

Сёння дакладна ўстаноўлена, што ёсць гены, якія адказваюць за абмен халестэрыну. Эксперты ААН прааналізавалі найбольш распаўсюджаныя захворванні ў людзей састарэлага ўзросту і падлічылі, што калі б можна было папярэдзіць ці замарудзіць развіццё такой паталогіі як інфаркт, інсульт, пнеўманія, рак лёгкага, то працягласць жыцця павялічылася б у сярэднім на 9 гадоў: у развітых краінах свету — на 16 гадоў і ў краінах, якія развіваюцца, — на 4,3 года.

— Апошнім часам даволі часта ў СМІ з'яўляюцца паведамленні аб нараджэнні дзяцей у немаладых бацькоў. Наколькі адпавядае рэчаіснасці меркаванне, што познія дзеці падаўжаюць жыццё?

— Адсачыць папуляцыйную генетыку чалавека вельмі праблематычна, таму прадметам для даследаванняў становяцца тыя групы, на прыкладзе якіх можна адсачыць цэлыя пакаленні. Напрыклад, на прыкладзе сем'яў англійскіх арыстакратаў было даказана, што самае працяглае жыццё было ў жанчын, якія нарадзілі першае дзіця пасля 40 гадоў: жанчыны, якія пражылі 100 гадоў і больш, у 10 разоў часцей нараджалі дзяцей пасля 40 гадоў. Атрымліваецца, што позняя менапаўза спрыяе доўгажыхарству. І, наадварот, сярод тых, хто памёр дастаткова рана (да 50 гадоў), дзве трэці былі бяздзетныя. Таксама сярод жанчын-арыстакратак, якія памерлі рана, былі і тыя, у каго ўзрост першых родаў быў вельмі ранні. Самае цікавае, што ў мужчын-арыстакратаў працягласць жыцця таксама залежала ад колькасці дзяцей: яна была большая пры невялікай колькасці дзяцей.

Заўважана, што працягласць жыцця дачкі карэлюе з працягласцю жыцця маці. З сынамі такой карэляцыі не прасочваецца. Даказана таксама, што асноўны груз генетычных мутацый перадаецца не праз палавую клетку жанчыны, а праз палавую клетку мужчыны. На прыкладзе французскіх буржуа даследавалі нашчадкаў старых бацькоў — мужчын, у якіх дзеці нарадзіліся, калі ім было ад 49 да 52 гадоў. Высветлілася, што іх дзеці былі менш жыццяздольныя, асабліва гэта датычылася дачок, сярэдні ўзрост якіх не перавышаў 53 гады.

— А ці мае працэс старэння нацыянальныя асаблівасці? Многія, хто быў у Еўропе, заўважаў, што еўрапейскія пенсіянеры ў параўнанні з нашымі выглядаюць надзвычай бадзёра і актыўна вандруюць па свеце, хоць на пенсію яны выходзяць значна пазней. Дарэчы, намер павысіць у нашай краіне пенсійны ўзрост вельмі неадназначна быў успрыняты грамадскасцю…

— Адноўлены дырэктар Інстытута народанасельніцтва ААН сур'ёзна пацікавіўся ў прадстаўнікоў краін СНД: «А ці не падаецца вам, што калі жанчыны вымушаныя выходзіць на пенсію на пяць

Пастаянныя трэніроўкі інтэлектуальных здольнасцей падтрымліваюць фізіялагічныя рэзервы арганізма.

гадоў раней за мужчын, гэта можна разглядаць як праяву дыскрымінацыі? І чаму, калі вашы жанчыны жывуць на 10 гадоў больш за мужчын, на пенсію яны выходзяць на 5 гадоў раней?»

Еўрапейцы, выходзячы на пенсію, адчуваюць сабе свабоднымі, а нашы людзі — кінутымі. У Японіі, якая лідзіруе па сярэдняй працягласці жыцця, пенсіянерамі даражаць. Кампаніі, дзе працуюць людзі пенсійнага ўзросту, атрымліваюць падатковыя льготы. У Японіі створана цэлая сістэма перанавучання і перадачы вопыту ад старых маладым. Ёсць кампаніі, дзе ў дырэктарскі корпус уваходзяць людзі розных узростаў, так бы мовіць, сплаў мудрасці, развазлівасці, энергіі і ініцыятывы.

Дарэчы, сярод фактараў, якія спрыяюць старэнню, японцы ставяць на першае месца адданасць інтарэсам сям'і ці пражыванне ў поўнай сям'і. Зусім неабавязкова пражываць пад адным дахам пастаянна, але вельмі важна адчуваць падтрымку сваякоў, важна як мага часцей збірацца разам усёй сям'ёй. А вось адзінота, наадварот, скарачае жыццё чалавека. На другое месца японцы ставяць адданасць прафесіі і інтарэсам кампаніі. Праца ў калектыве адцягвае старасць. А той, хто вымушаны пайсці з работы, якой ён прысвяціў усё жыццё, і не можа знайсці ёй паўнавартасную замену, старэе літаральна на вачах. Калі ў чалавека страчваецца інтарэс да жыцця, яму ўжо вельмі цяжка дапамагчы, таму шукайце абавязкова сабе на пенсіі занятак для душы. Даказана таксама, што адукаваныя людзі старэюць пазней за людзей з невысокім адукацыйным узроўнем. Увогуле, чалавек, які займаўся інтэлектуальнай працай, павінен імкнуцца займацца ёй як мага далей, бо пастаянныя трэніроўкі інтэлектуальных здольнасцяў падтрымліваюць фізіялагічныя рэзервы арганізма. А на трэцяе месца японцы ставяць дыетычныя звычкі і асаблівасці харчавання.

Дарэчы, цікавае даследаванне правялі амерыканцы. Яны, у прыватнасці, устанавілі, што працягласць жыцця чалавека павялічваецца ў сярэднім на адзін год пры павышэнні ўзроўню даходаў на кожныя 10 тысяч у год. У Злучаных Штатах, між іншым, сярод людзей, якія дажылі да 100 гадоў, суадносіны складаюць адзін да дзесяці: сярод доўгажыхароў жанчын у 10 раз больш, чым мужчын.

— Любоў Пятроўна, а цяпер пытанне, якое хвалюе ўсіх. Ці можна старэць прыгожа? Што можа прапанаваць сучасная медыцына і фармакалогія?

— Я лічу, што тэрмін «медыцына антыстарэння» сябе моцна дыскрэдытаваў — занадта шмат спекуляцый было на гэту тэму апошнім часам. А з пазіцый даказальнай медыцыны сродкаў, якія могуць замарудзіць працэс старэння, не так ужо і шмат. Размова ідзе ў першую чаргу пра герапратэктары, якія рэкамендуецца прымяняць у маладым і сярэднім узросце, таму што ў старасці спыніць запушчаныя паталагічныя працэсы ўжо немагчыма.

Даказана існаванне прамой сувязі паміж працягласцю жыцця і ўтрыманнем у арганізме некаторых вітамінаў і ферментаў. Да групы даказаных герапратэктараў, якія прайшлі клінічныя выпрабаванні, адносяцца вітаміны А і Е. Існуе даказаная база і па адаптагенах — гэта рэчывы, якія павышаюць супраціўляльнасць арганізма да фактараў знешняга асяроддзя, яны здольныя актывізаваць генетычны апарат і ўплываць на эндакрынную сістэму. Да адаптагенаў адносяцца жэньшэнь і элеўтаракок, праўда, па элеўтаракоку дадзеных сабрана больш. Маецца інфармацыя па павышэнні працягласці жыцця пры выкарыстанні экстракта гінгко-білоба. Ёсць дадзеныя па поліфенолах, якія ўтрымліваюцца ў чырвоным віне: у разумнай колькасці вінаграднае чырвонае віно можа прыносіць карысць. Даказаны таксама карысныя ўласцівасці зялёнай гарбаты: у людзей, якія спажывалі яе ў вялікай колькасці, знізжалася заўчасная смяротнасць ад анкалагічных захворванняў. Ёсць дадзеныя па герапратэктарнаму ўздзеянню таксама антыдыябетычных прэпаратаў, біягенных стымулятараў...

— А ці можна падоўжыць жыццё за кошт змяншэння частаты сардэчных скарачэнняў?

— Частата сардэчных скарачэнняў — гэта толькі маркер стану сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм. Але, сапраўды, такая залежнасць устаноўлена, асабліва гэта датычыцца мужчын: павелічэнне колькасці сардэчных скарачэнняў на 40 у секунду павялічвае ўдвая кольк

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

Абрабавалі бабульку

У Глыбоцкім раёне — у вёсцы Тумашы бліжэй да вечара невядомы з не закрытага дома 76-гадовай пенсіянеркі скраў больш за 2,2 мільёна рублёў. Узбуджана крымінальная справа. На жаль, аналагічныя здарэнні ў міліцэйскіх зводках — не рэдкасць. Зачыняйце, паважаныя, заўсёды дзверы!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (22 кастрычніка). Па гарызанталі: Прараб. Аварыя. Драм. Раут. Эры. Хан. Шпік. Вусце. Перавалка. Алі. Сап. Рамонак. Лена. Абат. Ірак. Нагана. Табу. Сэт. Увал. Мата. Сіта. Сыр. Шыпшына. **Па вертыкалі:** Спурт. Скавыш. Рорых. Атрамант. «Рамэн». Ванаг. Масты. Барыш. Алабама. Пелікан. Торба. Агуці. Таса. Квас. Алітус. Сапераві. Набат. Ядловец. Акула. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

5	8	4	9	3	2	1	7	6
7	1	9	6	8	5	4	3	2
6	3	2	4	1	7	5	9	8
4	9	3	2	7	1	6	8	5
2	7	6	8	5	4	9	1	3
1	5	8	3	9	6	2	4	7
8	2	5	1	4	3	7	6	9
3	6	1	7	2	9	8	5	4
9	4	7	5	6	8	3	2	1

«Аляксандр Маслякоў і кампанія» перабіраюцца ў Беларусь

Смешна сказаць

З наступнага года ў Мінску будзе здымацца Першая ліга КВЗ

У студзені менавіта ў беларускай сталіцы стартуе Першая ліга КВЗ, трэцяя па значнасці пасля Вышэйшай і Прэм'ер-лігі. З падрабязнасцяў вядома толькі, што ўсе гульні будуць праходзіць у Мінску і паказвацца на канале АНТ, весці гульні будзе Аляксандр Маслякоў-малодшы, а адным з рэдактараў стане Леанід Купрыда — выхадзец з колішняй каманды КВЗ БДУ. Што да ўдзельнікаў, то сярод іх будуць не толькі нашы суайчыннікі, але менавіта для іх гэта дадатковы шанц паказацца шырокай публіцы. Якраз таму Першая ліга традыцыйна «мігруе» з месца на месца — то яна ішла ў Казані, то ў Варонежы, то ў Санкт-Пецярбургу, то ў Цюмені, цяпер завяршае працу ў Ніжнім Ноўгарадзе і рыхтуецца да пераезду ў Мінск...

Курыраваць працэс, дый увогуле прадстаўляць усе інтарэсы Міжнароднага саюза КВЗ у нашай краіне будзе навастраваная даччынае аб'яднанне «АМіК Беларусь». Падобныя структуры ўжо дзейнічаюць, напрыклад, у Літве і ва Украіне, але для нас гэта ў навінку.

Магчыма таму прыезду ў Мінск нязменнага вядучага КВЗ Аляксандра Маслякова (старэйшага) з такім нецярпеннем чакалі і гледачы, і беларускія каманды КВЗ. Першыя радавалися магчымасці ўбачыць паўфінал Вышэйшай лігі з удзелам камандаў «Фёдар Дзвіняцін», «СОК», «Максімум», «Байкал» раней за тэлетрансляцыю, другія спадзяваліся, што будзе нарэшце пастаўленая кропка ў зацяжным канфлікце «беларуская Еўраліга — АМіК», або Мукавозчык — Маслякоў, калі хочаце. Нагадаем, у студзені гэтага года на фестывалі КВЗ у Сочы прагучала аб'ява: «Еўраліга» (а менавіта праз яе многія каманды атрымлівалі пуцёўкі ў лігі рангам вышэй) на год адпраўляецца ў акадэмічны адпачынак, г.зн. не ўлічваецца ў структуры Міжнароднага саюза КВЗ. Беларусы адрэагавалі на заяву адназначна: «Нас закрылі!». А цяпер вось гучыць новая аб'ява, што ў Мінску будзе дзейнічаць іншая ліга КВЗ.

— Аляксандр Васільевіч, ці значыць гэта, што Першая ліга заменіць Еўралігу, і тая закрыецца? — звярнуліся мы па каментарый да першай асобы ў КВЗ.

— Не. Тое, што мы гаварылі ў Сочы — адправіць Еўралігу ў акадэмічны адпачынак, — адбылося з-за таго, відаць, што ліга працавала пад нашым чуйным кіраўніцтвам, але з часам яно аслабла, і ў лізе сталі адбывацца рэчы, якія, па водгуках гуляючых там камандаў, ім не падабаліся. А калі ім не падабаецца — што ж мы, трэба рэагаваць... Словам, мы кіраўніцтва з лігі на год як мінімум знялі, але гэта не значыць, што мы яе закрылі. Беларусь — свабодная дзяржава, і няхай тут кожны гуляе ў што хоча і дзе захоча.

— Аднак шлях у Вышэйшую лігу для беларусаў цяпер будзе толькі праз «АМіК Беларусь» і Першую лігу?

— Чаму ж, існуе вельмі многа ліг, я нават не ведаю цяпер іх дакладную колькасць, але галоўнае, што кожны студзень у Сочы збіраецца больш як 500 камандаў КВЗ, і там вызначаецца, хто ў якой лізе гуляе. Каб мы не глядзелі на гэтыя каманды як на зусім чужых людзей, каб ведалі хоць частку з іх, існуюць такія структуры, нават не афіцыйныя. Адкрыццё Першай лігі ў Мінску — гэта проста дадатковая магчымасць большай колькасці людзей згуляць у любімую гульню, і потым рухацца да ззяючых вяршыняў КВЗ. Прычым гэта датычыцца не толькі беларускіх камандаў — гэта ліга адкрытая, натуральна, тут будуць і расійскія каманды, і ўвогуле ўсе, хто захоча прыехаць.

— У Беларусі з наступнага года будзе цэлыя дзве амікаўскія лігі, — дадае дырэктар Тэлевізійнага творчага аб'яднання «АМіК» Навум Баруля, — Першая і міжрэгіянальная ліга «Палессе», якая працуе ў Гомелі. У абедзве можна трапіць, прыехаўшы на фестываль у Сочы, і мець абсалютна роўныя правы з усімі іншымі камандамі. Каманда можа выказаць і іншыя пажаданні — «Прынцып БДУ», напрыклад, захацелі гуляць у Кіеве, ім далі такую магчымасць. Але не трэба чакаць ад «АМіК» каманды, дзе гуляць, а дзе не гуляць. Гуляць можна, дзе хочацца.

— Чаго варта чакаць ад гульняў Першай лігі — можа, з'явяцца новыя конкурсы ці будуць адроджаныя падзабытыя старыя?

— Шчыра скажу, усе конкурсы крыху забытыя, няма нічога абсалютна новага. Вось кіраўнік цяперашняга беларускага КВЗ спрабуе даказаць навакольным, што ён прыдумаў КВЗ у Беларусі (гэта дзіўна чуць), што некаторыя конкурсы вынайшлі толькі ў Еўралізе... «Біятлон», напрыклад. А я вам магу расказаць тое, што ніхто, пэўна, акрамя мяне, не памятае і не ведае — у 70-я гады быў конкурс «Чуткі», толькі гульцы стаялі не за стойкамі, а высоўваліся ў акенцы і гаварылі жарты. Тое ж самае. Альбо конкурс агучвання кіно, відэафрагментаў — гэта таксама было яшчэ ў 70-я... Калі гуляюць добрыя каманды, ты забываешся на тое, стары конкурс ці новы. Але свежыя ідэі таксама з'яўляюцца пастаянна — і з Беларусі, і з Украіны, і з ЗША, і з Аўстраліі, з усіх краін, дзе мы бываем.

Дарэчы, сярод беларускіх камандаў, паводле ацэнак маскоўскага «АМіК», даволі многа перспектыўных. Хвалілі, у прыватнасці, «Прынцып БДУ», «Опять 25» з Гомеля, «Гораздо» з Брэста... А наконт каманды КВЗ БДУ Аляксандр Маслякоў заўважыў, што гэта была «адна з пяці самых любімых маіх камандаў». Праўда, у цяперашні час былыя гульцы разышліся хто ў пабочныя тэлепраекты, хто ў сцэнарысты серыялаў. «Людзі імкнуцца зарабляць «бабло», — пракаментаваў творчасць колішніх падапечных прэзідэнт МС КВЗ, відаць, забыўшыся, што афіцыйныя гастролі камандаў КВЗ, у тым ліку паўфінальная гульня, паказаная ў Мінску 19 кастрычніка — таксама не дабрачыннасць...

Так ці інакш, адказы на некаторыя пытанні і гледачы, і каманды КВЗ атрымалі. Ці былі імі задаволеныя — іншая справа. Нам застаецца толькі прыміяніць фармулёўку «пажывём — пабачым». Паўфінал Вышэйшай лігі пабачылі ўжо 24 кастрычніка, старт Першай лігі — у наступным годзе, а беларускі КВЗ, тую самую закінутую Еўралігу — увесь год на іншым тэлеканале.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.57	17.50	9.53
Віцебск —	7.50	17.36	9.46
Магілёў —	7.47	17.40	9.53
Гомель —	7.40	17.40	10.00
Гродна —	8.11	18.05	9.54
Брэст —	8.08	18.09	10.01

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Івана, Кузьмы, Марціна, Мікалая.*
К. *Дар'і, Інгі, Баніфата, Пятра.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+11..+13°С	КІЕЎ	+8..+10°С
РЫГА	+9..+11°С	ВІЛЬНЮС	+7..+9°С
МАСКВА	+7..+9°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+6..+8°С

Дзве даты

25 кастрычніка

1913 год — у Мінску нарадзіўся Уладзімір Цаслюк, вядомы беларускі кінааператар і рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. У гады Вялікай Айчыннай вайны — франтавы аператар, удзельнічаў у здымках фільмаў «Разгром нямецкіх войскаў», «Дзень вайны», кадры з якіх выкарыстаны ў кінаэпапеі «Вялікая Айчынная». Пасля вайны працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», здымаў хроніку, дакументальныя і навукова-папулярныя фільмы, выступаў і як рэжысёр.

1929 год — «чорны аўторак» на нью-ёркскіх фінансавых біржах, пачатак сусветнага эканамічнага крызісу 1929—1933 гадоў.

Цытата дня:

«Найвялікшае выпрабаванне мужнасці чалавека — пацярпець паражэнне і не ўпасці духам».

Роберт Інгерсол.

ЗВАНЫ

Званы ў шматлікіх культурах свету сталі інструментам, гук якога збіраў народ і быў надзелены сакральнымі і рытуальнымі функцыямі. Званы былі запазычаны ў Еўропе і ўвайшлі ў культуру ўсходніх славян даволі позна, прыблізна ў X—XIII стагоддзях. Яны даволі арганічна ўвайшлі ў абрадавае жыццё, таму што ў народным асяродку сімвалізавалі памяць і папярэджанне.

● Часам званы атрымлівалі імя, быццам бы гэта быў чалавек. Асобныя яго часткі таксама называлі часткамі цела чалавека: *«тулава», «аплечча», «спадніца», «язык».* А пра гукі, якія ідуць ад звана, казалі як аб чалавечым голасе.

● На званіцы заўсёды знаходзіўся званар, які быў майстрам па валоданні звонамі, ведаў шмат прыказак. Але народ быў упэўнены, што званы могуць званіць і без званара: калі ў вёсцы жыве праведны народ, а званы жадаюць папярэдзіць яе жыхароў аб хуткай небяспецы. Верылі, што перад пажарам, градам, эпідэміяй ці іншымі бедамі званы звоняць самі па сабе.

● У народзе захавалася вера ў тое, што званы, быццам чалавек, самі выбіраюць званіцу, дзе будуць вісець. І калі перанесці званы на іншае месца, яны ўсё роўна вернуцца на папярэдняе месца, жыхары вёскі будуць пакараны за такія дзеянні.

● Званы сталі атрыбутам хрысціянскага набажэнства і атрымалі статус сакральнай рэчы. Яны ўвесь час заклікаюць на царкоўнае набажэнства і сімвалізуюць чысціню, праведнасць і святасць. Таму, калі званы падалі са званіцы, трэскаліся, гучалі глуха, лічылася, што на званіцы прысутнічаюць грэшнікі, званы выліты на грахоўныя грошы ці пры дапамозе грэшнікаў (дзетазабойцаў, прадстаўнікоў іншага веравызнання і г.д.).

● Гучанне звоў асацыявалася з чалавечай гаворкай. Таму чалавека, які страціў голас, знахары вадзілі да звоў, бо лічылі, што з першым ударам у вялікія царкоўныя святы да яго вернецца голас. З той жа мэтай хворага паілі вадой, у якой мылі «языкі» звоў.

● Той момант, калі гучаць званы, асабліва спрыяльны для пачатку адказных спраў у хаце і гаспадарцы, для магічных і рытуальных дзеянняў.

● Лічылася, што з дапамогай звоў можна пазнаць рабаўніка ці злодзея. У Віцебскай вобласці лейцы зведзенага каня прывязвалі да звоў і казалі, што злодзей з'явіцца і прывядзе каня назад, бо яму будзе дрэнна пасля кожнага ўдару звоў.

● Паўсюдна асабліва прадуцыравальнай і аднаўленчай сілай надзялялі гучанне звоў на Вялікдзень. Калі на Вялікдзень пачуеш званы, неабходна тройчы сказаць: *«Хрыстос ўваскрос, а маёй сям'і здароўя, майму дому багацця, майму полю ўраджай. Амінь».*

● Па памерлым чалавеку неабходна было званіць некалькі разоў: адразу ж пасля смерці, пры вынасе памерлага з хаты, пры апусканні труны ў магілу.

● Званілі ў званы, калі чалавек паміраў у агоніі — тым самым дапамагалі яму адысці ў свет іншых.

● Лічылася, што ноччу, калі званы маўчаць, на званіцы збіраюцца чэрці і іншая чорная сіла. Таму існавала строгая забарона хадзіць уначы на званіцу. Лічылася, што той, хто парушыць гэту забарону, абавязкова памрэ.

● На народных уяўленнях, жыццё маладых будзе нядоўгім, калі ў момант іх ад'езду з храма пасля вянчання зазвоняць званы, якія запрашаюць на вячэрняе набажэнства. Таксама званы па памерламу чалавеку, якія звоняць у час, калі едзе вясельны картэж, не прадказвае шчаслівае і працяглае сумеснае жыццё.

● У народнай медыцыне гук звоў лічыўся цудадзейным сродкам пры лячэнні шматлікіх хваробаў. Існавала шмат абрадаў, калі хворых прыводзілі ў вялікія царкоўныя святы, каб яны пачулі першы ўдар звоў. Лічылася, што ў такім выпадку нячыстая сіла ў гэты момант «слабне, гіне і выпускае» са сваіх рук душу хворага чалавека. Так лячылі хворых ліханкай, спудам, сурокам.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Маленькія мужчынскія хітрасці.

— Жонка просіць памяняць лямпачку, якая перагарэла? — Скажы ёй, што так ты эканоміш электрычнасць.

— Жонка не дазваляе піць больш за дзве бутэлькі піва за раз? — Ёсць «Хайнекен» 0,65 л, які па памерах амаль не адрозніваецца ад звычайнага 0,5 л.

— Любое карпаратыўнае свята — выдатная адмазка для жонкі, каб правесці вечар з палюбоўніцай. Або проста напіцца ў бары з сябрамі.

— Таксама, каб была падстава выпіць у бары з сябрамі, дастаткова пасварыцца з жонкай з нагоды рэдкай магчымасці выпіць у бары з сябрамі.

— Каб не вазіць жонку і цешчу на выхадных па крамах, накаці з раніцы 100 грамаў гарэлкі. Здаецца і цвярозы, а за руль ужо нельга!

— Бальнічны — гэта шанц нарэшце спакойна прайсці любімую камп'ютарную гульню, адчыхваючы і адкашліваючы прыходзячых дамачадцаў.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Цяльцам не варта быць занадта прынцыповымі, а Казярогі не павінны спыняцца на дасягнутым

ВАЕН. Для вас можа настаць проста казачны тыдзень: кар'ера і свецкае жыццё будуць бліскучымі, як ніколі. Цяжар непатрэбных клопатаў спадзе з вашых плячэй. У сераду падзеі могуць прыняць зусім не той абарот, якога вы маглі чакаць. Найбольш значным днём тыдня можа стаць чацвер — толькі дакладна вызначце, чаго вы хочаце дасягнуць у бліжэйшы час, і настойліва прасоўвайцеся да мэты, нягледзячы на цяжкасці.

ЦЯЛЕЦ. Будзеце знаходзіцца ў цэнтры падзей, давядзецца ўнікаць ва ўсё, што адбываецца і браць на сябе задачы, якіх, магчыма, вам хацелася б пазбегнуць. У аўторак засяродзіцца на працоўных справах перыядычна будзе перашкаджаць раздражняльнасць. Не праяўляйце залішняй прынцыповасці ў дробязях.

БЛІЗНЯТЫ. Праблемы, якія назапасіліся, неабходна вырашаць. У панядзелак непажадана планаваць сур'ёзныя сустрэчы. Сканцэнтруйцеся на галоўных справах, аддаючы перавагу логіцы. Пастарайцеся адстойваць свой пункт гледжання і не ісці на повадзе ў іншых, няхай і вельмі ўплывовых людзей. Калі з'явіцца жаданне асвоіць новую прафесію, то пажадана пачынаць пошук у творчых галінах.

РАК. Давядзецца праявіць гібкасць розуму і максімум кемлівасці. Паглядзіце па-філасофску на сітуацыю, якая склалася, не перастарайцеся з ціскам на навакольных, ну а па дробязях можна і ўступіць. Уважліва правярайце важную інфармацыю, якая трапляе да вас. Магчымыя падвохі і недакладнасці.

ЛЕЎ. У першай палове тыдня давядзецца спраўляцца са справай, якая пад сілу толькі вам. Шкада, бо не будзе нават маленькага шанцу сплавіць гэту работу каму-небудзь іншаму. Усе непрыемнасці могуць адбыцца з-за выпадковых знаёмых, ад няўстрыманасці на язык — і ўсё гэта можа закончыцца не вельмі натхняльным кантактам з афіцыйнымі асобамі.

ДЗЕВА. Пажадана зменшыць байцоўскі пыл і быць больш уважлівымі да дзелавых праектаў. Якіх-небудзь непрадбачаных праблем тыдзень не прынясе. Рэалізацыя планаў павінна прайсці на добрым узроўні. Каб не сапсаваць адносіны з роднымі, у аўторак не прымайце нічога на веру. Неардынарная ідэя ў панядзелак здольная даць штуршок, які дазволіць атрымаць максімальную карысць ад сітуацыі, якая склалася.

ШАЛІ. Могуць ускладніцца адносіны на рабоце. Магчыма, давядзецца шукаць кампраміс паміж сямейнымі і прафесійнымі абавязкамі. Спатрэбяцца такія якасці, як тактычнасць і ўменне спачуваць. Іх наяўнасць і правільнае выкарыстанне дазволяць справіцца з вельмі запушчанай сітуацыяй. У пачатку тыдня зможаце ўладзіць праблемы з роднымі, калі такія маюцца.

СКАРПІЁН. У першай палове тыдня будзе шмат стасункаў і знаёмстваў з новымі людзьмі. Пастарайцеся зрабіць прыемнае ўражанне з першых слоў — не варта рабіць стаўку на тое, што не вельмі відавочна. Каб у чацвер тайныя нядобразычліўцы не засталі вас знянацку, мабілізуйце розум і сілы і падрыхтуйцеся даць адпор іх наскокам. Пачынаючы з серады будуць спаўняцца жаданні, калі яны не зусім фантастычныя.

СТРАЛЕЦ. У першай палове тыдня асаблівага напружання на працы не прадбачыцца. З'явіцца больш вольнага часу, які лепш выкарыстоўваць, адкрываючы ў сабе новыя магчымасці і здольнасці. Сярэдзіна тыдня прынясе змену настрою: станеце больш спакойнымі, сабранымі, прачнецца цікавасць да працы. У канцы тыдня давядзецца выканаць важную справу, якая стане пачаткам у ланцугу вялікіх дасягненняў.

КАЗЯРОГ. Не варта дарэмна губляць час. Не спыняйцеся на дасягнутым, смела перасоквайце праз наступную планку. У чацвер не варта адмаўляцца ад запрашэння сяброў — даведаецеся шмат новага і карыснага для сябе. Падымайцеся на гару пры збегу ўсіх спрыяльных момантаў. У пятніцу даверцеся парадам сяброў — яны прадбачаць нават тонкія нюансы ў праблеме, якая наспела.

ВАДАЛЕЙ. Самы час перагледзець і, па магчымасці, канкрэтызаваць планы. Цалкам верагодна выкананне жаданняў — абы яны мелі больш-менш рэальныя абрысы. Вынікі вашай дзейнасці абяцаюць быць бачнымі і адчувальнымі. Не адмаўляйцеся ад магчымасці завесці новыя знаёмствы: яны абяцаюць адкрыць перад вамі новыя далягляды.

РЫБЫ. Асабліва важна праявіць разважлівасць і ўпартасць у дасягненні вызначаных мэтаў. Неабдуманых учынкаў быць не павінна: іх наступствы могуць не толькі ўскладніць жыццё, але крута змяніць лёс. Вас абавязкова наведае ўдача, але яе візіт будзе нядоўгім: пастарайцеся яго не праміргаць і не спужаць вельмі рэзкімі дзеяннямі. Падзеі прыспешваць не варта, але і пускаць на самацёк тым больш нельга.

КЛЁВА!

Практыка

ЗА ШЧУПАКОМ ВОСЕННЮ

Пасля кастрычніцкага жору, калі шчупакі кідаюцца на любыя жалязякі, лістападаўская рыбалка можа здацца вельмі сумнай і малаздабыўнай, і трэба яшчэ знайсці ў сабе сілы, каб папаласкаць у ледзяной ваддзе любімыя прынады. Поспех у перадзімовай лоўлі прыносіць веданне месцаў стаянак рыбы ў гэты час года (а стаянкі звычайна адны і тыя ж з сезона ў сезон) і выкарыстанне «правільных» прынад.

Месцы лоўлі

Прынята лічыць, што позняй восенню з ахалоджваннем вады шчупак сыходзіць у самыя глыбокія месцы вадаёмаў. Гэта не заўсёды так. На вялікіх паўнаводных рэках рыба вельмі часта выходзіць на адкрытыя мелкаводдзі. Гэта шырокія залівы, затокі, часта косы ў хвастах вялікіх астравоў. У такіх месцах заўсёды збіраецца вельмі шмат кармавой для драпежніка рыбы — падлешчыка, гусцяры, плоткі, за іх чарадой і сочаць вялікія шчупакі. Калі ўлетку і драпежнік, і яе асноўны «корм» вельмі моцна размазаны па акваторыі, то зараз уся рыба збіраецца вакол бедных астраткаў некалі буйной падводнай расліннасці. Канцэнтрацыя жыўнасці вакол такіх «астраўкоў жыцця» можа быць вельмі вялікая. Шмат шчупака стаіць і ў чаротавых астравах вялікіх заліваў, прычым стаіць ён у самых непразаносных нетрах, у якіх спінінгавая лоўля ў прынцыпе немагчымая. І толькі ў самае ветранае надвор'е, калі чарот ходзіць хадуном, плямісты з яго выходзіць і ўладкоўвае засады ўздоўж яго кромкі. А ўжо тут яго лавіць адно задавальненне, абы хваля была не вельмі моцнай — ад рыбалкі трэба атрымліваць задавальненне, а не марскую хваробу. Уся бяда ў тым, што пры тым ветры, пры якім шчупак пакідае чаротавыя палі, хваля таксама падымаецца вельмі вялікая.

У сярэдніх па памерах рэках, шырынёй менш за сто метраў, рыба ў гэты час года канцэнтруецца вакол глухіх завалаў карчажніка. Бывае, што некалькі сотняў метраў ямы ў рэчышчы пустуюць, а пару затопленых дрэў паблізу проста нашпігаваныя шчупаком. Карчакі знайсці не вельмі складана. Звычайна багатыя запасы гэтага «дабра» знаходзяцца на стромкіх павароткох рэк, абрывістыя берагі якіх зараслі лесам. Кожную вясну, у паводку, бераг падмываецца вадой і чарговая порцыя «бурацінаў» трапляе ў раку. А вось пры наяўнасці на акваторыі вельмі глыбокіх ямаў (глыбей за 10 метраў) рыбу варта шукаць ужо ў іх. Калі ў берагавой зоне ракі ёсць падтоплены чарот, нейкая частка шчупака можа стаяць і ў ім, вось толькі памер такой «чаротавай» рыбы амаль заўсёды вымушае чакаць лепшага. З участкаў перад вусцем у малых і сярэдніх рэках шчупак часцей за ўсё скатваецца ў вялікія рэкі. Вада там цяплейшая і кармавая база лепшая.

У замкнёных поймавых азёрах і проста балотах драпежніка знайсці прасцей за ўсё. Там ёй проста няма куды дзецца, асабліва цяпер, калі ўзровень вады практычна мінімальны. Асабліва багатыя ўловы бываюць менавіта ў поймавых вадаёмах з максімальнай глыбінёй менш за 1 метр, пакінутых пасля вясновага разліву вялікіх рэк. Вясной у іх заходзіць велізарная колькасць шчупака, які ідзе на нераст, разам з тонамі белай рыбы. Надалей частка шчупака прайсці ў асноўны вадаём не паспявае, а астаткі белі і маляўкі гэтай вясны складаюць ёй выдатную кармавую базу на ўсё лета. Якраз да восені ежа заканчваецца і злы, галодны і замерзлы (у прамым сэнсе, бо ўзімку такія вадаёмы часцей за ўсё прамярзаюць да самага дна) драпежнік азвярэла кідаецца на ўсё, што рухаецца. Жабы, мышы, іншыя шчупакі ледзь меншага памеру — на ўсё ідзе сапраўднае паляванне.

Трымаецца драпежнік звычайна ў самім цэнтры вадаёма, на максімальным аддаленні ад берагоў. Чым халаднейшы стаіць надвор'е, тым актыўней бярэцца рыба. Расліннасці ў балотах цяпер мала, бачнасць выдатная, і шчупакі кідаюцца за прынадамі з адлегласці больш за 20 метраў — атакі заўсёды бачныя па добра прыкметнай кілявой хвалі. Такая лоўля вельмі эмацыйная і захапляльная, асабліва калі на адну прынаду кідаюцца адначасова па тры, а то і па чатыры шчупакі. Дзіўна, але ў такіх заліўных «лужынах» ёсць шанц злавіць вельмі буйны экзэмпляр, а трох-, чатырохкілаграмовыя шчупакі трапляюцца наогул даволі часта. З асноўнымі месцамі лоўлі позняй восенню ў двух словах разабраліся, зараз можна трохі пагаварыць і аб прынадах.

Блешні, якія хістаюцца

Старыя добрыя «колебалкі» цяпер выходзяць на пярэдні план. З дапамогай «жалязяк» можна аднолькава паспяхова лавіць шчупака і ў велізарным заліве паўнаводнай ракі, і ў маленькім лясным балоце. У затоках лепш за ўсё працуюць буйныя, але лёгкія блешні, якія хістаюцца, і менавіта тыя, якія пры хуткай падмотцы не ўваходзяць у штопар, а пры павольнай — ляніва перавальваюцца з боку на бок. Вельмі добрыя ў рабоце блешні «Атам», «Чорнаспінка». Сапраўдны хіт — амерыканскія блешні Williams даўжынёй 90 мм. Каштуюць яны даволі дорага (пакрытыя срэбрам і нават нейкім тэхнічным золатам), але адпрацоўваюць на ўсе сто. Выдатных вынікаў можна дамагчыся з «колебалкамі» Luhr Jensen (Мадэль Tony`s), Kuusamo (Professor 18 гр.). Тэхніка лоўлі простая — блешня са звонкім пляскканнем кладзецца на мяжы чароту (трава) і чыстай вады, трохі заглыбляецца і даволі рэзка падцягваецца рухам вудзільна. Прынада «з'ядаецца» або ў момант свабоднага падзення, або падчас яе рэзкага паскарэння. Увага драпежніка прыцягвае гук падзення блешні, а яе хуткая працяжка і зусім выводзіць з раўнавагі — атака будзе адразу ж. Калі заходзіць плямістага не адбылося, вы спакойна выбіраеце слабіну лёскі і працягваеце праводку катушкай. Падчас гэтай фазы верагоднасць атакі ніжэйшая, але чакаць яе варта заўсёды. Чым больш разнастайна вы вядзеце блешню, тым больш верагодная атака драпежніка. Чаргуйце паскарэнне з замаруджваннем, спыніце падмотку, дайце блешні трохі паплаваць у тоўшчы вады — і вы даможацеся поспеху.

(Працяг будзе.)

Карысныя парады

Рыбаловам часта прыходзіцца рабіць доўгія пераходы на лодцы. Пры гэтым можна паспрабаваць злавіць шчупака на «дарожку». Але гумавыя лодкі цяжкаходныя, блешня можа затануць і ўчапіцца за траву, корань, карчак. Гэтую праблему можна вырашыць. З пенапласту трэба зрабіць воблер без кручкоў, а да яго прымацаваць абрэзак дроту (лепш сталёвага), ззаду ўчапіць на ланцужок жыўца або лёгкую блешню. Даўжыня ланцужка з жыўцом павінна быць карацейшай за адлегласць ад воблера да канца дроту, каб пры выпадковым спыненні блешня не дастала да дна.

Грузападымальнасць воблера павінна быць на мяжы плывучасці, тады нават пры малой хуткасці лодкі ён пачне апускацца і апусціць жыўца ў глыбіню. Дрот трэба сагнуць такім чынам, каб воблер, узяты за сярэдзіну двума пальцамі, прыняў гарызантальнае становішча. Гэтак жа ён будзе паводзіць сябе і ў вадзе. Яго варта пафарбаваць у някідкі зеленавата-буры колер.

Высакаякасная лёска мае раўнамерную таўшчыню па ўсёй даўжыні, празрыстая, без плямаў, цёмных кропак і бурбалак. Паверхня яе гладкая, сячэнне круглае. Сустракаюцца таксама плоскія і рабрыстыя лёскі. Моцнасць іх па ўсёй даўжыні часта не аднолькавая. Праходзячы праз кольцы на вудзільні з вялікім трэннем, такая лёска выклікае дачасны іх знос і зношваецца сама. Гладкая паверхня лёскі спрыяе лепшаму праходжанню скрозь кольцы вудзільна, што вельмі важна пры лоўлі спінінгам.

Капронавая лёска, якая захоўвалася на спінінгавай катушцы, валодае здольнасцю ўрэзацца паміж віткамі, якія ляжаць нiжэй. Каб пазбегнуць гэтага, трэба лёску распусціць на ўсю даўжыню, а затым роўна і няшчыльна наматаць яе на катушку, злёгку прытрымліваючы паміж сцiснутымі пальцамі. Калі лёска жарсткаватая і спружыніць віткамі, перад лоўляй яе варта апусціць на некалькі хвілін у ваду. Лёска стане мякчэйшай.

Калі ў вадаёме ёсць акунь, значыць, ёсць і судак. Звычайна пасля таго, як акунь бярэцца на мармышку, бутэрброд або невялікую блешню падсякаюць і судака, якому больш за ўсё падабаюцца жалязякі — невялікія моцныя чарвякі. Асабліва актыўныя акуні ў малых рэчках перад астравамі, у затоках са зваротным цячэннем. Сустракаюцца зграі паласацікаў на розных глыбінях за перакатамі ў кустоў вярбы.

КРЫМІНАЛЬНЫ ЛОМ

Сем тон каляровага металу без адпаведных дакументаў — такі кашторыс груз павінен быў пакінуць Беларусь на мяжы з Расіяй у Веткаўскім раёне. Аднак супрацоўнікі ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Гомельскай вобласці, камітэта дзяржаўнай бяспекі і міліцыі сталі на шляху злачыннай групы. Сумеснымі намаганнямі былі затрыманы і іншыя аўтамабілі, якія перавозілі каля 20 тон каляровага металу. Удалося выйсці на злачынную сетку, якая дзейнічала ў розных раёнах Гомельскай вобласці. Дзялкі ценявога рынку займаліся нелегальным зборам, перавозкай і продажам каляровых і чорных металаў за межы нашай краіны. Як адзначыў старшы інспектар па асабліва важных справах УДФР КГК Гомельскай вобласці Сяргей Цімашэнка, «да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 25 грамадзян, якія рабілі спробы незаконна вывезці з тэрыторыі Беларусі металалом. Узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да арганізаванай злачыннай групы».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік гало